Людзьмі звацца! —
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 7 снежня 1990 г. № 49 (3563) ● Цана 10 кап.

ДЗЕ НАРАДЗІЎСЯ І КАЗАННЕ ВЁЎ...

Калі я патрапіў у вёску Барані, дзе нарадзіўся і правёў маленства Казімір Сваяк, мне здавалася, што цывілізацыя абмінула яе. Старыя хаты, большасць «пазірае» пабітымі шыбамі, плеценая агароджа. Вакол вёскі — гушчар шматвяковага лесу, праз вярсту цячэ рэчка.

Вось і хата, дзе жылі Стаповічы. Зараз тут жыве Яніна Францаўна Янюк. Паводле яе слоў, раней хата была ўдвая даўжэй, а побач знаходзіліся вялікае гумно, калодзеж, ды і сама гаспадарка займала больш месца.

— З маленства памятаю, як Сваяк прыходзіў у вёску,— кажа Яніна Францаўна.— Заўсёды цукеркамі частаваў, нават спаборніцтва рабіў, хто лепш малітву раскажа, той больш цукерак і палуча. Вакол яго заўсёды моладзь гуртавалася, і ўсе пабеларуску размаўлялі.

— А рукапісы, фотаздымкі не засталіся?

— Былі, сын мой усё яго дзённікам захапляўся, я на працу, ён на вышкі чытаць яго... Знік некуды. Мо і брат Стэфан у Польшчу павёз. Карціна была, Сваяк маляваў: ён сядзіць чытае кнігу, а ззаду Клюшчанскі касцёл. Таксама знікла...

Мне пашанцавала, я знайшоў яшчэ двух сучаснікаў Сваяка: Вераніку Мікалаеўну Шапуру, якая спявала ў хоры, арганізаваным Сваяком, і Казіміра Францавіча Хадорскага, у хаце якога збіраліся Я. Купала, К. Сваяк, А. Станкевіч.

Вераніцы Мікалаеўне 97 год, шмат пазабывала, але добра памятае «Сваяковы» песні.

Калі я запытаўся пра хор, яна нечакана заспявала:

Ой, ляцелі гусі
З-пад Беларусі...

А потым — «Зялёны дубочак», любімую песню Сваяка.

— Памятаю я Стаповіча,— кажа Вераніка Мікалаеўна,— высокі быў, добры, казанне на беларускай мове спраўляў, кнігі даваў чытаць, ноты.

— А першае прадстаўленне памятаеце?

— Як жа! У гумне Смольскіх рабілі... Брат Валера ў п'есе іграў...

— Клімовіч і Стаповіч заўзятыя беларусы былі,— гэта ўжо Казімір Францавіч,— разам народ вучылі. У «хаўрусе» мастаком Раніцкі быў, здольны, намаляваў вобраз Маці Божай на касцёле, таксама партрэты Сваяка, Станкевіча — яны ў касцёле віселі... Памятаю, Купала жартаваў са Сваяком:

— Што ты маеш са службы ў касцёле?

— Я потым на небасхіле буду адпачываць, а ты ў пекле.

...Скончылася маё падарожжа па Сваяковых мясцінах. Вельмі мала засталося людзей, якія яго памятаюць: у Засвіры, дзе апошнія гады працаваў Стаповіч, жыве яшчэ адна бабуля, якую ён вянчаў, у Свіры ёсць старыя, якія памятаюць вершы Сваяка. Але ж пошук працягваю...

Г. БАБКІН.
Фота аўтара.
Астравецкі раён.

Землякі, сучаснікі (К. Ф. ХАДОРСКІ і В. М. ШАПУРА).

Хата ў Баранях, дзе нарадзіўся СВАЯК.



Той самы Клюшчанскі касцёл...

УНУМАРЫ:

ЧАЛАВЕКУ І НАРОДУ
Да сусветнага дня правоў чалавека
2—3, 15

САЮЗНЫ ДАГАВОР: ШТО НАМ ПРАПАНУЮЦЬ?
Пункт гледжання прафесара В. АКУЛАВА
3

ЗАКОН АБ КУЛЬТУРЫ: ЯКІМ ЯМУ БЫЦЬ?
5

МАЯКІ І МІРАЖЫ
Суб'ектыўныя нататкі У. КАЗБЕРУКА
6—7, 12

Год Скарыны
Як яго святкавалі ў Парыжы, Вільні і Маскве
8—9

ВЫХОДЗІЎ НА НІВУ СЯВЕЦ...
Старонкі жыцця і творчасці М. ГАНЧАРЫКА
14—15

АД НАШАГА ПАРЛАМЕНЦКАГА КАРЭСПАНДЭНТА

ПРА ХЛЕБ НАДЗЁННЫ І ХЛЕБ ДУХОЎНЫ

Ідзе гаворка на III сесіі Вярхоўнага Савета БССР XII склікання

Сесія адкрылася 5 снежня ў абстаноўцы падкрэслена стрыманай, нават будзённай. Уражанне такое, нібыта дэпутаты дамовіліся пакінуць па-за сценамі парламента тыя палітычныя страсці, якія бушавалі ў рэспубліцы ўвесь лістапад.

Як вядома, за час, які папярэднічаў сесіі, на адрас Вярхоўнага Савета паступіла нямала гучных адозваў, заяў, зваротаў прадстаўнікоў самых розных пластоў грамадства, самых розных палітычных рухаў. Вось і ў сераду раніцай на плошчу Леніна дружна прыйшла стройная калона мужчын і жанчын з сумкамі, дыпламатамі і парасонамі (ішоў мокры снег) і разгарнула перад Домам урада чырвоныя палотнішчы з заклікам «абараніць сацыялізм». Пастаялі — і гэтак жа дружна пакінулі плошчу. Пайшлі, мабыць, ствараць і спажываць каштоўнасці нашага ладу...

Дэпутацкую стрыманасць першага дня можна вытлумачыць і звычайнай стомленасцю. Час, што мінуў з папярэдняй сесіі, не быў парламенцкімі канікуламі, прайшоў у напружанай працы ў камісіях. У гэтым сэнсе цяперашняя сесія павінна вянчаць перыяд надзвычайнай заканатворчай актыўнасці.

З іншага боку, дэпутаты настройваюцца, што называецца, на доўгае дыханне. На парадку дня сесіі — трыццаць шэсць пытанняў, большасць з якіх вызначальныя для сённяшняга і заўтрашняга дня нашага грамадства. Найперш па значнасці можна вылучыць блок законапраектаў, якія павінны спрыяць укараненню новых эканамічных адносін.

У першы дзень работы сесіі на некалькі пытанняў парламенцкага карэспандэнта «ЛіМа» адказаў першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета БССР Станіслаў ШУШКЕВІЧ.

— Станіслаў Станіслававіч, як бы вы сцісла ахарактарызавалі становішча ў рэспубліцы на момант адкрыцця сесіі?

— Пра становішча так шмат сказана, яно настолькі дакладна ахарактарызавана, што, бадай, няма ўжо чаго дадаць. Ламаем старыя структуры, новыя нараджаюцца вельмі марудна, таму і ўтвараецца вакуум. У ім дзейнічаюць тыя структуры, якія законам не прадугледжаны. Тут і ценевая эканоміка, і карупцыя, і рост злачыннасці.. Людзі занепакоены, устрывожаны ўсім гэтым.

Але — што рабіць? І як?

Ведаеце, мяне непакоіць наша ўсеагульная неканструктыўнасць. Напрыклад, з парламенцкай трыбуны вельмі лёгка заклікаць да адказнасці прэм'ер-міністра, увесь урад, нічога канкрэтна не прапануючы. Да адказнасці — і ўсё тут!

— Ці не занадта перагружаны парадак дня сесіі? Нават колькасна — трыццаць шэсць пытанняў!

— Я пагадзіўся б з вамі, калі б у нас была магчымасць не разглядаць той ці іншы прапанаваны законапраект. Усе яны важныя, усе надзённыя, жыццёва неабходныя. Іншая справа, ці паспеем мы на гэтай сесіі разгледзець іх у поўным аб'ёме.

— Ваш прагноз: што выкліча найбольш гарачыя спрэчкі?

— Зямля. Ведаеце, я не падзяляю думку адпаведнай камісіі Вярхоўнага Савета, а таксама XXXI з'езда КПБ аб тым, што не павінна быць прыватнай уласнасці на зямлю. Нам нельга застацца на старых пазіцыях. Мы не павінны баяцца, што прыватная ўласнасць у пэўных маштабах паставіць пытанне аб скасаванні нашага ладу. Гэта я кажу як прыхільнік сацыялістычнага выбару. Іншая справа, што гэта будзе ўжо не той сацыялізм, які мы будавалі 70 гадоў.

— Парламент і культура... Сёння вышэйшую ўладу настойліва заклікаюць павярнуцца тварам да духоўнай сферы. На якія захады парламента можа разлічваць творчая інтэлігенцыя, усе работнікі культуры?

— На парадак дня сесіі выносяцца статус Акадэміі навук рэспублікі і заканадаўства аб культуры. Гэта тыя пытанні, якія непасрэдна тычацца людзей творчага пошуку.

Вельмі шкадую, што вымушаны гэта сказаць у інтэрв'ю «ЛіМу», але я павінен быць шчырым... Я не думаю, што прыняцце Вярхоўным Саветам гэтых актаў што-небудзь кардынальна зменіць. А ў дэкларацыях мы не маем сёння нястачы. Трэба было б вырашаць іншае пытанне — шукаць сродкі і аддаваць іх на развіццё навукі і культуры. І каб размеркаваннем гэтых сродкаў займаліся менавіта дзеячы навукі і культуры; так мы выключым некампетэнтнасць, грубае ўмяшанне ў тонкія сферы.

Магчыма, я памыляюся. Людзі, думку якіх я вельмі паважаю, лічаць неабходным прыняцце закона аб культуры на гэтай сесіі. Таксама буду яго падтрымліваць. Але калі мы найперш не выправім эканоміку — нічога не будзе. У жабрацкай краіне не можа быць высокага развіцця культуры.

— Станіслаў Станіслававіч, апошняе пытанне. Яно не тычыцца працы сесіі, але непасрэдна закранае вашу пазіцыю, калі хочаце, ваш імідж як палітычнага дзеяча. У нядаўнім інтэрв'ю вы сваё далейшае знаходжанне ў КПСС звязалі з вынікамі XXXI з'езда КПБ. І вось — з'езд завяршыўся...

— Вынікамі XXXI з'езда КПБ я катэгарычна не задаволены. У пэўным сэнсе як абразу ўспрымаю тое, як вырашана пытанне аб уласным статуце КПБ. Фактычна ж такой грамадскай арганізацыі не існуе, ёсць «атрад» КПСС, хоць я лічу, што суверэнная рэспубліка можа мець і сваю кампартыю. Другая абраза — на з'ездзе я амаль не чуў беларускага слова. Пакінуў мяне ў роспачы і новы склад ЦК.

Што ж, у такім разе, мяне ўсё ж утрымлівае сёння ў партыі? Ведаеце, на з'ездзе была меншасць, пераважна маладых людзей, кіраўнікоў пярвічных арганізацый, якія, як мне здалося, вельмі свядомыя людзі, патрыятычна зарыентаваныя. Я чалавек разважлівы, і мне не захацелася пакуль што сваім публічным выхадам з партыі, скажам так, падбухторваць іх на раскол. Наяўнасць гэтых людзей сведчыць, што становішча не зусім безнадзейнае.

Разам з тым, партыя ў значнай ступені адрываецца ад тых, чые інтарэсы збіраецца адстойваць. Гэта мяне вельмі непакоіць. Таму і мае словы, сказаныя ў інтэрв'ю «Собеседнику», застаюцца ў сіле. Тых, з кім я не згодзен, было на з'ездзе значна больш.

...Калі пішуцца гэтыя радкі, на сесіі — гарачыя спрэчкі: быць ці не быць прыватнай уласнасці?

Андрэй ГАНЧАРОЎ.

Форум інтэлігенцыі Беларусі

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны пры падтрымцы грамадскіх арганізацый Беларусі правяло ў Мінску 1 снежня рэспубліканскі форум інтэлігенцыі з такім парадкам дня: «Інтэлігенцыя ў нацыянальным адраджэнні і ажыццяўленні суверэнітэту Беларусі». Удзельнічалі дэлегаты ад творчых саюзаў, грамадскіх, навуковых і культурна-асветных арганізацый, а таксама прадстаўнікі кіраўніцтва Вярхоўнага Савета БССР, шэрагу міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі.

Удзельнікі форуму заслухалі і абмеркавалі шырокае кола праблем, звязаных з крытычным эканамічным, сацыяльным і палітычным становішчам, з гэткім жа станам культуры ў грамадстве. На форуме выступілі Ніл Гілевіч, Васіль Шаладонаў, Людміла Сухнат, біскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Юрый Хадыка, Зянон Пазняк і іншыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы рэспублікі, дзеячы культуры і мастацтва Беларусі, прадстаўнікі навукова-тэхнічнай і гуманітарнай інтэлігенцыі.

Форум прыняў зварот да народных дэпутатаў і ўсіх грамадзян Беларусі, які «ЛіМ» прапануе сёння ўвазе чытачоў. Больш падрабязная гаворка пра рэспубліканскую сустрэчу інтэлігенцыі пойдзе на старонках штотыднёвіка пазней.

НАШ КАР.

ЗВАРОТ

да народных дэпутатаў і ўсіх грамадзян Беларусі

Мы, удзельнікі рэспубліканскага форуму «Інтэлігенцыя ў нацыянальным адраджэнні і ажыццяўленні суверэнітэту Беларусі», выказваем боль, трывогу і занепакоенасць тым, што ў рэспубліцы ўсё больш абвастраецца эканамічны, сацыяльны і палітычны крызіс у грамадстве. Далейшае паглыбленне яго можа прывесці да нацыянальна-культурнай і экалагічнай катастрофы, да поўнага разбурэння грамадства, і адказнасць за гэта ляжа перш за ўсё на вышэйшы орган улады БССР — Вярхоўны Савет і прызначаны ім урад рэспублікі.

Як ні горка аб гэтым думаць, але менавіта дзяржава ў асобе органаў вышэйшай улады і кіравання рэспублікі служыла інструментам антыбеларускай палітыкі кіруючай партыі і падаўляла беларускую нацыянальную культуру і мову. У гэтых умовах, зыходзячы з прынятай Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР, заклікаем народных дэпутатаў усіх узроўняў, грамадзян рэспублікі ўсвядоміць, што без прыярытэтнага развіцця культуры, навукі, нацыянальнай школы, а таксама без адраджэння беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця немагчыма існаванне цывілізаванага грамадства, немагчыма аднавіць і перабудаваць эканоміку і падняць дабрабыт народа, дабіцца сацыяльнай абароненасці чалавека, адрадзіць нацыянальную духоўнасць.

Беларуская ССР павінна стаць гарантам захавання і развіцця беларускай культуры і стварыць неабходную дзеля жыццядзейнасці матэрыяльную аснову, асігнуючы на гэтыя мэты неабходную долю сваіх бюджэтных сродкаў. Культуру, якая прыносіць неацэнную карысць грамадству апасродкавана, праз удасканальванне ўсіх формаў чалавечай дзейнасці, нельга пераводзіць на фінансавае самазабеспячэнне, абкладаць падаткам. Мы заклікаем народных дэпутатаў БССР і Саветаў усіх узроўняў, усіх грамадзян рэспублікі ўключыцца ў рух за адраджэнне беларускай культуры і мовы, сплаціўшы ім доўг, сцвердзіўшы на справе ў палажэннях законаў аб дзяржаўным бюджэце БССР, аб падатках, а таксама ў асновах заканадаўства аб культуры прынцып прыярытэтнага развіцця беларускай мовы і культуры ў Беларускай дзяржаве.

Разам з тым, выказваем заклапочанасць і абурэнне тым, што Закон аб мовах у Беларускай ССР у многіх сферах грамадскага жыцця рэспублікі не выконваецца, больш таго, шэрагам дзяржаўных органаў, устаноў, прадпрыемстваў, а таксама некаторымі грамадскімі арганізацыямі свядома ігнаруецца. Прычынай таму з'яўляецца нацыянальна-культурны нігілізм, які пусціў глыбокія карані ў свядомасці значнай часткі грамадзян Беларусі, негатыўна адбіваючыся на грамадска-культурных працэсах, і які служыць адным з ганебных сродкаў разбурэння грамадскай супольнасці ў дзейнасці пэўных палітычных сіл.

У гэтай сувязі мы лічым, што нігілістычныя адносіны або варожасць да беларускай культуры, аднолькава як да культуры кожнай з нацыянальных супольнасцяў Беларусі, падлягаюць рашучаму асуджэнню з боку Беларускай ССР і не павінны мець месца ў палітычнай, культурна-асветнай, канфесійнай або іншай дзейнасці на тэрыторыі рэспублікі.

Культурная дзейнасць, якая ўяўляе сабою неад'емную частку дзейнасці па адраджэнні і ўмацаванні нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту Беларускай ССР, можа і павінна стаць надзейным стабілізуючым і кансалідуючым фактарам у жыцці беларускага народа і ўсіх нацыянальных супольнасцяў рэспублікі, а таксама ў дзейнасці палітычных сіл грамадства.

1 снежня 1990 г. г. Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ДВА З... ШАСЦІСОТ

Каля 600 вядомых літаратараў краіны прадстаўлены ў энцыклапедычным даведніку «Пісьменнікі народаў Савецкага Саюза», выпушчаным сафійскім выдавецтвам імя д-ра Петра Берона. Гэтае унікальнае выданне дае магчымасць на прыкладзе канкрэтных імёнаў прасачыць, як развівалася ў асноўным савецкая шматнацыянальная літаратура, хоць робіцца экскурс і ў дарэвалюцыйны час.

Прыводзяцца звесткі з жыцця і творчасці прадстаўнікоў сорак адной літаратуры, змешчана падрабязная бібліяграфія выкананых у Балгарыі перакладаў кожнага з аўтараў.

Дваццаць два пісьменнікі з шасцісот — нашы. Беларуская літаратура прадстаўлена А. Адамовічам, Р. Барадуліным, В. Быкавым, М. Багдановічам, Ф. Багушэвічам, Я. Брылём, П. Броўкам, Н. Гілевічам, В. Дунінам-Марцінкевічам, У. Караткевічам, Я. Коласам, К. Крапівой, Я. Купалам, А. Макаёнкам, І. Мележам, І. Навуменкам, Ф. Скарынай, М. Сматрыцкім, М. Танкам, І. Чыгрынавым, К. Чорным, І. Шамякіным.

10 СНЕЖНЯ — СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Леанід ЯЎМЕНАЎ,
доктар філасофскіх навук

ЧАЛАВЕКУ І НАРОДУ

Правы чалавека — гэта і выток, і вынік сапраўднай дэмакратыі, сапраўднага гуманізму. Дэмакратыі і гуманізму як ідэалогіі. Дэмакратыі і гуманізму як сацыяльна-эканамічнай і палітыка-прававой практыкі. Гэта значыць, што без развітай ідэйна-тэарэтычнай і юрыдычнай сістэмы правоў чалавека, без развітай сістэмы ажыццяўлення правоў чалавека і народаў дэмакратыя і гуманізм не існуюць.

Нездарма правы чалавека — і як катэгорыя палітыка-прававога мыслення, і як сацыяльна-палітычная рэальнасць — рашуча не прызнаваліся і грэбліва адкідваліся як нацыянал-сацыялісцкім таталітарызмам Гітлера, так і «інтэрнацыянал-ісцкім» таталітарызмам Сталіна.

Нічога дзіўнага ў тым няма. Абедзве формы палітычнай дэспатыі над непаўторным духоўным светам кожнага чалавека ставілі адну адзіную, гранічна дагматызаваную, гіпертрафіраваную, адчужаную ад чалавека і грамадства ідэалогію. Над усімі намаганнямі, інтарэсамі, практычнымі ўчынкамі — жахлівы абсалют у выглядзе звышдзяржавы і гранічна адзяржаўленай палітычнай партыі. А яшчэ вышэй — звышабсалютная, абагоўленая абстракцыя, галоўная фігура дзяржавы і партыі — фюрэр ці правадыр. Чалавек з галоўнага суб'екта гісторыі ператвараўся ў абсалютнае нішто, у пыл на ботах правадыроў.

Як ведаць, што было б сёння з намі і з усім астатнім светам, калі б абодва таталітарызмы не сышліся ў крывавай бойцы? Роднаснага ў іх было зашмат, невыпадкова ж яны нейкі час ледзь не браталіся...

Аднак гэтыя сілы, антыподныя па вытоках і роднасныя па сутнасці, перадзяліўшы, перакаланізаваўшы свет, непазбежна павінны былі развязаць ваенны канфлікт паміж сабою: суб'ектам планетарнага таталітарызму не могуць быць дзве ці некалькі сіл у адным гістарычным часе, у адной гістарычнай прасторы. Полівалентнасць магчымая і нават непазбежна толькі для сацыяльна-палітычных усталяванняў дэмакратыі. Суіснаваць і ўзаемна дапаўняць адна адну могуць толькі яны, бо законы прыцягнення і інтэграцыі ўласцівыя толькі ім. Для разналікіх дэспатыяў уласцівы толькі працэс узаемаадчужэння, які імкнецца да ўзаемазнішчэння. Не кажучы ўжо пра тое, што таталітарызм і дэмакратыя — антаганісты, і не ўмяшчаюцца ў рамках «мірнага суіснавання», імкнуцца да «ўзаемаінтэграцыі» гвалтоўным чынам. Пра гэта і сведчыць тая вялікая кроў, што на працягу амаль паўстагоддзя пасля другой сусветнай бойні ты-

САЮЗНЫ ДАГАВОР: што нам прапануюць?

Я вельмі баюся, што, прагаварыўшы амаль пяць гадоў пра неабходнасць абнаўлення нашага Саюза, мы сёння будзем тэрмінова фарсіраваць падпісанне новага Саюзнага дагавора на той канцэптуальнай аснове, якая закладзена ў праекце, прапанаваным Прэзідэнтам. Альтэрнатыўных жа праектаў няма.

Вы звярнулі, чытач, увагу на тактыку, якой часта трымаецца А. Лук'янаў у Вярхоўным Савеце? Прапаноўваецца, напрыклад, праект таго ці іншага закона. Выступаюць дэпутаты, гавораць, што праект нікуды няварты, бо заганная сама яго канцэпцыя. Нічога, дабрадушна адзначае старшыня, давайце мы яго прымем за аснову, а потым унясём усе неабходныя змены і дапаўненні. Парламентарыі глытаюць гэтую прынаду, уносяць папраўкі, змены, дапаўненні, бо яны ўпэўнены, што ўдзельнічаюць у заканатворчай дзейнасці. Большасці з іх нават няўцям, што старшыня ўжо сваю справу зрабіў, правёў менавіта той законапраект, які хацеў правесці.

Менавіта гэтая тактыка А. Лук'янава перш за ўсё прыгадалася мне, калі я пазнаёміўся з праектам Саюзнага дагавора. У яго аснову, як гэта відавочна, пакладзены прынцып федэрацыі. Добры або кепскі гэты прынцып сам па сабе — гаворка цяпер не аб тым. Важна другое: як канцэпцыя дагавора, якая базіруецца на гэтым прынцыпе, улічвае рэальную сітуацыю ў краіне, можа быць прынята рэспублікамі? Думаю, што ніяк не ўлічвае: праект прадаўжае нашу «гістарычную традыцыю» — ісці не ад жыцця, а ад «тэорыі», ад схемы. У ім проста адмятаецца як штосьці неістотнае тое, што ідэя федэрацыі за гады існавання Саюза канчаткова скампраметавала сябе, а час для яе рэабілітацыі нашым «дэмакратычна абраным парламентам» безнадзейна ўпушчаны. Поўнасцю ігнаруецца і той факт, што гэта ідэя знаходзіцца ў невырашальнай супярэчнасці з прынятымі некаторымі рэспублікамі, ў тым ліку Беларуссю, дэкларацыямі аб дзяржаўным суверэнітэце, што яна супярэчыць ужо заключаным на падставе гэтых дэкларацый дагаворам паміж рэспублікамі, у прыватнасці, дагаворам Расіі з Украінай і Казахстанам, Украіны з Узбекістанам. Ці захочуць рэспублікі ануляваць свае дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце? Ці пойдуць Расія, Украіна, Узбекістан, Казахстан на тое, каб ануляваць заключаныя дагаворы? Ці магчымы тут нейкі кампраміс? Вельмі сумняваюся — занадта ўжо розняцца канцэптуальна гэтыя дакументы, і таму некаму давядзецца «паступіцца прынцыпамі». Вось толькі каму — Цэнтру або рэспублікам?

Што ж, аднак, прапаноўвае праект дагавора?

Пачну з заўвагі, не звязанай непасрэдна з яго зместам, але якая, тым не менш, мае прынцыповае значэнне. У праекце гаворыцца: «Саюзны дагавор уступае ў сілу з моманту яго падпісання. Для рэспублік, якія яго падпісалі, з гэтай даты лічыцца страціўшым сілу Дагавор аб утварэнні СССР 1922 года». З рэспублікамі, якія падпішуць дагавор, усё ясна: для іх Дагавор 1922 года губляе сілу. А як быць з тымі рэспублікамі, якія па тых ці іншых прычынах яго не падпішуць? Як быць з Грузіяй, Латвіяй, Літвой, Эстоніяй, якія ўжо заявілі цвёрда і пэўна: Саюзны дагавор яны не падпішуць ні пры якіх умовах? Ці азначае гэта, што для іх Дагавор 1922 года захавае сілу? Цяжка меркаваць, што людзі, якія рыхтавалі праект, не звярнулі ўвагу на гэтую яго «недагаворанасць».

Выступаючы на цяперашняй сесіі Вярхоўнага Савета СССР, Прэзідэнт прыгразіў «непаслухмяным»: мы, маўляў, яшчэ спытаемся ў народаў рэспублік — хочуць ці не хочуць яны жыць у новым Саюзе. Што ж, відаць, гэта справядліва. Няясна іншае: чаму гэтае правіла мяркуецца ўжыць толькі да тых рэспублік, якія не захочуць падпісаць Дагавор? Дзе крытэрый? Тут павінен быць адзіны падыход: калі ўжо праводзіць рэферэндум, то праводзіць усюды, калі не праводзіць, то нідзе не праводзіць. Дарэчы, правіла гэтае трэба было б замацаваць ужо ў тэксце Дагавора.

Яшчэ адна заўвага — канцэптуальнага плана. У праекце гаворыцца: «Кожная рэспубліка — удзельнік дагавору з'яўляецца суверэннай дзяржавай і валодае ўсёй паўнатой дзяржаўнай улады на сваёй тэрыторыі». Цяжка зразумець, якім чынам рэспубліка, будучы суб'ектам федэрацыі, можа валодаць «усёй паўнатой дзяржаўнай улады на сваёй тэрыторыі». Па логіцы ж атрымліваецца, што тады саюзныя органы не валодаюць на яе тэрыторыі роўна ніякай уладай. А на гэтую ўладу яны яшчэ як прэтэндуюць. Так што гэта альбо прапагандысцкі лозунг, або неразуменне самой сутнасці суверэннасці.

Давайце ўдумаемся як след і ў змест артыкула 5 праекта, у якім дадзены пералік паўнамоцтваў (г. зн. фактычна правоў, але для нашых заканадаўцаў правы і паўнамоцтвы — адно і тое ж), якія цэнтральная ўлада мае намер узяць сабе. Тут пералічаны ўсе ключавыя пазіцыі, з якімі звязана суверэннасць дзяржавы. Затое ўдзел рэспублік у ажыццяўленні паўнамоцтваў Саюза (артыкул 6) сфармуляваны ўсяго толькі адным абзацам, да таго ж настолькі неканкрэтным, што яго можна тлумачыць, як хочаш. Паўтараю: удумайцеся ў прапаноўваемае праектам «размежаванне паўнамоцтваў», і вы зразумееце, якую цану мае шырокавяшчальная яго заява аб тым, што рэспубліка «валодае ўсёй паўнатой дзяржаўнай улады на сваёй тэрыторыі». А каб не засталося на гэты конт ужо ніякіх сумненняў, я папрашу звярнуць увагу на артыкул 8, дзе нам абяцаюць, што падаткі і зборы, неабходныя для ажыццяўлення паўнамоцтваў Саюза ССР, будзе ўстанаўліваць сама цэнтральная ўлада. Іначай мовіць, калі цэнтральнай уладзе спатрэбіцца дзесятак-другі мільярдаў рублёў для аказання, скажам, «інтэрнацыянальнай дапамогі», то яна і запатрабуе яе з вас.

Нават калі пагадзіцца з праектам федэратыўнага прынцыпу пабудовы Саюза, то і ў гэтым выпадку павінна быць выразна агаворана: гэта правы і паўнамоцтвы Саюза, гэта правы і паўнамоцтвы рэспублік.

Далей. Рэспублікі самі павінны вызначыць, якія правы і паўнамоцтвы яны гатовы дэлегаваць Саюзу, іначай кажучы, у якой ступені яны згодны абмежаваць свой суверэнітэт. Метадалогія, пры якой цэнтральная ўлада вызначае, што яна мае намер узяць сабе, а што выдаткаваць ад шчадрот сваіх рэспублікам, — гэта метадалогія старога, імперскага мыслення. Усе гэтыя доўгія дзесяцігоддзі мы знаходзіліся на ўтрыманні «партыі і ўрада». Менавіта яны давалі нам і шчаслівае дзяцінства, і забяспечаную, бестурботную старасць. Цяпер вось яны мяркуюць ашчаслівіць нас «усёй паўнатой дзяржаўнай улады на сваёй тэрыторыі». Я цалкам згодны з Б. Ельцыным: сапраўды дэмакратычны Саюз суверэнных рэспублік можа быць сфарміраваны толькі «знізу», г. зн. праз сістэму дагавораў непасрэдна паміж рэспублікамі.

Прадоўжым, аднак, разгляд праекта. У артыкуле 7, які абвяшчае «свабоднае развіццё і абарону ўсіх форм уласнасці, уключаючы ўласнаць грамадзян», нічога не гаворыцца аб прыватнай уласнасці, без якой, як вядома, ніякая паўнакроўная рыначная эканоміка немагчымая. Калі прыняць пад увагу змешчанае тут жа палажэнне аб тым, што «рэгуляванне заканадаўствам рэспублік адносін уласнасці на зямлю, яе нетры і іншыя прыродныя рэсурсы не павінны перашкаджаць рэалізацыі паўнамоцтваў Саюза», гэтае падазрэнне перарастае ў крайні непакой. На самай справе, уявіце сабе такую сітуацыю: рэспубліка ўводзіць у сябе інстытут прыватнай уласнасці, а Саюз тут жа яго анулюе на той падставе, што гэта «перашкаджае рэалізацыі паўнамоцтваў Саюза».

Артыкул 9 прысвечаны пытанням заканадаўства. У ім гаворыцца, што рэспубліканскія законы маюць вяршэнства ў межах кампетэнцыі рэспублік, саюзныя — у межах кампетэнцыі Саюза. Тое, што саюзнае заканадаўства павінна дзейнічаць у межах правоў, якія рэспублікі дэлегавалі Саюзу, а рэспубліканскае — у межах правоў, якія рэспублікі пакінулі сабе, — усё гэта зразумела і адпавядае прынцыпу федэрацыі. Але вось паняцце «вяршэнства законаў» — гэта юрыдычны нонсенс: закон ёсць закон, і адзін закон не можа быць больш «законным», чым другі. У межах дэлегаваных рэспублікамі Саюзу правоў павінны дзейнічаць саюзныя законы. І не таму, што яны маюць нейкае «вяршэнства», іншых проста быць не павінна. Дэлегаваўшы Саюзу пэўныя правы, рэспублікі дэлегуюць разам з імі ўсе паўнамоцтвы па іх рэалізацыі, у тым ліку юрыдычнаму рэгуляванню. І, наадварот, Саюз не надзелены правам заканатворчай дзейнасці ў межах тых правоў, якія рэспублікі пакінулі сабе. Тут павінны дзейнічаць рэспубліканскія законы, і ніякіх іншых не павінна быць.

Што датычыць органаў улады і кіраўніцтва, то тут заслугоўвае ўвагі прапанова ўвесці ў Савет Федэрацыі кіраўнікоў рэспублік, а ў Кабінет міністраў — кіраўнікоў урадаў рэспублік. На першы погляд, мера досыць дэмакратычная. Аднак калі суаднесці гэтую меру з тымі функцыямі, якія закліканы выконваць Савет Федэрацыі і Кабінет міністраў, то міжволі напрошваецца пытанне: калі ж кіраўнікам рэспублік і кіраўнікам урадаў рэспублік усім гэтым займацца? Ці не будзе гэта найчыстай вады «прадстаўніцтвам», якім мы ўжо сытыя па горла? Няясна таксама, чаму персанальны склад Савета Федэрацыі, акрамя кіраўнікоў рэспублік, вызначае выключна Прэзідэнт, без узгаднення з Вярхоўным Саветам? Калі я не памыляюся, то ў аналагічным выпадку такое права не прадстаўлена нават Прэзідэнту ЗША.

Можна было б яшчэ пра многае пагаварыць. Напрыклад, праект зусім абыходзіць пытанне працэдуры выхаду рэспублікі са складу Саюза. І гэта пасля сітуацыі з Літвой!

У заключэнне хацелася б адзначыць наступнае. Калі Прэзідэнт прывядзе сваю пагрозу ў дзеянне і прызначыць рэферэндум, многія, я ўпэўнены, будуць галасаваць супраць такога Дагавора. Нават калі Анатоль Іванавіч Лук'янаў прапануе прыняць яго ўсяго толькі «за аснову». І гэта пры тым, што я прынцыповы прыхільнік Саюза.

В. АКУЛАЎ,
доктар філасофскіх навук,
прафесар.

танаў таталітарызму малымі рэкамі няспынна нясе чалавецтва ў акіян агульначалавечага небыцця.

Аб'ектыўна, як адна з праяў неверагоднай супярэчлівасці гісторыі, сталінскі таталітарызм быў усё ж адной з галоўных сіл супрацьстаяння гітлерызму і вызвалення народаў ад расісцкай няволі, нацыянал-сацыялістычнага генацыду. Надзвычайную гераічную і самаахвярную ролю адыграў у гэтай аб'ектыўнай гістарычнай місіі просты савецкі чалавек.

Але суб'ектыўна, і гэта ўсё больш выразна паўстае ў святле сённяшняга дня, — то была бойка дзвюх несумяшчальных па вытоках гігантаў дэспатыі, якія мелі агульны намер — абсалютнае панаванне пэўнай ідэалогіі, палітыкі, эканамічнай сістэмы над усім белым светам, абсалютнае панаванне таталітарнай дзяржавы над чалавекам, яго асобай, над нацыямі і народамі.

Так, наш уласны, родны таталітарызм, фарбуй яго ў чорныя ці чырвоныя колеры, быў таксама звычайным таталітарызмам. Пра тое сёння сведчыць многае. Пачнём хоць бы з ідэалогіі «сусветнай пралетарскай рэвалюцыі», і шматлікіх, амаль да апошніх часоў практычных захадаў па яе гвалтоўным экспарце... А ганебная афганская авантура? А ідэалогія і палітыка абсалютнай першаснасці інтарэсаў ды ідэалаў таталітарнай дзяржавы і адзінай партыі, іх правадыроў — перад інтарэсамі і патрэбамі як канкрэтнага чалавека, так і цэлых народаў?... А палітычны генацыд? Сталінскія ГУЛАГі ды Курапаты нічым па сутнасці не адрозніваюцца ад гітлераўскіх Бухенвальдаў і Хатыняў. У рэшце рэшт, іх агульны падмурак — палітычны таталітарызм.

Пры гэтым я катэгарычна не падзяляю думку некаторых калег, якія атаясамліваюць сталінскі таталітарызм з сацыялізмам, камунізмам, сапраўдным інтэрнацыяналізмам. Сталінскі таталітарны дзяржаўна-манапалістычны сацыялізм, які мала чым адрозніваецца ад таталітарнага дзяржаўнага капіталізму гітлераўскай Германіі, — жахлівая з'ява. Пад прывабліывым для мас ідэйна-прапагандысцкім шалупіннем «сацыялістычнай» дэмагогіі яна ўвабрала ў сябе антысацыялізм, антыкамунізм, антыінтэрнацыяналізм. Антысавецкасць, калі хочаце.

Сапраўды. Марксісцкі навуковы сацыялізм меў на мэце ліквідаваць эксплуатацыю чалавека чалавекам. Сталінскі таталітарны сацыялізм замяніў гэтую форму эксплуатацыі масавай і непараўнальна больш жорсткай эксплуатацыяй чалавека дзяржавай. Марксісцкі навуковы сацыялізм меў на мэце стварэнне (на першых этапах) дзяржавы дыктатуры пралетарыята. Яе ўнутранай сутнасцю павінна была стаць шырокая і глыбокая дэмакратыя для ўсіх працоўных пластоў і класаў. Яе галоўная сутнасная функцыя — стваральная: вытворчая ды ўпраўленчая. Рэпрэсіўныя акцыі гэтага дзяржаўнага ўтварэння маглі быць накіраваныя толькі супраць варожых дзеянняў прадстаўнікоў нізрынутага ладу. Такім чынам, новая дзяржава мусіла быць грамадзянскай дзяржавай. Сталін канчаткова ліквідаваў гэтую дыктатуру пралетарыята разам з яе дэмакратыяй працоўных і для працоўных. Дыктатура пралетарыята (чытай: улада Саветаў) была заменена абсалютнай дыктатурай партыйна - дзяржаўнай бюракратычнай эліты. Сутнасць і галоўная функцыя гэтай дыктатуры — рабаўладальніцкая дэспатыя і рэпрэсіўнасць, накіраваныя на «ўласныя» класы і пласты: рабочых, сялян, інтэлігенцыю. Вытворчасць, матэрыяльная і духоўная, уся сфера ўпраўлення былі працяты менавіта гэтай сутнасцю, і гэтай функцыяй новай дыктатуры. Такім чынам замест грамадзянскай дзяржавы была створана і ўзвышана над усім грамадствам адчужаная ад яго і варожая яму таталітарная дзяржава эліты.

Пералічэнне падобных тэзаў можна доўжыць яшчэ і яшчэ. Ды і фактычны рад для ілюстрацыі абсалютнай антысацыялістычнасці і антыкамуністычнасці сталінскага таталітарызму таксама жахліва доўгі. Але выснова можа быць толькі адна: марксісцкі сацыялізм і камунізм — яскравая мара аб росквіце ўсіх «богам» дадзеных малых і вялікіх правоў чалавека і народаў; сталінскі таталітарызм — руйнаванне ўсіх фундаментальных і нефундаментальных правоў чалавека і народаў.

Дык ці можна атаясамліваць сталінскае пачварнае грамадска-дзяржаўнае ўтварэнне з марксізмам, сацыялізмам, камуністычнай ідэяй і рухам, з «камуністычным рэжымам»? З рэжымам, рэжымам дэспатыі і таталітарызму, — не толькі можна, але і неабходна. З сацыялізмам, камунізмам?.. З якога боку палітычнай геаметрыі яно б ні ішло — катэгарычна нельга!

Тое ж самае і з КПСС. Яе абвінавачваюць сёння ва ўсіх грахах таталітарызму, патрабуючы сысці з палітычнай сцэны... Але шматмільённая партыя радавых камуністаў, ангажаваная тысячагадовымі агульначалавечымі ідэаламі сацыяльнай праўды і справядлівасці да абяздоленых, не мае непасрэднай віны ў трагедыі народа і краіны. Дарэчы, у сваёй уласнай трагедыі. Як арганізацыя і рух, яна была першай растаптаная ды спляжаная чорнымі смерчамі рэпрэсій татальнай дыктатуры, якую ажыццяўляла партыйна-дзяржаўная эліта. Яна, гэтая шматмільённая партыя радавых, заўсёды была і дагэтуль застаецца пазбаўленай рэальнай палітычнай і эканамічнай улады. У сэнсе палітычных правоў шматмільённая палітычная партыя стала ў сталінскія часы прававой жабрачкай. Яна, гэтая радавая армія, была заўсёды і застаецца дагэтуль бяздонным рэзервуарам і авангардам смяротнікаў і ахвярнікаў у сацыяльна - эканамічных і мілітарысцкіх авантурах палітычнай эліты, агромністым статкам для забеспячэння сытага жыцця і ўтульнага дабрабыту вялікіх і мудрых даяроў. Мо адзіная яе віна ў тым, што, прыдушаная жалезнай пятой таталітарызму, яна не змагла разгледзець у свой час жахлівай небяспекі сталінскага цэнтралізму, адкінуўшага нават напамін аб дэмакратыі і дэмакратычнасці. Дазволіла зрабіць з сябе не толькі армію смяротнікаў і ахвярнікаў, але і стартавую пляцоўку для прайдзісветаў усіх масцей.

Але калі мы хочам стаць цывілізаванымі людзьмі і цывілізаваным грамадствам, аўтэнтычны рух трэба адраджаць гэтак жа, як і ўсё астатняе, зганьбаванае і знішчанае. Камуністычную ідэю, камуністычныя памкненні спарадзілі не Маркс, не Энгельс і не Ленін. Гэтая ідэя і гэтыя памкненні маюць за плячыма тысячагод-

(Працяг на стар. 15).

УЗІРАЮЧЫСЯ Ў ТВАРЫ

Лірычна-палітычны абразок

ЛЮБЛЮ ўзірацца ў незнаёмыя твары, гэтыя красамоўныя абалонкі чалавечых сутнасцей. Твары засяроджаныя і ўсмешлівыя, нафарбаваныя і азызлыя, адухоўленыя і пазбаўленыя нават пробліску інтэлекту...

Кожнага дня праязджаю побач з Домам мадэляў, «упрыгожаным» манументальным пано з выяваю рэвалюцыйнага народа. Як бы навісаючы над Нямігай, пано нязменна прыкоўвае да сябе ўвагу. І зусім не мастацкімі вартасцямі. Непрыемна ўражваюць постаці змагароў за лепшае будучае. Хада іх рашучая, твары суровыя, у кожнай рысе—бальшавіцкая нязломнасць і перакананасць. (Такімі, ва ўсякім разе, іх думалі паказаць стваральнікі). Праўда, напрошваюцца і іншыя азначэнні. Мо не суровыя гэта твары, а жорсткія, бязлітасныя? Мо не рашучасць у кроку, а відавочная пагроза? Зразумелая справа, такія ні перад чым не спыняцца ў хадзе да светлай мары чалавецтва. І — каб ні кроку назад.

Так, адступаць няма куды — напісана было на тварах афіцыйных асоб, што прысутнічалі на нядаўнім кастрычніцкім мітынгу. На абліччах прыгнечанасць і няўцямнасць: штосьці скранулася ў свеце, штосьці прыйшло ў рух і можа скончыцца абвалам... Няўтульна стала на прыбранай сцягамі плошчы, сіберна. Нейкая не святочная зусім атмасфера. А раней жа... Як не ўспомніць: дэманстранты, транспаранты, каляровыя шары, кветкі... (Цікава, што адчувае шар, з якога выходзіць паветра?)

Няма таго, што раньш было. Пройдзе парад, і пачнецца — ёсць інфармацыя — іншае шэсце. З іншымі калонамі—добраахвотнымі, з іншымі лозунгамі — не заштампаванымі...

І зноў — твары, твары, твары... У асноўным мужчынскія, ды такія падобныя, як быццам блізнят сабралі на які-небудзь конкурс або злёт. На экране — XXXI з'езд КПБ. Падабенства, магчыма, ад нудоты, якую навявае справаздачны даклад. Але не толькі. У прасторнай зале сышліся не проста таварышы па партыі. Большасць з дэлегатаў—людзі, якія зрабілі службу партыі сваёй прафесіяй. У звычайных чалавечых зносінах яны, верагодна, бываюць рознымі — эмацыянальнымі, непасрэднымі, дасціпнымі. Злуюцца на дзяцей, лашчаць унукаў, рагочуць над анекдотамі. Там яны — сапраўдныя, жывыя. Тут жа, у афіцыйнай абстаноўцы, пры афіцыйнай падзеі, як і заўжды **пры выкананні,** людзі нібы маскі на твары надзелі. Пераўвасобіліся. Увайшлі ў ролю. І самі не заўважаюць, што маскі даўно прыраслі. Назіраючы за тым, каму лёсам наканавана з выглядам ідалаў выседжваць у прэзідыумах, неаднойчы шкадавала таварышаў. Іх высушыла, пазбавіла вастрыні ўспрымання, па сутнасці скалечыла **функцыя!**

Яны не толькі прылады, механізмы Сістэмы, але і ахвяры яе. За хатні камунізм, аказваецца, трэба плаціць! І плацяць — хто сумленнем, хто годнасцю, і ўсе — проста душой (савецкі варыянт узаемадачыненняў Фаўста і Мефістофеля). Таму так дзівішся, калі сустракаеш сярод функцыянераў людзей незасушаных і незашораных, карацей — нармальных. На жаль, іх не так многа.

Імпульсіўным і незакамплексаваным чалавекам, мяркуючы па шматлікіх сведчаннях, быў Ленін. З ягонай усмешкай толькі гагарынская, бадай, можа параўнацца. А ці ведаеце вы апошнія прыжыццёвыя здымкі Ільіча? З папярэднімі іх не пераблытаеш. Увасобленая пакута глядзіць на нас запалымі вачамі правадыра. Можна дапусціць, што пакутуе ён ад немагчымасці быць у гушчы жыцця, ад вымушанай адлучанасці ад кіраўніцтва, улады. Але мне даводзілася чуць і інакшае тлумачэнне: ён усвядоміў, што ўзышло з пасеянага, разуверыўся ў справе свайго жыцця. З імглы наступнасці, з нашага зусім не светлага далёкага, можа, бачацца яму «дары», што прынясуць калісьці да помніка няўдзячныя аб'екты сацыяльнага эксперыменту?

А яшчэ мне ўспамінаецца твар жанчыны, якая дэманстратыўна піхнула нагой кветкі ля падножжа помніка. Дзесьці бачыла я гэтую зацятасць, гэтую непрымірымасць. Дзе б гэта, а? На металічным узоры сацрэалізму!

Кола замкнулася. Шар зноў напаўняецца самаздаволенасцю і мкнецца ў прасцяг. Аднекуль даносіцца нядужае ветэранскае «ўра», узмоцненае газетамі да грамавога раскату. Няўхільная хада ў нікуды працягваецца...

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ.

НАС ЗНОЎ АБАРАНЯЮЦЬ...

З нагоды адной заявы

Узяцца за пяро мяне прымусіў «Зварот мінскага палітклуба «Камуніст» да членаў Кампартыі Беларусі, да ўсіх грамадзян рэспублікі, што захавалі вернасць ідэалам Вялікага Кастрычніка», надрукаваны ў «Вячэрнім Мінску».

Я член КПСС амаль чвэрць стагоддзя, журналіст і член Саюза пісьменнікаў. З верасня гэтага года я пенсіянер, а таму чалавек адносна незалежны, не зацікаўлены ні ў кар'еры, ні ў падкормцы з рук партыйнага апарату. Разлічваю на давер маіх чытачоў і выказваю свае думкі, шчыра жадаючы падзяліцца жыццёвым і чалавечым вопытам з вышыні сваіх турботных і няпростых шасцідзесяці гадоў.

Але вярнуся да таго звароту палітклуба. Чаго патрабуюць, да чаго заклікаюць яго аўтары? І надалей змагацца за ідэалы Кастрычніка. Але ж хіба наш шматпакутны сённяшні дзень не яскравае ўвасабленне, практычнае ажыццяўленне «ідэалаў Кастрычніка»? Менавіта гэтае статус-кво і імкнуцца захаваць кіраўнікі партыйных структур, падпусціўшы ідэалагічнага туману, які ўжо мала на каго ўздзейнічае. Так, пакуль што кампартыя валодае немалой практычнай уладай, мае вялікі партапарат, сродкі, маёмасць. Яна накіроўвае дзейнасць КДБ, арміі, праваахоўных органаў. Партыя змагла ўкараніцца ў абраных Саветах, члены партыі складаюць большасць у беларускім парламенце.

Зараз партыйныя функцыянеры, змагары ідэалагічнага фронту, чапляюцца за апошнюю надзею — імя Леніна. Маўляў, вось каб ён жыў, сацыялізм быў бы пабудаваны. Я згодзен з тым, што У. І. Ленін быў палітычным дзеячам сусветнага маштабу. Але ж не будзем заплюшчваць вочы на тое, што менавіта ён стварыў таталітарную партыю, якая праз кроў і рэпрэсіі пацягнула мільёны людзей (не папытаўшы іх згоды) да «светлай будучыні». Дарэчы, гэта пры Леніне пачалося знішчэнне лепшых прадстаўнікоў «старой» інтэлігенцыі, духавенства. Яго верныя паплечнікі, у першую чаргу крывавы кат Сталін развілі ленінскае вучэнне, ператварыўшы краіну ў суцэльны канцэнтрацыйны лагер.

Адным словам, вялікі Ленін па праву носіць імя заснавальніка нашай дзяржавы, менавіта такой, якой яна была 70 гадоў і якую цяпер, перакананўшыся ў відавочнай няўдачы «эксперыменту», мы хочам абнавіць, павярнуць на шлях цывілізаванай, багатай, дэмакратычнай дзяржавы.

Адзін з важнейшых інструментаў пабудовы менавіта такой краіны — перавод нашай занядбанай эканомікі на рэйкі рыначных адносін, дзе сапраўды будзе рэалізаваны дэвіз: «кожнаму — па працы». Вось гэта больш за ўсё хвалюе і аўтараў звароту мінскага палітклуба «Камуніст». Барацьба з тым рынкам, па іх разуменні, ці не апошні шанц для абароны «рабочага чалавека, які жыве на сваю зарплату». І далей: «Пад выглядам рынку, які сам па сабе не пярэчыць руху да сацыялізму, грамадству навязваецца перадача грамадскай уласнасці ценявому капіталу». Ну, а ценявая эканоміка натуральна пагражае галечай, беспрацоўем, нават класавай і грамадзянскай вайной. Так. І я супраць ценявой эканомікі. Але навошта гэтую пачварную з'яву блытаць з цывілізаваным рынкам, пры дапамозе якога многія і многія краіны Захаду і Усходу дамагліся эканамічнага росквіту, акурат і пазбавіўшыся галечы мільёнаў працоўных? Трэба сказаць, што аўтары заявы не абмяжоўваюцца чыста «тэарэтычным» абгрунтаваннем сваёй пазіцыі, яны заклікаюць да актыўных дзеянняў, накіраваных супраць рыначных адносін: «На пасяджэннях палітклубаў.., у курылках і на рабочых месцах растлумачвайце людзям згубнасць і антынародную сутнасць прапануемых Цэнтрам эканамічных праграм»...

Сярод маіх знаёмых шмат так званых «простых людзей» — рабочых, сялян. Што яны хочуць ад перабудовы? Перш за ўсё—волі, эканамічнай незалежнасці і справядлівасці. Стаць гаспадаром сваёй працы. Гаспадаром!

Чуў аднойчы такую скаргу рабочага:

— Я сем гадзін стаю ля станка і атрымліваю 200. А мой сусед пайшоў у кааператары і грабе грошы лапатай!..

— Дарагі мой,—адказаў я.— Не сусед твой атрымлівае многа, а ты—мала.

Ці не гэтага небараку-рабочага збіраецца абараняць палітклуб «Камуніст»? Абараняць ад магчымасці зарабіць больш, ад магчымасці прадаваць сваю працу па дастойнай цане. У «Звароце» яго палохаюць вяртаннем эксплуатацыі. А хіба цяпер яго не эксплуатуюць, пакідаючы яму каля 20 працэнтаў рэальна зробленага? І мой, і той «рабочы чалавек, які жыве на сваю зарплату», злаўчыўся б зарабіць больш, каб даць яму волю і магчымасць. І бог з ім, з сацыялістычным выбарам, абы жылося лепш!

Мне неаднойчы даводзілася быць у Італіі, і мне заўсёды цікава было даведацца, як здарылася, што Італія, пераможаная краіна, пасля вайны стала ці не пятай дзяржавай свету па ўзроўні дабрабыту людзей. І, дарэчы, прыродных багаццяў у яе нямнога, і зямля не дужа ўрадлівая, а, бач ты, дапамога па беспрацоўі куды большая, чым зарплата нашага рабацягі. Якіх толькі тавараў няма ў італьянскіх магазінах, цяпер ужо і не надта дарагіх (былі, помню, даражэйшыя)!

Якая ў нас ці не самая зневажальная мянушка? Кааператар, прадпрымальнік. А там, у Італіі, бізнесмэн, менеджэр — самая паважаная прафесія. Бо ўсе гэтыя бананы, какосавыя арэхі, ананасы, сотні гатункаў сокаў і напіткаў, вяндліны, мяса і сыроў прывезлі ў магазіны яны.

— «Нажываюцца!» — скажа наш чалавек, гатовы «абараняць выбар Кастрычніка 1917 года».

Вядома, зарабляюць добра. Бо праца ў іх цяжкая, творчая і бяссонная. Бо іначай—нельга. Бо працаваць так, як у нас— абы дзень ды ноч, — грэшна. Трэба любой працы аддавацца цалкам. Пры такіх адносінах і ў нас не будзе рабочага чалавека, якога трэба «абараняць» і жывасілам цягнуць у светлую, бестурботную і лянівую, хоць і галодную, будучыню.

Партыйныя пастыры з палітклуба «Камуніст» звяртаюцца і да балючай тэмы інтэлігенцыі: «рэалізацыя планаў, якія намячаюцца («цэнтрам» на чале з М. Гарбачовым.—**А. Ш.**), непазбежна вядзе да камерцыялізацыі духоўнай сферы, першай ахвярай якой будуць пяшчотныя парасткі беларускай нацыянальнай культуры, якая адраджаецца»...

Бачыце, на 70-м годзе партыйна-бюракратычнай аўтарытарнай улады і такі, раптам, клопат аб нацыянальнай культуры! Радуйцеся, таварышы майстры мастацтва, усе інтэлігенты, вас зноў спрабуюць абараніць. Як некалі абаранялі ад «тлятворнага ўплыву» Захаду, ад фарміалістаў і касмапалітаў, ад творчых памылак і свабоднай канкурэнцыі талентаў.

Што, урэшце, трэба рабіць, каб не даць здзейсніцца варожым народу планам «цэнтра», не даць у рэспубліцы ходу свабоднаму, «капіталістычнаму» рынку, які так напалохаў аўтараў «Звароту»? Усё, аказваецца, проста: «Абаронцам карэнных інтарэсаў працоўных можа і павінна выступіць Камуністычная партыя». Ці—«Памятайце, што без аздароўленай партыі не аднавіць парадак на вытворчасці, у грамадстве, не пакончыць з карупцыяй, гандлёва - кааператыўнай мафіяй, не забяспечыць мірнага будучага для нашых дзяцей і ўнукаў».

Так і хочацца спытаць: «А дзе яна была раней—трыццаць, пяцьдзесят і семдзесят гадоў назад? Хіба не ведаеце, адкуль цягнуцца гэтыя пачварныя з'явы ў грамадстве?..»

Такія думкі ўзніклі ў мяне пасля прачытання гэтага «дакумента».

Я, вядома, не супраць існавання камуністычнай партыі, я супраць толькі яе манаполіі ва ўсіх сферах нашага жыцця. Павінна быць спаборніцтва розных партый, грамадскіх рухаў, ідэй.

Я аптыміст, і веру ў тое, што надыдзе час, калі мы будзем жыць у вольным, дэмакратычным грамадстве, дзе кожны чалавек будзе гаспадаром свайго лёсу і сваёй працы.

Анатоль ШАЎНЯ.

ТРОШКІ І БЕЛАРУСКІ ПРЫАЗЁРСК...

Прыазёрск знаходзіцца далёка ад нашай рэспублікі — ён у Джэзказганскай вобласці Казахскай ССР, але горад гэты — трошкі і беларускі. Нядаўна прыйшоў адтуль ліст і нумар газеты «Рокаш», якую выпускае Прыазёрская гарадская рада Таварыства беларускай мовы. Спосаб выдання — не друкарскі, але газета ёсць, і прытым цікавая, са сваім тварам.

Кідаюцца ў вочы два эпіграфы. Першы — своеасаблівы сёння пароль наш: «Жыве Беларусь!» Другі, узяты з верша Максіма Багдановіча, заклікае: беражыце сваё, крэўнае, не дазваляйце ператварыць сябе проста ў насельніцтва. Памятаеце? «Бійце ў сэрцы іх, бійце мячамі. Не давайце чужынцамі быць...»

Матэрыялы нумара таксама нямала даюць і душы, і сэрцу. Мяркуйце самі. Хіба нельга не прыслухацца да думак «божай міласцю Вінцэнта Доўнар-Грынькевіча, шляхціча беларускага, пашпартнага паляка», выказаных у звароце «Да шляхты беларускай»: «Дзе ваш гонар, паны-шляхта, дзе ваш розум, дзе ваша сумленне? Душы вашых дзядоў не прызнаюць вас у задушны дзень, бо яны былі патрыётамі Белай Русі, як бы іх ні называлі — ці літвінамі, ці русінамі. Яны цвёрда зналі, што яны тутэйшыя, а не прышлыя, не набрыдзь, не навалач. Вы не стрыечныя, а родныя дзеці гэтай зямлі, што б там ні запісалі ў ваш пашпарт...»

А хіба не ўражвае інфармацыя пра адкрыццё ў Прыазёрску беларускай нядзельнай школы? Тут жа — кароткі агляд «Беларуская мова» С. Судніка.

«Не ўсіх дурных вайна пабіла» — так рэзка, але досыць пераканаўча палемізуе В. Сярпінскі з аўтарам артыкула «Загадкі палескіх пушчаў» П. Петрыкавым у ліпеньскім нумары «Политического собеседника».

У нумары ёсць паведамленне пра ўстаноўчую канферэнцыю Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» і выступленне на ёй прадстаўніка Прыазёрска І. Супаненкі, верш С. Судніка «Жаданне»...

А яшчэ ў гэтым нумары прысутнічае просьба да чытачоў даслаць пры магчымасці хоць некалькі падручнікаў па беларускай мове і літаратуры на адрас: **472200, Казахская ССР, Джэзказганская вобласць, г. Прыазёрск, вул. Панфілава, д. 3. кв. 20, Судніку Станіславу Вацлававічу.**

Адгукнёмся на просьбу беларусаў з казахстанскага Прыазёрска?

А. М.

РАТАВАЦЬ КУЛЬТУРУ

5 кастрычніка 1990 г. у «Літаратуры і мастацтве» быў апублікаваны праект Закона Беларускай ССР «Аб культуры БССР», выкананы рабочай групай, якую ўзначаліў член-карэспандэнт АН БССР В. Шабайлаў. Пасля публікацыі ў камісію Вярхоўнага Савета БССР па адукацыі, культуры і гістарычнай спадчыне прыйшло нямала крытычных заўваг, прапаноў, паартыкульных паправак, якія ў далейшай працы над праектам закона ў значнай ступені намі ўлічаны.

У шырокім абмеркаванні закона лейтматывам гучала думка аб стварэнні прававых і матэрыяльна-фінансавых гарантый, якія б падтрымлівалі і стымулявалі культурную і культурна-асветніцкую дзейнасць, бо інакш яна будзе камерцыйна дэфармавана і прафаніравана ва ўмовах пераходу грамадства да рыначных адносін. Трэба ясна зразумець, што культура не з'яўляецца (ва ўсякім разе, у сваім асноўным гуманістычна-творчым змесце) чыста вытворчай сферай і не зможа вытрымаць канкурэнцыі са звычайнымі таваравытворцамі.

Нельга дапусціць, каб эканамічны заняпад грамадства супаў з падзеннем яго культурнага ўзроўню. Таму першы прынцып «Асноў заканадаўства аб культуры Беларускай ССР» —не шкадаваць ні фінансавых, ні матэрыяльна-тэхнічных сродкаў на культуру. Я быў уражаны да глыбіні душы. калі, разгарнуўшы вынесены на бліжэйшую сесію праект дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР на 1991 год, убачыў, што цэнтралізаваныя выдаткі на забеспячэнне развіцця культуры ў параўнанні з 1990 г. павялічаны ўсяго ў 1,5 — 2 разы.

На наш погляд, — я кажу наш, таму што такі пункт гледжання быў цалкам атрыманы на нядаўняй нарадзе кіруючых работнікаў культуры розных рэгіёнаў рэспублікі, прадстаўнікоў творчых саюзаў, дзеячаў мастацтва, — дзяржаўнае фінансаванне развіцця культуры павінна зыходзіць з навукова-абгрунтаваных норм і складаць (па крайней меры **пры пераходзе да рынку** — менавіта на гэтай фармуліроўцы настойваў дырэктар нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы І. Вашкевіч) не менш за тры працэнты рэспубліканскага бюджэту мясцовых Саветаў. Трэцюю частку гэтых трох працэнтаў, зноў жа на нашу агульную думку, трэба выдаткоўваць па квотах на развіццё культуры ў сельскай мясцовасці, якая цяпер — пра гэта з болем гаварылі на нарадзе раённыя арганізатары культурнай дзейнасці — знаходзіцца ў гаротным, калі не сказаць, катастрафічным становішчы. А так жа вытокі, карані беларускай нацыянальнай культуры, адраджэнне якой з'яўляецца надзённай задачай. Дык няўжо дамо высахнуць гэтым крыніцам, гэтым караням?

У «Асновы заканадаўства аб культуры БССР» уключаны спецыяльны артыкул, які прадугледжвае дадатковыя стымулы і гарантыі развіцця культуры ў сельскай мясцовасці.

Як вядома, праект закона апрабіраваўся на некалькіх нарадах з удзелам, як кажуць, зацікаўленых асоб. Удзельнікі адной з іх, дарэчы, скліканай па ініцыятыве старшыні камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і гістарычнай спадчыне Н. Гілевіча, выказаўшы шэраг слушных заўваг адносна праекта закона, аднадушна падтрымалі зварот камісіі да народных дэпутатаў рэспублікі аб уключэнні ў парадак дня чарговай сесіі пытання аб разглядзе праекта «Асноў заканадаўства аб культуры». Такой думкі прытрымліваюцца і іншыя камісіі ВС.

Удасканалены праект закона трэба тэрмінова выносіць на разгляд сесіі яшчэ і таму, што наспела неабходнасць вызвалення прадпрыемстваў і іншых аб'ектаў культуры ад саюзных падаткаў. Гэтага патрабуюць літаральна ўсе работнікі культуры. Міністэрства культуры БССР, Саўмін, камісію ВС, якую ўзначальвае Н. Гілевіч, распрацоўшчыкаў закона літаральна закідалі пісьмамі па гэтым пытанні. Трэба быць самакрытычным. Тыя крыху «лібералізаваныя варыянты» артыкулаў па падатках і льготах на падаткаабкладанне, якое распрацоўшчыкі Закона «нарасцілі» ў ходзе папярэдняга абмеркавання, як відаць са шматлікіх зваротаў работнікаў культуры, іх не задавальняюць.

Пашыраная рабочая група ў рэшце рэшт прыняла рашэнне даць указаныя артыкулы ў радыкальнай рэдакцыі. Не ўдаючыся ў падрабязнасці, заўважу толькі, што сутнасць гэтай рэдакцыі ў тым, каб цалкам вызваліць ад падатку на прыбытак дзяржаўныя, ведамасныя (у тым ліку небюджэтныя, гасразліковыя) прадпрыемствы, што ажыццяўляюць культурную дзейнасць. Звышпрыбытак — у першую чаргу прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць у сферы культуры мэтанакіраваную камерцыйную дзейнасць, — павінен абкладацца прапарцыянальна свайму ўзрастанню прагрэсіўным падаткам. Не ўсё тут, вядома, вырашана. У прыватнасці, узнікаюць пытанні: як вылічаць звышпрыбытак, у якой прапорцыі павінен узрастаць прагрэсіўны падатак і г. д.

Відаць, гэтыя і падобныя да іх пытанні павінны быць вырашаны ў час абмеркавання на чарговай сесіі праекта Закона аб падатках і падаткаабкладанні ў БССР. Магчыма, туды павінен быць перанесены і адпаведны раздзел з «Асноў заканадаўства аб культуры».

Камісія Вярхоўнага Савета БССР па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны, сама рабочая група прыйшлі да адзінай думкі (і яе, здаецца, падзяляюць работнікі Саўміна і Міністэрства культуры) аб тым, што агульны Закон не можа вычарпаць усяго аб'ёму прававой творчасці ў галінах культуры. Ён павінен служыць зыходнай базай, асновай для распрацоўкі і прыняцця цэлай серыі (як кажуць, «пакета») іншых заканадаўчых і нарматыўных актаў па розных напрамках, абласцях культурна-асветніцкай дзейнасці.

Напэўна, у першую чаргу трэба было б прыняць: Закон аб ахове, вывучэнні і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры, Закон аб інтэлектуальнай уласнасці і ахове аўтарскіх правоў, Закон аб бібліятэках і бібліятэчнай справе ў Беларусі (чарнавы яго варыянт ужо падрыхтаваны работнікамі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна), Закон аб архівах і архіўнай справе ў Беларускай ССР, Закон аб выдавецтве, Закон аб атэстацыі кадраў работнікаў культуры, Закон аб кінаіндустрыі, Закон аб тэатральнай справе, Закон аб стварэнні і выкарыстанні фондаў культуры. Закон аб аматарскіх аб'яднаннях, Закон аб творчых саюзах.

Апошні, паводле справядлівай заўвагі старшыні праўлення Саюза кінематаграфістаў В. Нікіфарава, мог бы значна стымуляваць творчую, арганізацыйна-эканамічную кансалідацыю прафесійных дзеячаў мастацтва.

І. ШЫРШОЎ,
кандыдат філасофскіх навук.

Што трэба зрабіць, каб вывесці нашу культуру з гаротнага стану? Пэўны адказ на гэтае складанае пытанне дае праект «Асноў заканадаўства аб культуры Беларускай ССР», які, трэба спадзявацца, будзе разгледжаны на чарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Аўтары артыкулаў, якія мы сёння друкуем, прапануюць дапоўніць праект заканадаўства некаторымі важнымі, на іх думку, папажэннямі.

ПЕРААДОЛЕЦЬ ВЕДАМАСНЫ СТАНДАРТ

На мой погляд, у «Асновах заканадаўства аб культуры Беларускай ССР» трэба прынцыпова вызначыць статус клубных устаноў, іх сацыяльную арыентацыю.

Так, культасвета нямала зрабіла ў 20—30-я гады, асабліва ў справе ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. Але ў наступныя дзесяцігоддзі ёй наканавана было выконваць ролю служкі «афіцыйнай» ідэалогіі, займацца культурным абслугоўваннем насельніцтва, што паставіла яе ў адзін шэраг са службай быту. Асветніцкая арыентацыя пакорліва сышла на другі план, саступіўшы месца выхаваўчай.

Да чаго ўсё гэта прывяло, нам вядома. І сёння яшчэ аб узроўні і становішчы культуры, скажам, у раёне мяркуюць толькі па культурна-асветніцкай дзейнасці, якая ў сваю чаргу ацэньваецца наяўнасцю клубаў, бібліятэк, музеяў. Вазьміце любы афіцыйны дакумент па культурным будаўніцтве ў рэспубліцы і вы ўбачыце прыярытэтныя задачы культасветы: «мець пэўную колькасць клубаў і дамоў культуры, бібліятэк, музеяў», альбо: «забяспечыць рэгулярную работу ў кожным Доме культуры і сельскім клубе пэўнай колькасці калектываў мастацкай самадзейнасці...»

Справядліва ўзнікае пытанне: а што дае чалавеку культурна-асветніцкая ўстанова? Так, клубы існуюць для людзей. Як быццам ісціна прапісная. Аднак на практыцы часцей за ўсё чалавек разглядаецца не як творца, а як пасіўны спажывец культуры.

Варта нагадаць тут разбухлую статсправаздачнасць, у якой дзейнасць клубаў ацэньваецца па 120 паказчыках. Больш за 60 пунктаў прадугледжана для паркаў, 650 — для бібліятэк. Атрымліваецца, што культасветустановы патрэбны не столькі насельніцтву, колькі самім гэтым установам — каб выканаць надуманыя планы і культурны «вал».

Відавочна, што толькі смелае і разумнае адмаўленне ў культурным будаўніцтве ад састарэлых догмаў і традыцый дасць магчымасць паспяхова рухацца па шляху духоўнага абнаўлення грамадства.

Жыццё яшчэ раз пераконвае, што чалавека, як аб'екта культурнага выхавання, трэба прыцягваць не ў культурна-асветніцкую, а ў культурна-адпачынкавую сферу. На маю думку, такі падыход не знайшоў належнага адлюстравання ў праекце «Асноў заканадаўства аб культуры Беларускай ССР». Патрэбна новая сацыяльная арыентацыя ўстаноў культуры. Асабліва гэта датычыць клуба, які павінен стаць цэнтрам рацыянальнай арганізацыі вольнага часу.

Дарэчы, ва ўсе часы ва ўсіх народаў клубам называлі і называюць грамадскую арганізацыю, якая аб'ядноўвае людзей па інтарэсах для сумеснай творчасці і адпачынку. Замест гэтага мы прыйшлі да клубаўстановы з залай і трыбунай для сходаў і нарад.

Трэба вярнуць сёлам, пасёлкам, райцэнтрам іх самабытную культуру. А гэта можна зрабіць толькі тады, калі мы здолеем на дзяржаўным узроўні скончыць з практыкай укаранення ў культурнае жыццё ведамаснага стандарту і адзінага нарматыву. Няўжо міністэрскія работнікі лепей ведаюць, хто патрэбны раёну — харэограф або рэжысёр, спецыяліст па народнай творчасці ці мастацкі кіраўнік? Не, па-ранейшаму клубныя ўстановы падганяюцца пад адзін і той жа штамп, у выніку чаго мы і маем аднатыпныя музеі, бібліятэкі-блізняты, маральна застарэлы набор клубных устаноў.

Іначай кажучы, у культурнае жыццё, і гэта павінна знайсці свой адбітак у «Асновах заканадаўства...», павінен увайсці прынцып гнуткага рэагавання на дынамічна зменлівую сацыялкультурную сітуацыю. Урэшце, прыспеў час упраўленцам адмовіцца і ад акамянелай сістэмы раздзялення клубных устаноў на катэгорыі. Славутая «катэгарыйнасць», ад якой залежаць штаты і зарплата культасветработнікаў, штурхае іх на прыпіскі, абязлічвае творчасць. Больш за 125 інструкцый і рэкамендацый 80-х гадоў толькі па пытаннях працы і зарплаты моцна звязалі рукі культработнікаў.

У кантэксце гэтых меркаванняў лічу неабходным вызначыць у законапраекце асноўныя прынцыпы дзейнасці клубных устаноў і, у прыватнасці, прынцыпы самаарганізацыі культурна-творчага працэсу і самакіравання.

З прыходам рыначнай эканомікі шмат пытанняў узнікае ў фінансава-эканамічнай сферы работы ўстаноў культуры. Змрочныя прагнозы робяцца адносна лёсу нашых клубаў, бібліятэк, музеяў, паркаў, бо іх уласныя даходы, на жаль, невялікія. Таму неабходна заканадаўча сцвердзіць «абавязацельствы» дзяржавы па выдаткаванні бюджэтных сродкаў на прэстыжныя, а не на прыбытковыя віды культурнай дзейнасці. У адваротным выпадку клубныя ўстановы чакае банкруцтва.

Не магу абысці ўвагай і праблемы аховы матэрыяльнай культуры. Як вырашыць іх? Думаецца, закон павінен прадугледжваць мінімальныя падаткі на сродкі, якія накіроўваюцца на адраджэнне культурнай спадчыны. Трэба развіваць спонсарства, г. зн. удзел прадпрыемстваў - прадпрымальнікаў у фінансаванні рэстаўрацыйных работ. Тут важна выпрацаваць механізм узаемаадносін дзяржавы з прыватным прадпрымальніцтвам.

У законе павінны быць прадугледжаны меры, якія б процідзейнічалі засіллю камерцыйнай «масавай» культуры, забяспечвалі б захаванне нацыянальных культурных традыцый. Лічу, з улікам вопыту еўрапейскіх краін, у гэтым дакуменце трэба ўказаць асобныя віды дзейнасці, якія падлягаюць забароне. Трэба падумаць і пра механізм абароны духоўнасці, накшталт таго, які існуе ў цывілізаваных краінах, дзе ў гэтым напрамку дзейнічаюць адпаведныя таварыствы і камітэты на грамадска-дзяржаўных пачатках.

Некалькі слоў пра пенсійныя гарантыі. Лічу, што ў законе трэба вызначыць асноўныя асаблівасці пенсійнага забеспячэння дзеячаў культуры. Нямалаважна вызначыць кола творчых работнікаў, якія валодаюць правам на льготнае пенсійнае забеспячэнне. Бо, на вялікі жаль. сёння ў рэспубліцы няма сацыяльнага статуса народнага ўмельца, майстра народных мастацкіх промыслаў, музыкантаў-педагогаў, якія даюць прыватныя ўрокі, заняты індывідуальнай працоўнай дзейнасцю.

І апошняе. Сумна, што ў праекце закона не знайшлося месца для адлюстравання такой праблемы, як адносіны ідэалогіі і культуры. У апошні час гэтаму пытанню прысвечана нямала публікацый культуролагаў. Улічваючы горкі вопыт мінулай культурнай палітыкі, заклапочанасць гэтая зразумелая, трэба тут паставіць кропкі над «і».

Так, Закон аб культуры ў БССР вельмі надзённы. Важна толькі, каб ён набыў практычнае ўвасабленне, стаў паўнацэнным, дзейсным інструментам і арыенцірам у рабоце па адраджэнні духоўнасці народа.

А. ГАРБАР.

Кніганіс

Р. БАРАДУЛІН. Кобра ў торбе. Вершы. Мінск, «Юнацтва», 1990.

Вершы, карацельні, пацешні Рыгора Барадуліна заўсёды даспадобы дзецям. Ёсць у іх і досціп, і трапныя параўнанні, і нечаканыя рыфмы. Новая кніжка паэта «Кобра ў торбе» ў гэтым сэнсе не выключэнне. У ёй Р. Барадулін паўстае тым добрым мудрацом, які разумее — дзеці ўсё могуць дараваць, але яны ніколі не прымуць няшчырасці.

ЦЁТКА. Вершы і апавяданні. Укладанне Г. Зінчанкі. Для старэйшага школьнага ўзросту. Мінск, «Юнацтва», 1990.

Творчасць Цёткі набывае актуальнасць сёння, калі ў жыцці нашага народа пачаўся чарговы этап нацыянальнага адраджэння. Вершы, апавяданні пісьменніцы — бунтарна-неспакойныя, поклічныя, у іх імкненне да лепшай будучыні. У выданні друкуецца як прадмова артыкул Сцяпана Александровіча «За народнае шчасце».

І. ЛАСКОЎ. На падводных крылах. Аповесці. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1990.

Пісьменнік, як вядома, ужо шмат гадоў жыве ў Якуціі, але па-ранейшаму не парывае сувязі з Беларуссю, не забывае роднай мовы. Пацвярджэнне таму і новая кніга прозы І. Ласкова. Першая аповесць «На падводных крылах» аўтарам пазначана, як «тэлевізійны шматсерыйны непрафесійны баявік». Ёсць у гэтым творы нечаканыя сюжэтныя павароты. Галоўнае, што прываблівае ў «баевіку», — вобраз галоўнага героя капітана Качкіна, які працуе на рачной «Ракеце». Ён з кагорты людзей, якія з'яўляюцца, так сказаць, носьбітамі народнага духу.

У аповесці «Туман» таксама вострыя сюжэтныя калізіі, але на гэты раз пісьменнік у куды больш «сур'ёзным» плане падыходзіць да вырашэння ўзаемаадносін паміж галоўнымі героямі.

З'ЯДНАНЫ З РОДНАЮ ЗЯМЛЁЮ

10 снежня спаўняецца 60 гадоў Міколу АРОЧКУ. Да віншаванняў калег і сяброў юбіляра далучаецца і «ЛіМ», жадаючы Міколу Мікалаевічу здароўя і новых творчых поспехаў.

КАЛІ я еду аўтобусам да мамы ў сваю Кракотку на Слонімшчыне, кожны раз праязджаю праз родную вёску Міколы Арочкі Вецявічы — ужо не забрукаваную, як калісь, а заасфальтаваную, усю зялёную, у садах, садочках і агародчыках (нядаўна трапілася ў Літоўскай метрыцы, што ў 1710 г. вёску — 12 валок зямлі — слонімская падчашая Ганна Язерская перадавала сыну свайму Дамініку). Бывае, бачу і Міколу: то з касою вяртаецца з поля ці поплава, то нешта ладзіць ля хлява, то завіхаецца ля дроў, то ў агародчыку, каля дрэў, то ідзе за статкам — нялёгкая, вымушаная жыццёвая неабходнасць вядомага паэта, літаратуразнаўца і крытыка, доктара філалагічных навук, які, ведаю, і сякеру ўмее трымаць у руках, і гэблік, і, вядома ж, пяро.

Чытаючы пасля не такія ўжо і рэдкія ў друку яго вершы і паэмы, артыкулы, рэцэнзіі, часта думаю: вось ужо пра каго можна з поўным правам сказаць — хто-хто, а ён моцна з'яднаны з роднай зямлёю, бо сам робіць на ёй. Але Арочка найперш — паэт, талент якога каранямі звязаны з родным краем, жывіцца сокамі роднай зямлі. Гэта святое пачуццё далучанасці да роднага кута, роднай зямлі расце і паглыбляецца ў яго творчасці ад першых радкоў (друкуецца з 1951 г.), першых яго паэтычных кніжак «Не ўсе лугі пакошаны...» (1958), «Ветраломная паласа» (1962).

Яшчэ са студэнцкіх гадоў само сабою запала ў памяць:

Іду, як заварожаны,
А спеў плыве з-за гаці:
«Ці ўсе лугі пакошаны,
Ці ўсе сенажаці!..»

Мне тады здавалася, што гэтая гаць — менавіта за алешнікам, паміж Вялікай Кракоткаю і Вецявічамі (у нас кажуць — Ецявічы, а жыхароў вёскі называюць ецяўцэ́ або ецяўскія), кудой тады ішла палявая сцяжынка. Цяпер і дарогі пракладзены іншыя, і я ведаю, што ў паэзіі свае законы, свае правілы і вобразы.

З тых першых крокаў у паэзіі М. Арочка задумваўся:

Родны край
...як сыну павер мне;
Не хачу між калоссяў
быць коласам тым,
Што часамі ўзрастае
без зерня.
(«Пакуль малады»).

Маладое рамантычна-ўзнёслае стаўленне да свету, жыцця чалавека, спакваля, але няўхільна, змяняецца паглыбленым роздумам над рэчаіснасцю, імкненнем кожны факт, з'яву, падзею, абдумаць, прааналізаваць, а не хапаць напавер. Гэта ўжо выразна відно ў зборніках «Матчына жыта» (1978), «Бяздонне» (1985), «Падземныя замкі» (1986), у філасофска-сімвалічнай паэме-прытчы «Курганне» (1980), драматычнай паэме «Крэва» (1982) і інш.

Лірычны герой паэта актыўна і адкрыта выказвае свае адносіны да гісторыі і цяперашчыны, выяўляе грамадзянскую пазіцыю, сталасць думкі. Гэта імпануе чытачу, выклікае ў яго суперажыванне, кліча да сумеснага абдумвання тых праблем і пытанняў, якія хвалююць аўтара, да нераўнадушнага абмеркавання якіх ён запрашае свайго сябра-чытача.

Варлен Бечык у прадмове да выбранага М. Арочкі «Колас на ржышчы» (1980) вельмі дакладна пісаў: «Набліжанасць да маральна-псіхалагічных асноў народнага быцця, да спраў і клопатаў людзей, якія вырошчваюць хлеб, фарміруе паэтаў погляд на сучасны свет, дае паэту трывалую меру сапраўдных жыццёвых каштоўнасцей. Гуманістычны пафас дабраты і шчырасці мацнее ў вершах паэта ад гэтага адчування народных, працоўных каранёў, што, дарэчы, вельмі сугучна лепшым творам сучаснай беларускай паэзіі».

У апошняе дзесяцігоддзе адчуванне кроўнай сувязі з радзімаю пачало ўсё часцей набываць у паэзіі Арочкі гістарычную суаднесенасць з мінулым, з дзеямі і славай нашых далёкіх і бліжэйшых прашчураў, не такіх і далёкіх папярэднікаў. І гэта, думаю, заканамерна. Гістарычнае бяспамяцтва абярнулася для нас вялікай трагедыяй бездухоўнасці, нацыянальнага нігілізму, знішчэннем той памяці, без якой народ забывае, хто ён, становіцца сучасным Герастратам.

У паэзіі Міколы Арочкі мне вельмі імпануюць тыя постаці, якія стаялі на ахове духоўнасці нашага народа, яго культуры, мовы, калі бацькаўшчына была ў небяспецы, калі варожыя сілы спрабавалі пазбавіць народ волі, гістарычнай памяці, роднай мовы. Гэта Ф. Скарына (паэма «Судны дзень Скарыны», 1988, верш «Слова да Скарыны», вобраз Скарыны ў паэме «Курганне»— раздзел «У дзядоў» і інш.), П. Багрым, Я. Купала, Я. Колас, Г. Леўчык, В. Таўлай, У. Караткевіч і інш.

З прагнай цікавасцю ўчытваўся я калісьці ў старонкі аповесці М. Арочкі «Хай расце маладая таполя» (1963). Пазнаваў краявіды вакол Арочкавай вёскі, паасобныя рэчыўныя дэталі, назвы, імёны герояў. Успомню і пра такое роднае: чытаючы Арочкавы творы, заўсёды ўзбуджана-радасна лаўлю сябе на думцы — вось гэтак і ў нас гавораць: пе́рвіна, ржышча, дымок гарка́вы, вазок пако́ўны, гузыры (у снапах), гу́паць, ухо́жка, спрат, поўны пад за́вязку, падая́нка, малача́й, радно́, дзераска́вы шарачок, глыбо́зны, рукі крэ́пнуць, напро́весну, гарэ́ніць (па-руску— горчит), як кот у пячо́рцы, ва́ра (г. зн. варыва), «бабы горшкі» (несці малога на плячах), драбя́сціна і многае іншае. За гэтыя залатыя зярняты роднага слова асабліва ўдзячны земляку. На іх нечаканы агонь памяць маланкава выносіць з глыбінь дарагія, родныя словы, часам ужо прыцьмелыя, засмужаныя часам.

Мікола Арочка — сталы, удумлівы крытык, адзін з самых аўтарытэтных сёння даследчыкаў нашай паэзіі, у прыватнасці, жанру паэмы, сатырычнай беларускай паэзіі, асноўных заканамернасцей беларускага паэтычнага слова ў нашы дні, крытык з шырокімі творчымі інтарэсамі, глыбокай эрудыцыяй, самабытным мысленнем. Добра помню, як быў прыемна ўражаны яго інтэрпрэтацыяй «Сну на кургане» Янкі Купалы — паэма, поўнай складанай умоўнасці і сімволікі: па-свойму арыгінальна, доказна, аргументавана раскрыў ён яе глыбінны сэнс.

Арочка-паэт. Арочка-даследчык усё часцей знаходзіць больш трапнае, дакладнае слова, па-майстэрску шліфуе радок. Заглыбляючыся ў балючыя праблемы сучаснасці, супярэчнасці, складаныя пытанні гісторыі роднага народа, ён будзіць душу чытача, катурхае яго памяць, абвастрае пачуцці, хвалюе сэрца, прымушае думаць. А гэта нямала.

Дай, Божа, каб гэтак як найдаўжэй і надалей!

Янка САЛАМЕВІЧ.

Уладзімір КАЗБЯРУК

МАЯКІ І МІРАЖЫ

Ля вытокаў беларускага нацыянальнага адраджэння

Рыхтуючы да друку артыкул У. Казберука, мы пагаджаліся далёка не з усімі яго высновамі. Тое, што паважаны аўтар называе «міфамі» і «міражамі», усё ж падзяляе вялікая колькасць нацыянальна свядомых людзей. Але мае права на існаванне і такі — скажам, нетрадыцыйны — ракурс бачання, і такі — насуперак агульнаму руху — накірунак думкі. Застаецца нагадаць, што ісціна нараджаецца ў спрэчках...

НАБЛІЖАЕЦЦА НЕМАЛЫ ЮБІЛЕЙ у гісторыі беларускага народа — 100-годдзе з дня абвяшчэння маніфеста нацыянальнага адраджэння. Іменна такую ролю адыграла прадмова да «Дудкі беларускай» Мацея Бурачка (Францішка Багушэвіча), апублікаваная ў 1891 годзе. Тут упершыню было выразна сказана, хто такія беларусы, чаго яны павінны дамагацца, каб заняць належнае месца ў сям'і і «пабратымцаў» нашых — братніх славянскіх народаў.

Францішак Багушэвіч прадвызначыў тыя кардынальныя праблемы, якія ў вельмі блізкай перспектыве павінна была вырашаць гісторыя — не сама па сабе, не стыхійна, а ў выніку самаахвярнай дзейнасці беларускіх патрыётаў. Гэта былі праблемы захавання мовы — як асновы існавання нацыі, — развіцця нацыянальнай культуры і літаратуры, сувязі і пераемнасці гістарычных эпох. Непазбежна — як гэта і павінна быць у такіх выпадках — узнікала справа геаграфічнага размяшчэння Беларусі. Францішак Багушэвіч першым паказаў яе на карце Еўропы, вызначыўшы ў агульных абрысах яе межы. «Можэ, хто спытае: гдзеж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым ня да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...»

Праз кароткі час важкае навуковае слова пра беларускі народ, яго мову, фальклор, літаратуру і этнаграфічныя межы сказаў акадэмік Яўхім Карскі ў сваім фундаментальным даследаванні «Беларусы» і іншых працах.

«Дудка беларуская» і «Смык беларускі» з іх прадмовамі адкрылі Беларусь перад тымі жыхарамі нашай зямлі, для якіх нацыянальнае ўсведамленне ўвасаблялася пакуль што яшчэ ў слове «тутэйшыя». Паверым Цётцы, якая так непасрэдна засведчыла, адкуль родам яе нацыянальная свядомасць: «Доўга я гадаў і думаў, як сябе зваць, ці то палякам, ці то літоўцам, бо слова тутэйшы мне нексць не смакавала. І так колькі гадоў я хістаўся то на ту, то на другую сторану, аж покі не папала ў мае рукі «Дудка» Мацея Бурачка; яна то мне сказала, што хто гаворыць па-тутэйшаму, памужыцку, значыцца, ён гаворыць па-беларуску, а хто гаворыць па-беларуску, той беларус. Прачытаўшы тую «Дудку», я сказаў: «Дзякуй табе, Мацей Бурачок! Чэсць і слава тваему словуі» Так пісала Алаіза Пашкевічанка, якая гэты раз узяла сабе псеўданім Гаўрыла з Полацка.

Маніфест Францішка Багушэвіча ўзнік не адразу, не на голым месцы. Яго нараджэнне рыхтавалася ўсім дзевятнаццатым стагоддзем. Праўда, сёння пакуль што яшчэ цяжка з упэўненасцю назваць вытокі гэтага працэсу, яго першапачатковыя імпульсы. Думаецца, што нейкую ролю маглі адыграць тыя дэмакратычныя па сваім характары пераўтварэнні, пачатак якім паклалі так званы Чатырохгадовы сейм (1788—1792) і Канстытуцыя 3 мая 1791 года. Лагічным вынікам іх з'явілася паўстанне 1794 года пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Патрыятычна настроенымі дзеячамі Польшчы прадпрымаліся адчайныя намаганні затрымаць скочванне Рэчы Паспалітай у прорву (што з'яўлялася непазбежным вынікам усёй палітыкі феадальных вярхоў) і ажыццявіць у краіне, у тым ліку і на беларускіх землях, прагрэсіўныя палітычныя і сацыяльна-грамадскія пераўтварэнні. Да Касцюшкі пацягнуліся і яго землякі — беларускія касінеры, ад якіх захавалася «Песня беларускіх жаўнераў». Праўда, уласна беларускай нацыянальнай свядомасці ў асяроддзі касінераў, трэба меркаваць, не было і ў зародкавым стане. І тым не менш адным з рэальных герояў паўстання станавіўся той мужык, што аберагаў сваю, беларускую мову, звычаі, традыцыі, свой лад жыцця, на аснове якіх у будучым пачала фарміравацца нацыянальная свядомасць.

Падзеі і ідэалогія паўстання самі па сабе раскоўвалі думку чалавека прымушалі яго

СВЯТЛО ГУМАНІЗМУ І ЛЮБОВІ

ТОЙ, хто яшчэ ў 70-я гады судакрануўся з паэзіяй Н. Мацяш, безумоўна, быў уражаны шырынёй духоўных абсягаў яе творчасці, уменнем паэткі схаваць асабіста перажытае ў мастацкі падтэкст твораў, хоць у паэтаў, як правіла, назіраецца адваротнае.

У Н. Мацяш ужо на самым пачатку творчасці сфарміравалася чыста нацыянальнае светавыяўленне, карані якога ідуць яшчэ з дакастрычніцкай лірыкі і найбольш яскрава відавочны ў купалаўска-багдановічаўскай традыцыі: лірызацыі духоўных перажыванняў паэта на фоне эпічнага, філасофскага спасціжэння ім свету. Адсюль і ў лірычнай гераіні Н. Мацяш з гадамі мацнее імкненне зліцца з болем сусвету — «з людзьмі пра шлях і долю гаварыць», а таму асабістае, хоць і надзвычай кранальнае, як бы саступае на другі план перад агульначалавечым. Глыбока ранімая, трапяткая душа яе лірычнай гераіні не дазваляе сабе самаачышчацца ў рэчышчы эмацыянальнага праяўлення — яна прагне злучыцца з людскімі трывогамі, «трымацца на любові». Ліра-філасофскае асэнсаванне свету моцна адбілася на развіцці вобразна-структурнай паэтыкі твораў, дзе першаснасць надаецца асацыяцыі, метафары, кантрасту, народнай фальклорнай традыцыі, прычым за глыбінёй філасофскіх сентэнцый не губляюцца адкрытая шчырасць, пяшчота паэткі:

Сонца залівае тратуары
У абдымках густалістых ліп.
Углядаюся ў людскія твары:
Чый жа боль сягоння мне
баліць?
(«Неспакой»).

Неспакой за чалавечае быццё, за спусташэнне сэрцаў у творчасці Н. Мацяш становіцца з гадамі больш драматычным — адэкватным самой рэчаіснасці. І ў новым паэтычным зборніку «Шчаслівай долю назаві...», дзе ўжо сама назва змяшчае ў сабе падтэкст, паглыбляюцца матывы суперажывання роду чалавечаму, драматызм духоўнага жыцця лірычнай гераіні. Новыя вершы, як пульсацыя крыві ў збалелым арганізме нашага грамадства, перадаюць усю складанасць барацьбы дабра і зла, кволасць чалавечнасці. Пагэтаму ў новым зборніку ўзмацніліся матывы тугі, безвыходнасці. Лірычная гераіня — жанчына безабаронная перад наступам няўмольнага лёсу, што выдатна перадае трагічна-ўражлівая паэма - калыханка «Пространь кахання». Больш напружаным становіцца голас паэткі, калі размова ідзе і аб страце сумлення, міласэрнасці, аб засіллі бяздушнага мяшчанства ў нашым грамадстве. У лірычна-філасофскую паэзію ўрываюцца ноткі чыстай публіцыстычнасці — увогуле нехарактэрная рыса яе творчасці (вершы «Набалелае», «Так званаму рэалісту», «Сузямельцы»): «Край і так даведзены да краю...».

Па-ранейшаму Н. Мацяш застаецца вернай абраным тэмам: Бацькаўшчыне, гуманізму, каханню. Але ў параўнанні з творамі аналагічнага зместу ранейшых гадоў цяпер больш імпульсіўным, напружаным становіцца паэтычны радок, мацнее лірычнае перажыванне. Н. Мацяш увайшла ў новае беларускае Адраджэнне не толькі вынакутаваным пачуццём горычы за занядбанасць роднай мовы, роднай старонкі, але і непасрэднай культурнаасветніцкай дзейнасцю, за што атрымала ярлык «нацыяналіста» з партыйнага рэквізіту 30-х гадоў, і як вынік — шальмаванне ў брэсцкай абласной газеце.

Тэма Бацькаўшчыны не звужае межаў агульначалавечай накіраванасці яе паэзіі. Беларусь асэнсоўваецца сярод сузямельцаў як адна з трагічных старонак духоўнай занядбанасці цэлага народа. Якім болем, якой безвыходнасцю прасякнуты верш «Лаўцам чорнага ката ў чорным пакоі»! Верш кранае да слёз:

Не давымотвайце мне сілы,
Не падпіхайце да мяжы,
Дзе шлях мой па зямельцы
мілай
Упрэцца ў сумныя крыжы —
І стане ў свеце крыжам
болей:
О як дажыць хацела б я
Да дня, калі змагу без болю
Аб Беларусі запяяць!..

У такім эстэтычным рэчышчы ўспрымаецца і верш «Памяці Жэні Янішчыц».

Сапраўдны паэт нярэдка становіцца ахвярай на крутых зігбах лёсу Бацькаўшчыны: успомнім Багдановіча, Купалу, Гартнага. Нездарма паглыбляецца гістарызм мастацкага светаўспрымання ў творчасці многіх сучасных паэтаў. І ў Н. Мацяш гэта не даніна модзе, а выхад да першакрыніц нацыянальнага духу. На старонках кнігі ажываюць велічнасць, духоўная моц і прыгажосць нашага народа, увасобленыя ў вобразы яе лепшых сыноў: Казіміра Лышчынскага, Апанаса Філіповіча, Паўлюка Багрыма, паўстанцаў 1863-64 гадоў і іншых. Паэтка стварае не галерэю паэтычных партрэтаў слаўных гістарычных постацяў, а неўміручасць, пераемнасць духу нацыянальнага вызвалення, таму так надзённа гучыць лейтматыў верша «Песня касінераў»:

Ёсць воля ў лютым прыгоне,
Мы маем з чаго выбіраць:
З'яднацца сцягамі Пагоні,
Ці тупа, як быдла, канаць.

Паэтка, ведаючы праз нялёгкі лёс старонкі, — «скуль ён, гэты саленаваты прысмак на губах» — не можа не верыць у адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці, чалавечнасці — а значыць, і ў Адраджэнне краю. Пра гэта сведчыць цудоўны верш, якім адкрываецца зборнік, — «Візітная картка». Узнёсла, захапляльна паказаўшы гістарычны шлях любай сэрцу Бярозаўшчыны, Н. Мацяш прыходзіць да высновы:

А некалі ж ды выспее пара,
Калі любое селішча людское,
Як наша вёска Горыч,
Збудзе горыч
І назавецца Светачам
нарэшце!

Шчыры, дзейсны гуманіст, Н. Мацяш у новым зборніку развівае тэму любові, спагады, міласэрнасці ў адносінах паміж людзьмі, што ўдала перадаюць вершы «Сябрам», «Не трэба пытацца», «Усё было: і сон, і парыванне», «Якіх адно вякоў-стагоддзяў не было ў нас...» і іншыя. Шчымліва-пачуццёвае яднанне паэткі з трывогамі свету робіць яе трапяткую душу па-сапраўднаму багатай, здольнай адгукваецца на самыя разнастайныя праявы жыцця, бачыць у малым, нязначным часцінку вялікага існага сусвету. І тады нават самы звычайны матыль (в. «Матылёк») становіцца пад пяром паэта сімвалічным выражэннем гармоніі чалавека і прыроды: «Як жа хораша замовай каляроваю ты няўтульнасць заварожваеш маю!» З задавальненнем бачыш, перачытваючы вершы, як паглыбляецца ў паэткі працэс самапазнання.

Прыгажосць душы Ніны Мацяш вельмі красамоўна выяўляецца ў лірыцы кахання, якая багата прадстаўлена ў яе папярэдніх кнігах і набыла ў новым зборніку свежае напаўненне, як бы другое дыханне. Як і ў ранейшых творах пра каханне, у новых вершах не знік драматызм — ён, наадварот, паглыбіўся, як само пачуццё, але выражэнне гэтага пачуцця набыло своеасаблівую высокасць. Застаецца хіба што зазначыць, што для паэткі каханне — гэта тая святасць, якая не толькі жывіць душу, а надае ёй трываласць, пашырае межы гуманізму і нават светапогляду. І недарэмна нават у любоўную лірыку Н. Мацяш уносіць патрыятычнае асвятленне:

Жыву на Беларусі.
Беларуска.
Кахаю беларуса.
(«Адпомста»).

У дадзеным выпадку для Н. Мацяш каханне да беларуса, якое за сваімі плячыма мае доўгія гады, — гэта перш за ўсё сведчанне паяднання яе душы, сэрца са светам, адэкватным ёй — светам Белай Русі. Таму і зварот да каханага: «сваю шчаслівай долю назаві» ўспрымаецца ў шырокім сэнсе.

Бацькаўшчына — тое святое, спазнаўшы, спасцігнуўшы, зберагаючы якое творца можа раскрыцца як сапраўдны паэт; гэта той, як бы мовіць, філасофскі камень, тая аснова, на чым трымаюцца ўсе эстэтычныя, філасофскія, маральныя пошукі паэта сябе ў часе, вечнасці.

Ніна АКСЕНЧЫК.

г. Мазыр.

Ніна Мацяш. Шчаслівай долю назаві... Мінск. «Мастацкая літаратура», 1990.

шмат чаго пераасэнсоўваць. Іменна на гэтай ідэалогіі выхоўваліся цэлыя пакаленні моладзі, у тым ліку філаматаў і філарэтаў, з асяроддзя якіх выйшаў адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ян Чачот, адзін з найбліжэйшых сяброў Адама Міцкевіча.

Уся мастацкая творчасць і грамадская дзейнасць Яна Чачота стала этапнай з'явай на шляху да нацыянальнага самапазнання і самаўсведамлення беларускага народа. Ён свядома і мэтанакіравана збіраў скарбы беларускага фальклору, дапаўняў іх уласнымі песнямі, блізкімі да іх па форме і духу. Сваімі публікацыямі ён адкрываў беларускаму мастацкаму народнаму слову шлях у гісторыю і бессмяротнасць, зберагаў духоўныя скарбы народа для будучых пакаленняў.

Зусім невыпадкова высокую ацэнку спадчыне Яна Чачота даў Максім Багдановіч. Ян Чачот — першы пісьменнік, які ў цэнтры ўвагі сваёй творчасці і даследчыцкай дзейнасці паставіў беларускага мужыка з яго мовай і духоўным светам.

На селяніна арыентаваўся і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, але звяртаўся да яго яшчэ як апякун з іншага сацыяльнага і нацыянальнага асяроддзя, што сам ён падкрэсліваў неаднаразова: «Жывучы сярод люду, які размаўляе па-беларуску, прасякнуты яго ладам думак, марачы аб долі гэтага братняга племені, анямеўшага ў маленстве ад невуцтва і цемнаты, вырашыў я для заахвочвання яго для асветы ў духу яго звычаяў, паданняў і разумовых здольнасцей пісаць на яго ўласнай гаворцы».

Як бы мы высока ні ацэньвалі сёння заслугі В. Дуніна-Марцінкевіча, яго ўклад у развіццё беларускай літаратуры, мы вымушаны адначасова канстатаваць, што пры ўсім сваім дэмакратызме ён быў вельмі і вельмі далёкі ад усведамлення неабвержнай нацыянальнай самабытнасці і адметнасці беларусаў дый рэальных патрэб беларускага прыгоннага селяніна. Выразна адчуў гэта Францішак Багушэвіч, які так і падкрэсліваў: «Здарывалася і мне чытаць і ксёнжачкі хоць не надта старыя друкаваныя навет, якогась пана Марцінкевіча, але ўсе як бы смеючыся з нашага брата пісаны». Пры гэтым аўтар «Дудкі беларускай» не мог ведаць заявы В. Дуніна-Марцінкевіча, адрасаванай Галоўнаму цэнзурнаму камітэту, дзе, у прыватнасці, сцвярджаецца: «...Всеавгустейший монарх наш, обратив особенно отцовское внимание на крестьян, желает как физического, так равно и морального улучшения их быта, а просвещение есть первою степенью к таковому. Я, действуя в духе правительства, впал на мысль для поощрения темного и с натуры ленивого нашего крестьянина к науке описывать его обычаи, обряды, традиционные предания и то в собственном его же диалекте...»

Можна нагадаць яшчэ і вядомае дакастрычніцкае выказванне Янкі Купалы: «Пры шчырай сваёй прыхільнасці да народа Марцінкевіч не мог стаць усёй душою на старане дэмасу (...) Для Марцінкевіча гэты мужык ёсць мужык: можна даць яму і асвету, можна яму пазволіць дайсці да сякога-такога дабрабыту, але няможна дапусціць яго да раўні з панамі. Нават у сваіх літарацкіх працах гэта дзяльба панскіх ад мужыцкіх душ перасягае скрозь чырвонай нітачкай, асабліва ў творах сцэнічных».

Тое, што было заўважана прарокамі беларускага нацыянальнага адраджэння, сёння практычна не згадваецца. Даследчыкі быццам баяцца заплямціць аўтарытэт аднаго з найбуйнейшых і найбольш заслужаных пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Аднак называючы гэтыя факты, мы ніколькі не прынізім гонару і заслуг аўтара «Гапона» і «Пінскай шляхты». Мы не забудзем, што В. Дунін-Марцінкевіч жывую мову беларускага народа ператвараў у мову мастацкай творчасці па ўласным пабуджэнні, адчуваючы ў гэтым маральную, духоўную і грамадскую патрэбу. Ствараючы мастацкую літаратуру на беларускай мове, ён гэтым самым ствараў і асновы для зараджэння і станаўлення беларускай нацыянальнай свядомасці.

НАШЫ ГІСТОРЫКІ, літаратуразнаўцы, пісьменнікі і публіцысты даўно ўжо абвясцілі чыста і выключна беларускім нацыянальным героем Кастуся Каліноўскага, рыцарам sans peur et sans zeproche («без страху і заганы») у першародным значэнні гэтага слова. Гэта ж ён звяртаўся да беларускага мужыка на яго роднай мове, гэта ж ён клікаў змагацца за мужыцкую праўду і сам без хістанняў аддаў за яе сваё маладое жыццё. Ён гаварыў са сваімі чытачамі як мужык з мужыкамі, як роўны з роўнымі па паходжанні, па сацыяльным становішчы («Мы мужыкі, браты вашыя, мы вам будзем гаварыць цэлую праўду, толькі слухайце нас!»; «Вы адно мене, такого самаго мужыка як і вы, паслухайце добрэ»).

Няшчаднае выкрыццё несправядлівасці ў той форме, у якой яна існавала пры тагачасным грамадскім ладзе, патрабаванне для мужыка рэальнай свабоды, рэальнага права працаваць на сябе, распараджацца сваім лёсам і набыткам працы сваіх рук, сцвярджэнне той ісціны, што ўрад павінен існаваць для чалавека, а не чалавек для ўрада— гэта толькі некаторыя з рэвалюцыйных ідэй і асноваположных прынцыпаў таго дзяржаўнага ладу, за які ён заклікаў змагацца беларускага селяніна, звяртаючыся да яго на роднай мове.

Усё гэта праўда. Аднак наша бяда ў тым, што на працягу многіх дзесяцігоддзяў гісторыя падавалася і настаўнікам, і школьнікам, і студэнтам, і проста любому чытачу з купюрамі. Калі нейкі дзеяч не падабаўся заканадаўцам у галіне ісціны (гістарычнай, палітычнай, філасофскай і іншай), то яго абвяшчалі нягоднікам па ўсіх параметрах, а яго творы — каб не выклікалі недаверу да афіцыйных версій і ўзаконеных выдумак — запраторвалі ў спецфонды, хавалі ў надзейныя сейфы. А ўжо калі хтосьці падаваўся героем — то на ўсе сто працэнтаў.

Мы, бясспрэчна, з захапленнем і гонарам за нязломнага змагара чытаем у «Мужыцкай праўдзе»: «Ад маскаля і паноў не ма чэго спадзеваці ся; бо ёны не вольносьці а глуму і здзерства нашэго хочуць. Но не доўго ёны нас будуць абдзіраці, бо мы пазналі гдзе сіла і праўда і будзем ведаць як рабіць трэба каб дастаць землю і свабоду». А хіба ж можна пярэчыць супраць разважанняў Каліноўскага аб свабодзе? Нагадаю іх: «Мы сегодня ўсе ўжэ ведаем, што чэлавек вольны гэто калі мае кусок сваей землі за катору ані чыншу і аброку не плаціць, ані паньшчыны не служыць,— калі плаціць малые падаткі і то не на царскіе стайні псярні і курвы, а на патрэбу цэлаго народу, (...) калі робіць усенко што спадабае і што не крыўдзіць блізьняга і хвалы боской...».

Хіба ж усё гэта няпраўда? Але чытаем мы, адкуль узялася паншчына і як жылося мужыку ў часы магнацка-шляхецкай Рэчы Паспалітай, — і нам становіцца не па сабе. Вось што паведамляецца ў другім нумары «Мужыцкай праўды»:

«Быў то калісьці народ наш вольны і багаты. [...] Но у суседзтве з намі жыў Немец і Маскаль. Аднаму і другому багацтво нашое калоло ў очы — каб іх так колька схапіла, да і хацелі нас загнаць з нашэй бацькоўшчыны. Трэба было бараніці ся, так Кароль кажэ

(Працяг на стар. 12).

Год Скарыны, пяць вякоў Скарыны, вечнасць Скарыны

На зыходзе 1990 год, аб'яўлены ЮНЕСКА годам Францішка Скарыны. Прайшоў ён сапраўды пад знакам гэтага найвыдатнейшага чалавека ў сусветнай культуры. Вядома ж, асноўныя мерапрыемствы прыпалі на Беларусь, дзе першадрукар нарадзіўся і рос, адкуль пайшоў у вялікі свет, каб здзівіць яго сваім працалюбствам, жыццядайнасцю свайго таленту. Паўсюдна адбыліся літаратурныя вечары, прайшлі кніжныя выстаўкі. Гасцей з розных куткоў Савецкага Саюза і з многіх замежных краін вітаў старадаўні Полацак. Дзесяткі кніг Скарынавых, пра Скарыну, пра яго паплечнікаў і прадаўжальнікаў — выйшлі ў выдавецтвах рэспублікі.

Завяршальныя юбілейныя мерапрыемствы прайшлі за межамі рэспублікі: у штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы, старадаўняй Вільні, у Калоннай зале Дома Саюзаў у Маскве...

Сёння пра іх наш расказ.

МАСКВА

Усмешлівае скарынаўскае сонейка, якое ўпрыгожыла эмблему юбілею вялікага асветніка і гуманіста, узнялося і над сцэнай славутай Калоннай залы Дома Саюзаў. У Маскве, дзе, мяркуючы па дакументах, Ф. Скарына таксама бываў і дзе яго справа знайшла дастойны працяг у выданнях Івана Фёдарава, 26 лістапада адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 500-годдзю слаўнага сына зямлі беларускай.

Вечар адкрыў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР У. Карпаў.

Людзі перастаюць лічыць галоўнымі дзеючымі асобамі гісторыі заваёўнікаў і правіцеляў, сказаў ён. Усеагульная жыццёвая патрэбнасць не разбурэння, а стварэння прымушае нас звяртацца да сапраўдных набыткаў чалавечай цывілізацыі, носьбітаў станоўчых каштоўнасцей. Іменна так усприймаем мы сёння вялікага сына беларускага народа, грамадзяніна Еўропы і свету Ф. Скарыну.

Слова пра Францішка Скарыну сказаў першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Беларускай ССР С. Шушкевіч.

Дзейнасць Скарыны ў розных краінах, падкрэсліў ён, даволі цікавае сведчанне ўзаемнай адкрытасці тагачасных еўрапейскіх дзяржаў, свабоднага абмену паміж імі духоўнымі каштоўнасцямі, што павучальна і для цяперашніх узаемаадносін паміж Захадам і Усходам, актуальна пры будаўніцтве «новага еўрапейскага дома». Яго патрыятызм, яго любоў да роднага Полацка былі страснымі і паслядоўнымі. Патрыятызм Скарыны не меў нічога агульнага з нацыянальнай абмежаванасцю. Вялікі палачанін зусім не адхіляў ідэю ўсходнеславянскага або, шырэй, славянскага і еўрапейскага адзінства. Будучы яркім прадстаўніком еўрапейскай рэнесанснай думкі, Скарына адным з першых сярод усходніх славян загаварыў аб роўнасці ўсіх народаў, самакаштоўнасці іх культур і духоўных традыцый.

З вялікай павагай і любоўю гаварыў пра Скарыну — асветніка-гуманіста, перакладчыка «Бібліі», першадрукара і першага ўсходнеславянскага паэта, аўтара ўсходнеславянскага календара доктар гістарычных навук, прафесар Я. Неміроўскі (Масква).

Прыняў удзел у юбілейным вечары, прысвечаным Скарыне, прафесар Інстытута славяназнаўства польскай Акадэміі навук, доктар гуманітарных навук Б. Бялакозовіч. У сваім выступленні ён адзначыў, што кнігі Францішка Скарыны і сама яго асоба занялі першараднае месца ў гісторыі беларускай, славянскай і еўрапейскай культуры.

Выконваючы абавязкі дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна А. Волік перадаў у дар беларускаму народу для мемарыяльнага музея Сімяона Полацкага, які ствараецца ў Полацку, старадрукаваныя кнігі, выдадзеныя ў Расіі, Беларусі і на Украіне (дванаццаць арыгіналаў, што маюць вялікую каштоўнасць).

На вечары выступілі таксама вядомыя беларускія пісьменнікі і даследчыкі бессмяротнай спадчыны Ф. Скарыны А. Мальдзіс і А. Лойка.

Урачыстасці завяршыліся канцэртам майстроў мастацтваў Беларусі, у якім прынялі ўдзел Акадэмічны народны хор БССР імя Г. Цітовіча, камерны хор БССР, ансамблі «Чараўніцы», «Харошкі», «Лялькі», «Свята», «Сябры».

На вечары прысутнічалі член Прэзідэнцкага савета СССР, міністр культуры СССР М. Губенка, член Палітбюро, сакратар ЦК КПСС А. Дзасохаў, член Палітбюро ЦК КПСС, галоўны рэдактар газеты «Праўда» І. Фралоў, дэлегацыя Беларускай ССР, замежныя госці.

ВІЛЬНЯ

Старажытная Вільня ушаноўвала ў семнаццаты дзень лістапада памяць Францішка Скарыны. Урачыстасці, наладжаныя на літоўскай зямлі ў гонар 500-гадавога юбілею слаўнага палачаніна, пачаліся літургіяй у Віленскім кафедральным саборы. Бадай, упершыню ў гэтым Храме служба вялася на матчынай мове беларусаў. Высокія словы біскупа Тадэвуша Кандрусевіча і ксяндза Уладзіслава Чарняўскага— святароў з Беларусі, запрошаных спраўляць літургію, былі звернуты да сумлення кожнага, хто прысутнічаў на ўрачыстай службе. Пад скляпеннямі сабора лунаў дух еднасці беларусаў, якія прыехалі ў Вільню з Мінска і Рыгі, Таліна і Віцебска, Гродна і Ленінграда, луналі бел-чырвона-белыя сцягі...

Калона гасцей, запрошаных на скарынаўскія святы, разам са сваімі землякамі-беларусамі з Вільні пасля літургіі рушыла да дома былога віленскага мецэната Якуба Бабіча. У гэтым двухпавярховым доме амаль пяць стагоддзяў назад Францішак Скарына, вярнуўшыся на радзіму, абсталяваў друкарню, адкуль, у прыватнасці, выйшла ягоная «Малая падарожная кніжка». У дзень урачыстасцей на гэтым доме замест старой мемарыяльнай дошкі ў гонар беларускага гуманіста, асветніка, першадрукара была прымацавана новая. На мармуры — барэльеф Скарыны і тэкст на літоўскай і беларускай мовах. У час адкрыцця памятнай дошкі слова бралі міністр культуры Літвы Дарыяс Куоліс, старшыня дэпартамента рэспублікі па справах нацыянальных меншасцей Галіна Кабецкайтэ, спадар Лявон Луцкевіч, першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета БССР Станіслаў Шушкевіч, доктар гістарычных навук Міхась Ткачоў, ксёндз Уладзіслаў Чарняўскі. Прадстаўнікі грамадскасці Літвы і Беларусі ўсклалі кветкі да мемарыяльнай дошкі, запалілі свечку...

Завяршылася свята ў Палацы мастакоў, дзе была наладжана выстаўка твораў беларускіх мастакоў і студэнтаў БДТМІ. У Белай зале гучала старажытная музыка ў выкананні ансамбля «Банкета музыкале» з Вільнюса, і зноў—словы пашаны ў адрас Скарыны і яго радзімы — Беларусі. На гэты раз прысутных віталі паэт і перакладчык беларускай літаратуры Э. Матузявічус, віцэ-прэм'ер Літвы Р. Озалас. З расказам аб жыцці Скарыны выступіў Адам Мальдзіс.

ПАРЫЖ

Цырымонія, прысвечаная 500-годдзю з дня нараджэння беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, пісьменніка і гуманіста эпохі Адраджэння Францішка Скарыны — так афіцыйна называліся скарынаўскія мерапрыемствы, якія прайшлі ў Францыі па лініі ЮНЕСКА. Ва ўрачыстасцях прыняла ўдзел афіцыйная дэлегацыя Беларускай ССР на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР, старшынёй рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны Н. Мазай. У склад дэлегацыі ўвайшлі народны дэпутат БССР, старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па культуры, народнай адукацыі і захаванні гістарычнай спадчыны Н. Гілевіч, міністр культуры БССР Я. Вайтовіч, старшыня Дзяржаўнага камітэта БССР па друку А. Бутэвіч, член-карэспандэнт АН БССР, прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, аўтар рамана-эсэ «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» А. Лойка...

Дэлегацыя была прынята Генеральным дырэктарам ЮНЕСКА Федэрыка Маёрам.

14 лістапада ў Штаб-кватэры ЮНЕСКА адбыўся ўрачысты юбілейны вечар. З прамовамі на ім выступілі М. Маёр і Н. Мазай. Яны гаварылі аб вялікай ролі Ф. Скарыны ў духоўным развіцці чалавецтва, яго ўкладзе ў развіццё кнігадрукавання і сусветнай культуры, аб тым, што на сучасным этапе ўзрастае значэнне кантактаў і сувязяў паміж народамі.

Н. Мазай перадала ў падарунак ЮНЕСКА ад Беларускай ССР карціну народнага мастака СССР М. Савіцкага «Я—Скарына», спецыяльна створаную для юбілею тытана эпохі Адраджэння.

Чароўнасць мелодый Беларусі перадаў прысутным фальклорны калектыў «Купалінка». Кірмаш рамёстваў таксама стаў для парыжан магчымасцю адчуць, чым жывуць сёння беларусы, які багаты іх духоўны свет. Народныя майстры Л. Главацкая, А. Грэсь, І. Лізура і іншыя тут жа, так сказаць, на вачах дзесяткаў людзей рабілі свае цуды з дрэва і саломкі.

Працавалі кніжныя экспазіцыі, выстаўкі графічных работ і фотаздымкаў, якія расказалі пра родны Скарынаў Полацк і гарады, дзе яму давялося працаваць, пазнаёмілі з яго жыццём і кнігадрукарскай, асветніцкай дзейнасцю.

Беларуская дэлегацыя сустрэлася ў горадзе Ліле з актывістамі мясцовага аддзялення таварыства «Францыя — СССР». Тут таксама адбыўся канцэрт ансамбля «Купалінка».

Члены дэлегацыі Н. Гілевіч і А. Лойка наведалі Інстытут славянскіх даследаванняў. Не адну гадзіну доўжылася сустрэча, пад час якой госці знаёмілі прысутных з культурным жыццём беларускага народа, працэсамі адраджэння ў рэспубліцы. Узнікла гаворка пра сувязі навукоўцаў і студэнтаў славістычнага факультэта Сарбоны з калегамі з Беларусі. У прыватнасці, пра гэта гаварыў прэзідэнт Інстытута нацыянальных моў і арыентальнай цывілізацыі Юго Жан дэ Дзіяну дэ ля Пэроцін. Ён зазначыў, што Сарбона падтрымлівае кантакты з універсітэтамі Літвы, Латвіі, Эстоніі, што трэба ёй парадніцца і з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Госці з прыемнасцю даведаліся, што студэнтка славістычнага факультэта Сарбоны Віржынія Шыманец працуе над даследаваннем «Беларускі тэатр XVII—XVIII стагоддзяў».

Выдатны гуманіст і асветнік, мысліцель і вучоны - энцыклапедыст, усходнеславянскі першадрукар, самабытны мастак-графік, таленавіты пісьменнік, паэт і перакладчык, высакародны грамадзянін і патрыёт—усё гэта цалкам справядлівыя характарыстыкі, якімі пашаноўваецца сярод людзей дасведчаных наш зямляк, беларус са слаўнага горада Полацка Францыск, або Францішак, Скарына.

500-я ўгодкі яго нараджэння, якія мы разам з многімі добрымі людзьмі адзначаем, выпалі на час вельмі незвычайны, на час, які у пэўных вымярэннях супадае або адчувальна перагукваецца з ягоным часам. Яго, скарынаўская, эпоха ў гісторыі чалавечай цывілізацыі называецца эпохай Адраджэння. Сёння гэтае слова зноў стала адным з самых назыўных — прынамсі, у дачыненні да многіх народаў свету, у тым ліку і да нас, беларусаў. Што ж гэта быў за час, які належаў яму, Скарыне, час, за межы якога ён ступіў у вечнасць, час, які на землях усходняга славянства ўвасобіўся ў ім, у яго справах і дзеях найбольш прыгожа, найбольш поўна і ярка?

Тры адметныя рысы характарызуюць тую непаўторную эпоху, што прыйшла на змену застойных, як бы мы сказалі сёння, сярэдніх вякоў, — эпоху Адраджэння. Першае — гэта свабоднае пачуццё чалавечнасці, узвышэнне і самасцвярджэнне асобы, яе права на зямныя радасці жыцця; другое — гэта вызваленне чалавечага розуму ад усялякіх догмаў, бунтоўны і неадольны дух вальнадумства; трэцяе — гэта арыентацыя і апора на антычнасць, на старажытныя аўтарытэты. Дабавім, што гэтыя памечаныя гуманізмам духоўныя працэсы суправаджаліся ростам этнічнай і нацыянальнай самасвядомасці, крышталізацыяй і станаўленнем нацыянальных культур, увагай да жывое мовы народа. На дарозе Адраджэння, а значыць — развіцця навукі, асветы, літаратуры і мастацтва стаяла косная сіла сярэднявечча, усталяваныя за тысячу гадоў традыцыі, мараль і светапогляд, і каб гэтыя перашкоды расхістаць і пераадолець — патрэбна была сіла волатаў, тытанаў духу. Эпоха, як мы ведаем, задаволіла гэту патрэбу. Нагадаем, што сучаснікамі Скарыны былі такія геніяльныя вучоныя, мастакі, пісьменнікі, як Капернік, Мікеланджэла, Леанарда да Вінчы, Рафаэль, Батычэлі, Дзюрэр, Рабле і іншыя, у сузор'і якіх дастойна свеціцца і воблік нацыянальнага генія Беларусі.

Нагадаем таксама, што малады палачанін, да таго як пайсці па навуку ў славутыя еўрапейскія універсітэты, атрымаў належную адукацыю дома, на Бацькаўшчыне, дзе яшчэ ад часоў Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага пашыралася і была ў вялікай пашане рукапісная кніга і наогул пісьменнасць. Што ён нарадзіўся і вырас не ў адсталым, апавітым цямнотай, духоўна паралізаваным краі. На яго радзіме ў той час ужо славіліся актыўным гаспадарчым, грамадска-палітычным і культурным жыццём такія буйныя гарады, як Полацак, Віцьбеск, Берасце, Гародня, Навагарадак, Менск, Слуцак, а таксама Орша, Магілёў, Тураў, Пінск і іншыя. Тон у жыцці ўсё больш пачыналі задаваць новыя сацыяльна-грамадскія сілы — шляхта і заможныя гараджане, купцы і рамеснікі. Час Скарыны — гэта час інтэнсіўнага фарміравання беларускай нацыянальнай мовы, росквіту рукапіснага мастацтва і ўзнікнення прыватных бібліятэк, час шырокага бытавання апакрыфічнай і перакладной літаратуры, найбольш актыўнага ства-

Ніл ГІЛЕВІЧ

Вялікі сын Беларусі

рэння беларускіх летапісаў — такіх, як знакамітая «Хроніка Быхаўца», час першага Статута Вялікага княства Літоўскага, як тады называлася наша магутная дзяржава. Час Скарыны — гэта час масавага паяўлення на Беларусі царкоўных і свецкіх хораў, капэл і аркестраў, час выдатных дасягненняў у мастацтве (іканаграфія, дрэварыт, манументальны жывапіс) і асабліва — у галіне нацыянальнага дойлідства (цэрквы-крэпасці ў Сынковічах, у Супраслі, у Заслаўі, у Малым Мажэйкаве, замак у Міры і многае іншае). Час Скарыны — гэта час, калі маладыя беларусы атрымлівалі вышэйшую адукацыю ва універсітэтах Кракава, Прагі, Падуі, Балоньі, Базеля, Ляйпцыга, Кёнігсберга, калі ў дзяржаве высока шанаваліся паўцці патрыятызму і грамадзянства, калі найвышэйшым заканадаўчым і кантрольным органам быў вольны сейм, які ўнаследаваў традыцыі даўніх вечавых сходаў, калі ў краі панавала канфесійная талерантнасць і яшчэ было далёка да адкрытых агрэсіўных выпадаў супроць іншаверцаў.

Галоўны патрыятычны подзвіг Францішка Скарыны ў тым, што ён першы даў свайму народу друкаваную кнігу і гэтым самым зрабіў невымерны ўклад у развіццё асветы, навукі і культуры на Бацькаўшчыне. Ужо само разуменне ролі кнігадрукавання ў развіцці чалавечай цывілізацыі гаворыць пра многае. Наўрад ці можна сумнявацца, што Скарына яшчэ ў Кракаве — адным з тагачасных цэнтраў кнігадрукавання — загарэўся ідэяй паставіць геніяльнае вынаходніцтва Гутэнберга на службу свайму народу, і гэта ідэя стала яго найпершым маральным абавязкам перад Бацькаўшчынай, яго галоўным і неадступным клопатам, яго палымянай і светазарнай мэтай, дзеля ажыццяўлення якой ён безразважна ахвяраваў спакойным і забяспечаным жыццём чалавека з двума вучонымі тытуламі доктара навук, не збаяўся беднасці і іншых неймаверных цяжкасцей і нягод, на якія асуджаў сябе, ступаючы на шлях асветніцкай і навуковай дзейнасці. Яго самадданасць і самаахвярнасць у гэтым сэнсе — рэдкі прыклад сыноўскага клопату пра свой народ і яго будучыню.

Але мы выказваем пачуццё нашай усенароднай удзячнасці гэтаму найвялікшаму з сыноў Беларусі і не толькі як першадрукару, але і як выдатнаму мысліцелю, вучонаму і пісьменніку, чый творчы плён раўназначны яго пачынальніцкаму подзвігу. Скарына ўзяў на сябе задачу даць суайчыннікам на Радзіме не проста кнігу, а найвялікшую кнігу чалавецтва — Біблію. Вядома, светапогляд Скарыны, як і кожнага з тытанаў Рэнесансу, не быў цалкам свецкі. Але не толькі яго шчырае шанаванне хрысціянскай веры забяспечыла гэты выбар, а і ўзровень яго адукацыі і культуры, пранікліваcць, маштабнасць і глыбіня яго розуму. У Бібліі Скарына бачыў перш за ўсё крыніцу самых разнастайных ведаў, неабходных народу, які хоча саяўлены яго смелы, наватарскі погляд на ўсё — на рэлігію, на асвету і навуку, на мову, на мастацтва, на бытавую і грамадскую мараль, на прававую сістэму і на многае іншае. Дасведчаны ў розных галінах навукі — у медыцыне і батаніцы, у мастацтвазнаўстве, у геаграфіі і астраноміі, у геаметрыі і арыфметыцы, у гісторыі і філасофіі, у правазнаўстве і логіцы, у граматыцы і асновах красамоўства — Скарына бачыць іх пачаткі ў паасобных кнігах Бібліі, якія адпаведна і рэкамендуе чытачам. Але галоўны яго клопат, пра што ён гаворыць зноў і зноў, амаль не ў кожнай прадмове,—гэта праўда і справядлівасць, дабрыня і міласэрнасць, гэта клопат пра тое, каб людзі «научившися мудрости добре жили на свете». Ужо ў прадмове да першай надрукаванай ім у Празе ў 1517 годзе кнігі «Псалтыр» Скарына піша: «Там ест справедливость, там есть чистота, душевная и телесная. Там ест наука всякое правды. Там мудрость и разум досконалый. Там ест милость и друголюбство без льсти, и вси иншии добрые нравы якобы со источника оттоле походять.

И видечи таковые пожитки в так малой книзе, я, Франтишек, Скоринин сын с Полоцька, в лекарских науках доктор, повелел есми Псалтырю тиснути рускыми словами и словенским языком напред ко чти и к похвале богу (...), а потом к пожитку посполитого доброго, наболей с тое причины, иже мя милостивый бог с того языка на свет пустил».

Зноў і зноў Скарына паўтарае, што пакладзеная ім боганатхнёная праца прызначана «людем посполитым к пожитку», «к доброму научению», дзеля «размножения добрых обычаев», дзеля мацавання згоды паміж людзьмі і ў краіне, паколькі «незгода и наибольшие царства разрушаеть». Міласэрнасць і праўда не пакінуць людзей, калі яны спасцігнуць навуку і мудрасць, што схавана ў біблейскіх легендах і прытчах, «якобы моц в драгом камени, и яко злато в земли, и ядро у вореху», калі ім перадасца і ўсталюецца ў іх душах «дух разумности», для якога аўтар знаходзіць цэлую нізку дакладных і яркіх эпітэтаў: «В ней воистинну ест дух разумности святый, единый, различный, смысленый, скромный, вымовный, движющийся, непоскверненый, истинный, сладкий, чистый, сталый, добротливый и всякую иную имеющий в собе добрую цноту».

Дух разумнасці!.. Як ён усім нам сёння патрэбен! І нам у Беларусі, і ўсёй нашай краіне, і ўсёй нашай заселенай людзьмі планеце! Як па-сучаснаму, як актуальна гучаць галоўныя, вызначальныя пастулаты маральнага вучэння Скарыны, яго філасофіі, яго патрабаванні духоўнай свабоды для чалавека, яго ўстаноўка на высокую этычную культуру, на сумяшчэнне грамадскіх і асабістых інтарэсаў людзей — каб усім добра было!

Дарэчы, вельмі сімвалічна, што і да гэтага часу не высветлена, якога ж веравызнання быў Скарына — праваслаўнага? — каталіцкага? — пратэстанцкага? Ці пераходзіў з аднае веры ў другую? У гэтым таксама хочацца бачыць яго своеасаблівы мудры запавет нам, нашчадкам: Людзі, хай веравызнанне вас не раздзяляе, не самае важнае — да якой канфесіі належаць, галоўнае — служыць дабру і міласэрнасці, праўдзе і справядлівасці, міру і згодзе, і — быць патрыётамі той зямлі, на якой вы нарадзіліся і вырасліі!.. «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя: рыбы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають».

І так, до того месца, дзе ты нарадзіўся, і, як мы помнім, да тае мовы, з якое міласцівы Бог цябе ў свет пусціў... Скарына ведаў добры дзесятак моў, у тым ліку лацінскую, старажытнагрэчаскую і старажытнаяўрэйскую, цаніў і шанаваў мовы іншых народаў, але найперш яго любоўю была мова роднага краю, да якое ён і стараўся наблізіць мову сваіх перакладаў. Калі такую складаную і зместам, і жанрава, і стылёва кнігу, як Біблія, ён узяўся агучыць жывою мовай сваіх бацькоў — дык якую ж высокую думку пра гэту мову было трэба мець, якія цудоўныя яе магчымасці і ўласцівасці бачыць!

У мове Скарыны, кажучы словамі Марселя Пруста, — «формы старажытнай душы» нашага народа. Па старонках ягоных выданняў «праходзіш» — як па старажытных вуліцах і вулачках Полацка, Гародні, Вільні (хацеў бы, ды не магу сказаць — Менску...). Калі б да нас не дайшла мова кніг Скарыны і яго паслядоўнікаў — мы не адчулі б душой і сэрцам, якія глыбокія нашы духоўныя карані, як далёка мы пачаліся і — насуперак усім трагічным ударам лёсу — засталіся вернымі сабе.

Такія постаці беларускага Адраджэння, як Францішак Скарына, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Леў Сапега, Андрэй Волан і іншыя, увесь стан тагачаснай беларускай культуры, літаратуры, дойлідства, пераканаўча засведчылі, што мы, беларусы, на магістральны шлях гістарычнага прагрэсу выйсці не спазніліся, што ад тагачаснай Еўропы мы не адставалі, а ў сім-тым нават ішлі паперадзе, — напрыклад, у верацярпімасці, у дасканаласці і гуманнасці дзяржаўнага заканадаўства. Трагічным паваротам у лёсе беларускай культуры быў паступовы адыход ад гуманістычных прынцыпаў Адраджэння. Трагедыя пачалася тады, калі знакамітыя магнацкія роды, прадстаўнікі буйное шляхты, багатага купецтва і нават царквы сталі на шлях здрады нацыянальным інтарэсам, калі ўслед за імі навукоўцы, асветнікі, кніжнікі адступіліся ад наказаў Скарыны і пачалі друкаваць кнігі на польскай мове, што катастрафічна падарвала і ўрэшце амаль зусім перапыніла скарынаўскую традыцыю кірылічнага друкавання на беларускай. Колькі было ў 17—18 стст. на нашай зямлі друкарань, у тым ліку вельмі вядомых, якія не выдалі ніводнай кнігі па-беларуску!..

Гаворачы пра гэту трагічную акалічнасць у гісторыі нашага нацыянальнага станаўлення, мусім, аднак, падкрэсліць, што калі б не творчы подзвіг Скарыны, калі б не магутны размах і маштаб яго кнігавыдавецкай і асветніцкай дзейнасці, — трагедыя магла б быць непараўнана больш страшнай, яна магла б аказацца для нас непапраўнай. Калі б не той духоўны, нацыянальна-культурны грунт, які так умацавалі Скарына і яго паслядоўнікі, супраціўленне апантанаму напору чужаземнай культуры і мовы на Беларусі было б значна слабейшае, асіміляцыя нашых няшчасных прашчураў ішла б тэмпамі намнога большымі, — і хто ведае, які нагул быў бы лёс нашага народа, ці дыхалі б мы сёння найздаравейшым, найчысцейшым і найсаладзейшым паветрам роднае мовы? Ці абудзілася б калі-небудзь у забітых душах ідэя нацыянальнага адраджэння, і ці пачаўся б калі-небудзь беларускі нацыянальна-вызваленчы рух?..

Агульнавядома, якая велізарная роля Скарыны ў развіцці беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Несумненна, што яго друкарска-выдавецкую школу прайшлі і Сымон Будны, і Васіль Цяпінскі, і заснавальнік кнігадрукавання ў Расіі і на Украіне Іван Фёдараў, і яго паплечнік і сябар Пётра Мсціславец, і многія-многія іншыя. Праўда, не заўсёды і не ўсім братам нашым хапала мужнасці пра гэта сказаць, а ў нас саміх — не заўсёды хапала пачуцця годнасці пастаяць за свае нацыянальныя аўтарытэты. Горка, але гэта так. А між тым цану нашаму геніяльнаму земляку ўжо пры яго жыцці добра ведалі некаторыя адукаваныя замежнікі. Так, брандэнбургскі герцаг Альбрэхт у рэкамендацыйнай грамаце, выдадзенай Скарыну ў 1530 годзе, характарызаваў яго як «выдатнага мужа непараўнанага розуму і мастацкага дару, светлага лекарскага таленту і слаўнага вопыту».

Вывучэнне творчай спадчыны Скарыны пачалося звыш двухсот гадоў назад — сіламі навукоўцаў розных, перш за ўсё славянскіх, краін. Шмат з таго часу было зроблена для стварэння навуковай Скарыніяны. Але шмат было на гэтым шляху і цяжкіх, нават небяспечных перашкод. Асабліва — у нас, у Беларусі, у гады пагромаў гэтак званага «беларускага буржуазнага нацыяналізму», духоўнай апорай якога пагромшчыкі лічылі, сярод іншага, і плён працы Скарыны. Так, вядомы партыйны дзеяч Вільгельм Кнорын, той самы, які ў 1918 годзе публічна, у афіцыйным друку адмаўляў існаванне асобнай беларускай нацыі і асобнай беларускай мовы, у 1928 годзе пісаў: «Права беларускіх працоўных на беларускую мову выцякае зусім не з таго, ці жыў і працаваў на беларускай мове сярэдневяковы манах Скарына, але ад рэвалюцыйнага раўнапраўя ўсіх народаў». У наступныя гады абразлівыя мянушкі «сярэдневяковы манах», «беларускі езуіт» і іншыя, раз-пораз вылятаючы з-пад пяра партыйных, вучоных і літаратурных аўтарытэтаў, фактычна спынілі развіццё беларускай Скарыніяны. Для чаго гэта рабілася? А для таго, каб адабраць у народа гонар, каб яму не было чым ганарыцца. Так лепш — для тых, хто хацеў бы выхоўваць людзей у рабскай пакорлівасці. Згадваецца гэта не для таго, каб лішні раз развярэдзіць балючыя раны, а для таго, каб засцерагчы: той, кнорынскі, узровень разумення гісторыі цывілізацыі і культуры да канца яшчэ не пераадолены, той прымітыўны, зручны для абываталяў і жандараў, погляд на гісторыю беларускага народа, яго мову і культуру трымаецца сям-там яшчэ даволі моцна.

На працягу першых пасляваенных дзесяцігоддзяў імя Скарыны, агулам кажучы, вымаўлялася ў нас з пашанай. Больш таго: часта і гучна заяўлялася аб тым, што наша грамадства — дастойны спадкаемца і прадаўжальнік яго задум і здзяйсненняў.

Усе гэтыя акалічнасці і спрычыніліся таму, што адкрыццё Скарыны для вялікага свету бязбожна зацягнулася, што па-за межамі Бацькаўшчыны ён і дагэтуль належным чынам не вядомы.

Падобна, аднак, на тое, што наступіла пара рашучых перамен. У апошнія гады ўклад у навуковую і літаратурна-мастацкую Скарыніяну адбываўся з вельмі прыкметным і адчувальным нарастаннем. Бачыць і ўсведамляць гэта ўцешна, бо гэта — канкрэтныя, рэальныя дзеі, сведчанне таго, што мы нарэшце пачынаем разумець павучанне апостала Паўла, якое Скарына зрабіў сваім крэда: «Слова без справы мёртвае». Сёння мы на ўвесь голас гаворым пра новы этап нашага нацыянальнага адраджэння — адраджэння беларускай мовы, культуры, гісторыі школы і інш. Усё гэта мы можам здзейсніць толькі тады, калі ў цэнтр нашай увагі і клопатаў мы паставім тое, што нам першы даў Скарына — кнігу. Беларускую кнігу. Калі мы зробім сапраўды нацыянальным кнігадрукаванне на Беларусі. Гэтаксама—калі мы зробім сапраўды беларускай нашу школу. Гэтаксама — наш тэатр і культасвету.

У нетрах нашага грамадства выспяваюць новыя настроі, якія прадвяшчаюць рашучы паварот у гістарычным лёсе беларускага народа. У ліпені Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. 1-га верасня ўступіў у дзеянне Закон аб мовах, згодна якому беларускай мове нададзены статус дзяржаўнай. Нядаўна Савет Міністраў БССР прыняў рашэнне аб стварэнні ў Мінску Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны, які, хочацца верыць, стане буйным асяродкам навуковай, асветніцкай і культурнай работы. Думаецца, што зусім не за гарамі час, калі ў нашым стольным горадзе, на рагу вуліцы Акадэмічнай і праспекта Скарыны — цэнтральнага праспекта сталіцы, будзе стаяць прыгожы і велічны помнік яму — можа быць, самы прыгожы з усіх пастаўленых калі-небудзь на беларускай зямлі.

Багаслаўлёнае імя Скарыны сёння з тымі, хто клапоціцца пра адраджэнне душы чалавечай, хто дбае пра вялікую будучыню народа.

Тая вера, што калісьці вяла яго пакутніцкім шляхам да высакароднай мэты і асвятляла яму гэту дарогу — з намі!

Тая любоў да роднага краю, што натхняла яго, і акрыляла, і падымала над крыўдамі і нягодамі — з намі!

Тая прага тварыць дабро «людзям паспалітым», якая жывіла яго сілы, прыдавала яму мужнасці, стойкасці і цярпення, — з намі!

Будзем жа дастойнымі ў сваіх словах і справах яго памяці, яго спадчыны, яго запаветаў!

На музычнай сцэне

МО НЕ ЗАГІНЕМ?

Быў панядзелак, выхадны дзень у тэатры. Але людзі дасведчаныя ўпэўнена штурмавалі Траецкую гару, уваходзілі ў асветлены вестыбюль. К сямі гадзінам у фае на другім паверсе ўжо не хапала крэслаў, банкетак ды канап, і частка публікі вымушана была размясціцца на галерэі трэцяга яруса. Клуб сяброў оперы распачынаў новы сезон...

ЛЯГЧЭЙ ЗА ЎСЕ дадаць зараз абзац з прозвішчамі выканаўцаў, паставіць пад ім уласнае, побач — кропку... Але не будзем спяшацца з кропкай. Хіба часта пачатак сезона Клуба сяброў оперы робіцца падзеяй у мастацкім жыцці горада, прываблівае не толькі захопленых меламанаў-дылетантаў, а і людзей дасведчаных? Прынамсі, пачатак сёлетні прывёў у залу і кампазітараў — а, як вядома, для іх з'яўлення на «чужым» канцэрце мае быць досыць сур'ёзная прычына.

І прычына такая была. Адкрываць сезон клуба прыехаў вядомы спявак з Масквы Сяргей Якавенка. Мінчане пазнаёміліся з ім пад час леташніх «Пракоф'еўскіх чытанняў» (гл. «ЛіМ» за 5.01.90 г., «Прыслухайцеся і палюбіце» Т. Песнякевіч). Сярод слухачоў аказаліся аднадумцы, якім захацелася падтрымліваць знаёмства з гэтым удумлівым, дасціпным і абаяльным музыкантам. Вось чаму Алена Саламаха, ініцыятар многіх цікавых спраў клуба, сапраўдная энтузіястка і знаўца музычнага мастацтва, наладзіла новую сустрэчу са спеваком, дапамагла яму знайсці ў Мінску творчых партнёраў для падрыхтоўкі дзвюх арыгінальных канцэртных праграм.

Абедзве праграмы неслі ў сабе той эстэтычна-асветніцкі, пазнаваўчы зарад, што і прыцягнуў увагу дапытлівых.

На вечары ў тэатры яны пачулі монаоперу Р. Фрыда «Пісьмы Ван Гога», тэкст якой складзены з сапраўдных лістоў мастака да брата Тэо. Разам з С. Якавенкам яе выконвалі выдатныя беларускія інструменталісты, якія не так даўно аб'ядналіся ў ансамбль «Класік-Авангард» (гл. «ЛіМ» за 2.03.90 г., аднайменная публікацыя В. Карпенкі). Дырыжыраваў госць з Масквы Юрый Нікалаеўскі. А перш чым загучаў выразны барытон саліста, на ўспрыманне свайго твора настроіў 75-гадовы аўтар музыкі і лібрэта Р. Фрыд, расказаўшы гісторыю і мэту стварэння «Пісьмаў Ван Гога». Талент і псіхіка, геній і вар'яцтва, — вось што займала ўяўленне кампазітара, калі ён разважаў над трагічным лёсам мастака.

Два дзесяткі абразкоў склалі оперу — як дваццаць эпізодаў жыцця, дваццаць станаў душы, дваццаць карцін, выкананых, умоўна кажучы, у гаме фарбаў паміж чорнай і белай. Зразумела, што эпісталярная проза, злучаная з атанальнай музыкай, амаль не выклікала каляровых, жывапісных асацыяцый. «Разумовая музыка» асацыіруецца звычайна з рацыяналістычнай графічнасцю шахматных камбінацый, і тыя, хто цэніць твор мастацтва перш за ўсё як крыніцу эмоцый, а не інфармацыю для інтэлекту, аддае ў такіх выпадках належнае складанасці аўтарскай задумы, але сам твор успрымае «галавой».

Ды не было, здаецца, чалавека, не ўдзячнага клубу за свежыя, змястоўныя ўражанні: цудоўны спявак, малайцы-музыканты; рознабакова эрудзіраваны аўтар (да ўсяго, Р. Фрыд — сур'ёзны аматар малявання); ды і копіі знакамітых вангогаўскіх палотнаў, выстаўленыя на падрамніках...

Дзякуй клубу і за тое, што сваё пасяджэнне сумясціў ён з высакароднай акцыяй: плакат побач з глядацкімі радамі заклікаў да ахвяраванняў у фонд «Дзецям Чарнобыля» — сродкі збіраліся для аплаты праезду пацярпеўшых дзяцей за мяжу і на пакупку 300 тон чыстага сыру. Людзі падыходзілі да урны, апускалі грошы...

ДРУГАЯ сустрэча з С. Якавенкам адбывалася праз дзень у Рэспубліканскім доме работнікаў мастацтваў. Клуб анансаваў яе як аўтарскі вечар яшчэ аднаго госця — старшыні расійскага кампазітарскага саюза Г. Дзмітрыева. (А фактычна адбыўся бенефіс спевака-асветніка, папулярызатара малавядомай сучаснай музыкі). Аўтар прадставіў свае творы і — мінскіх артыстаў, якія ўжо на рэпетыцыі ўразілі яго выканаўчай культурай. Выканаўцамі сапраўды нельга было не захапіцца.

Вось на маленькую сцэну, шчыльна застаўленую ўдарнымі інструментамі, выйшаў музыкант аркестра ДАВТа БССР Уладзімір Судноўскі. І перш чым сыграць дзівосную Санату Г. Дзмітрыева («Перкусіяната»), пазнаёміў аўдыторыю з гучаннем кожнага інструмента: вібрафона, званоў, гонга, талерак, званочкаў... Мы прызвычаіліся ўспрымаць іх як фарбы на сімфанічным палатне, а тут з іх металічна-халаднаватых тэмбраў утварылася самастойная жывая «санатная тканіна».

А як пранікнёна і драматычна загучала экзатычнае сямейства ўдарных у вынаходлівым творы Г. Дзмітрыева на вершаваны трыпціх М. Цвятаевай — кантаце «Сценька Разін» (для барытона, мецца-сапрана, ансамбля ўдарных інструментаў і

АДНЫМ СЛОВАМ—ТАЛЕНТЫ

Вучань 2-га класа Музычнага ліцэя пры БДК Коля ГІМАЛЕТДЗІНАЎ.

Камерны аркестр Музычнага ліцэя

Уручаюцца пасведчанні стыпендыятаў Цэнтра. (Штомесячная стыпендыя — 100 рублёў).

Усе яны выступалі ў той вечар на сцэне Беларускай філармоніі — дзеці з Ташкента, Масквы, Кліна, Мінска. Іх сабрала разам «афіцыйная» нагода: прэзентацыя стыпендыятаў Усесаюзнага грамадскага дабрачыннага Цэнтра мастацтваў «Юныя таленты». Цэнтр гэты, якім кіруе вядомая спявачка Бэла Рудэнка, апякуе зусім юных таленавітых музыкантаў, наладжвае іх канцэрты па гарадах Саюза, садзейнічае гастролям за мяжой, спрыяе творчаму і прафесійнаму росту, дапамагае з набыццём высакаякасных інструментаў.

Сярод стыпендыятаў Цэнтра сёння — двое віланчэлістаў-мінчукоў, выхаванцаў Музычнага ліцэя пры БДК, вучняў педагога Уладзіміра Перліна. Пра аднаго з іх, васьмікласніка Мікаэла Самсонава, які стаў лаўрэатам міжнароднага конкурсу, «ЛіМ» ужо неаднойчы пісаў. А імя другога таленавітага хлопчыка зараз паведамім: Коля Гімалетдзінаў. Яму толькі восем гадоў.

На другі дзень пасля канцэрта беларускія дзеці прымалі новых сяброў у сваім «музычным доме» — ліцэі. Навучэнцы ліцэя разам з гасцямі наладзілі канцэрт. Пад час сустрэчы дзеці-стыпендыяты расказвалі пра сябе, адказвалі на пытанні равеснікаў.

НАШ КАР.
Фота Ул. КРУКА.

Працяг размовы

А ХТО «ПАЦЯГНЕ ВОЗ»?

Пошта аддзела музыкі сведчыць, што праблемы мастацкага выхавання і асветніцтва, адраджэння духоўнай культуры ў грамадстве выходзяць у шэраг праблем першачарговых. Нагадаем публікацыю І. Пракапенкі «Збеднена ўсё наша грамадства...» («ЛіМ» за 27.04.90 г.), на якую адгукнуўся старшы выкладчык БДК А. Селачнік («Што ж здарылася з музычнай культурай!», 3.08.90 г.). Працягам размовы былі нататкі гродзенскага музыканта У. Лябецкага «Чаго мы вартыя —без культуры!» (17.08.90 г.) і каментатара Беларускага радыё І. Мільто «Ці ёсць выйсце з лабірынта!» (23.11.90 г.). Сёння — артыкул журналісткі Э. Пасынкавай.

«ШТО Ж здарылася з музычнай культурай?» — пачуўся мне ўскрык душы ў «ЛіМе» за 3.08.90 г. старшага выкладчыка БДК Аляксандра Селачніка. Даўно сачу за такімі артыкуламі. Вельмі хвалюе ўсё, што датычыць музыкі. Падчас так шкада, што не атрымала раней музычнага выхавання. Іншы літаратурны твор так запаліць — аж горача стане —выказацца мелодыяй, як паэту:

Хочацца навеяць
Казку таямніцы
Гукамі мелодый...

Такія штуршкі сэрца я адчула яшчэ чытаючы аповесць Вольгі Іпатавай «Вузялок Святагора». Даўнавата было, а памятаецца, як слёзы каціліся па шчоках. Так і чулася мелодыя між радкоў.

Вяртаюся да «ЛіМа» за 19.06.87 г. — С. Берасцень быццам адказала на тыя думкі: «...рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі М. Казінец прапанаваў асновы музычнай адукацыі даваць у сярэдніх школах, дзе вывучэнне нот было б асновай пісьменнасці— як вывучэнне літар і лічбаў, а выхаванне музыкай трэба пачынаць з самых маленькіх...»

Што ж атрымліваецца?

Праз гады мы, як кажуць, на тым жа месцы, аніякага зруху. Літаратуру больш ці менш вывучаем, асабліва класіку. Можам весці спрэчкі — да прыкладу, пра Наташу Растову, уяўляем нават яе смех, гаворку, як танцавала. Але што і як яна спявала?.. Відаць, і сам класік не змог данесці да нас песні сваёй любімай гераіні. Ці не традыцыя здаўна — тое, што ад музыкі мы аддзелены морам літаратурнай рыторыкі? Не разумеем сімфанічных твораў Бетховена, Глінкі, Чайкоўскага, Шастаковіча. А яны ж як мастакі ў музыцы не слабейшыя за Льва Талстога ў літаратуры. Аднак жа зрабіліся даступнымі толькі музычна адукаваным людзям... Большасці з нас прыемна іх слухаць — дый толькі, а хіба мы разумеем? А музыка — гэта ж таксама мова!

Ад музыкі нас нібы знарок адмяжоўваюць яшчэ змалку, толькі вучаць спяваць у школьным хоры, лёгкія песні ў класе на ўроку спеваў. Гэтак маглі б і вершы на памяць завучваць, не ўмеючы іх чытаць. Дык жа вымуштроўваем кожную літарынку, лічбінку — каб правільна выводзіць на паперы, за памылкі ў сачыненні знижаюць адзнаку... І я нешта не разумею: ці маем мы права пераскоквацъ з класа ў клас ды яшчэ атрымліваць залаты медаль, не авалодаўшы асновамі музычных ведаў?..

Зноў звяртаюся да «ЛіМа» (ужо за 23.01.87 г.).У ім цікавы артыкул Васіля Віткі «Асцярожна: дзеці». Не магу ўтрымацца, каб не прывесці ўрывачак: «Медыкі і педагогі спрачаюцца, высвятляюць—з якога ўзросту: з шасці ці пяці трэба пасылаць дзяцей у школу, а амерыканка Глорыя Кліфард пачала навучаць свайго сына грамаце, калі яму ледзь споўнілася чатыры... месяцы! Яна прымацоўвала на розныя рэчы ліст паперы, дзе буйнымі літарамі былі напісаны словы, якімі называліся гэтыя рэчы. Ужо цераз паўгода, малое, зірнуўшы на слова, беспамылкова паказвала на адпаведны прадмет. Свой метад Глорыя Кліфард праверыла на некалькіх немаўлятах ва ўзросце ад чатырох да пяці месяцаў. Усе яны, па яе сцвярджэнні, аказаліся здольнымі вучнямі».

Такім чынам можна было б навучаць і нотам. Чалавек нараджаецца з крыкам — гэта ягоны першы гук, мабыць, музычны. Маці напявае калыханку, цешыць малога, які слухае спеў, прагавіта ўбіраючы ў сябе кожны гук, перастае плакаць, усміхаецца, гудзе-агукае — падпявае. Для яго нешта, відаць, істотнае ўяўляецца.

Але вось малы падрас[illegible] Яго адцягваюць сілком ад музыкі, разлучаючы з унутраным спевам. Яму навязваюць нейкі твор, ад якога холадам патыхае, нецікава слухаць, нібыта кашу сухую піхаюць у рот, без масла і малака. Не пракаўтнуць. Ён душыцца нясмачнаю «кашаю», выплёўвае яе. Адварочваецца ад нясмачнае «стравы». Тлумачэнні не даходзяць да дзіцячага сэрца, яно чарсцвее.

НЕЯК разгаварылася з падлеткамі — ці любяць яны вершы.

— Люблю, вельмі люблю, — адказвае хлопчык-пяцікласнік. — Толькі я іх не разумею... Спрабаваў чытаць...

Вось так! Не толькі музыкі, але і вершаў школьнікі не разумеюць. Не сустракала, дарэчы, апошнім часам кніжак вершаў для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Нарэшце, убачыла — у прыгожай вокладцы, з густам афармленую, «для старшего школьного возраста» кніжку В. Грышановіча «Стронций в капле росы». Гэта тыповыя модныя цяпер рок-вершы, а «Око бездны» гэтак і вызначаецца: «рок-паэма». Можа, старшакласнікам тое — для душы. Але мяне тыя вершы не вельмі ўсхвалявалі — рацыяналістычныя, як бы закамянелыя.

Ступаю задуменна па парку з гэтаю кніжкаю. Насустрач трое падлеткаў. Мінаю. Раптам нешта цвёрдае бац па спіне. Азірнулася, спакойна пытаюся:

— Што, хлопцы, вам ад мяне трэба? Я ж не дзяўчынка, у бабулі вам годная, а вы загульваеце са мною?.. Ды не ўцякайце. Не бойцеся. Давайце пагамонім... Дык чаму вы кідаеце ў дарослых каменем?

— Гэта не камень — недагрызак ад яблыка! Гэта Ігар кінуў, — паказвае тоўсты падлетак на хударлявага, з выгляду нахабнаватага.

— Ну и бросил! Что с того, — цыркнуў слінаю, зіркаючы спадылба.

— А вось кніжку вершаў чытаў? Для вас напісана, — паказваю.

— Мы не любім вершаў, — адказвае за трох Ігар.

— Колькі табе гадоў? — цікаўлюся.

— Чатырнаццаць. А што?

— Вершаў не любіш?

— Цярпець не магу!

— А ў школе хіба не вучыце іх?

— Не! — хорам адказалі трое пагодкаў.

— Мяне да дзяўчат болей цягне, як і іх да мяне, — кажа Ігар. — Мы іх... трахаем! — цынічна зарагатаў, пазіраючы то на мяне, то на сябрукоў, што ледзь прыкметна падтаквалі — завадатар, па ўсім відаць, Ігар.

— А спевы любіце? У школе ж яны бываюць?

— Спевы? — прыжмурыўся Ігар. Настаўніца па спевах падабаецца...

магнітафоннай стужкі)! У гэтай разгорнутай, насычанай і вобразнасцю і драматычным дзеяннем музычнай сцэне страсна гучалі галасы С. Якавенкі і яго яркай партнёркі — салісткі беларускай оперы Вольгі Цішынай. На некалькіх інструментах шчыраваў У. Судноўскі, які адначасова нязмушана, арганічна дырыжыраваў сваім ансамблем ударных («ЛіМ» пісаў і пра гэтых энтузіястаў, якія згуртавалі сваю суполку ў вольны ад працы ў аркестрах час, — 25.08. 89 г., «Мастацтва не церпіць раўнадушных» П. Дударэнкі). Маладыя музыканты з кранальнай заўзятасцю выконвалі свае партыі, напісаныя не без уплыву канкрэтнай музыкі, што выратала ад іх асаблівага артыстызму: давялося і хорам спяваць, і пляск волжскіх хваляў імітаваць з дапамогай звычайнай вады, і свістаць «па-разбойніцку», у пальцы.

...Аціхлі воплескі, і С. Якавенка прапанаваў, паводле ягоных слоў, альтэрнатыву цяперашнім невясёлым штодзённым думкам ды настроям — парадыйны вакальны цыкл А. Фляркоўскага «Балада пра казла». Гэткія 9 варыяцый на тэму «Жил-был у бабушки...», якія спявак выканаў разам з канцэртмайстрам Р. Бялецкай, стварылі ў зале дураслівую атмасферу капусніка. А на заканчэнне С. Якавенка праспяваў «Музычны ліст» С. Пракоф'ева — мала каму вядомы нечаканы жарт неўтаймаванага кампазітарскага генія.

Слухачы, як і ў першы вечар, дзяліліся сваім «за» і «супраць»: той захапіўся вытанчанай Санатай Г. Дзмітрыева, той пратэставаў супраць знарочыста зніжанага стылю музычнай народы... Словам, раўнадушных не было, зноў кожнаму дасталася і свая часцінка расчаравання, і свая часцінка сумненняў, і свая часцінка свята.

ПРЫ СЛОВЕ «СВЯТА» людзі, нават абыякавыя да класікі, любяць успамінаць модны сёння класічны выраз: «пир во время чумы». Бывае, згадваюць проста не да месца, і тады ўва мне ўзнімаецца дух пярэчання, бо памятаю менш вядомае, але не менш мудрае выслоўе старажытных: «Не загіне горад, у якім ёсць свята». Можа, варта прыслухацца да яго ў нашу несвяточную часіну? І хай мне даруюць неўсвядомленую вольнасць у абыходжанні з класікам, але атрымліваецца амаль як у яго: «Не пакідайце ж горад наш без святаў — каб не ўмёрлі...»

С. БЕРАСЦЕНЬ.

«Маленькая дэталь»...

Аддаляючыся ад падлеткаў, глыбока задумваюся...

Я крыху адхілілася ад галоўнае тэмы — музычнае выхаванне. «Выхаванне» — гэта навыкі паводзін, прышчэпленыя сям'ёй, школай, асяроддзем, праяўляюцца ў грамадскім месцы, — тлумачыць слоўнік. А па-мойму, выхаванне — гэта навука. Што можа даць сям'я, у якой бракуе часу, магчымасці, спецыяльных ведаў? Большасць бацькоў так і лічыць, што галоўнае — накарміць дзіця і апрануць, астатняе дасць школа.

Дзіця ж, каб не палезла ў шкоду, вымагае пастаяннага дагляду. Дарослы, да прыкладу, ведае, чаго яму хочацца: знайсці цікавы занятак, пачытаць добрую кнігу. Ён разумна плануе свой дзень, размяркоўвае кожную хвіліну, тым больш, хатняга клопату хапае. Адкуль жа дзіцяці ведаць, чым можа яно запоўніць свой час? Яно муляецца, пакутуе, сумуе, шукаючы адказу на розныя «чаму?». Дома бацькі амаль не знаходзяць мінуты, каб удзяліць увагу малому, звыклая гаворка: «Ідзі! Не перашкаджай!». Тады вуліца часцяком выхоўвае дзяцей, падлеткаў. А яна, вядома, не можа выхаваць, захаваць, дадзенае малому ад першага дыхання, развіць духоўна далей, а не выхаласціць душу.

У кожнай маленькай істоце існуе душа-Бог, якога можа выціснуць д'ябал і пасяліцца ў душы, каб кіраваць па-свойму. А калі «пакінуў душу Бог» — няма той натхняльнай духоўнай моцы, якая робіць творчай працу, жывіць павагу да блізкіх.

«У ШКОЛЬНЫХ ПРАГРАМАХ відавочны дысбаланс паміж прадметамі, — адзначае А. Селачнік, — якія развіваюць лагічнае і вобразнае мысленне. Самая вялікая бяда ў тым, што, сілкуючы юны розум масай інфармацыі, школьныя ўрокі пакідаюць недагружаную душу, неабуджанымі пачуцці... Эмацыянальная глухата — вынік рацыянальнага выхавання, эмацыянальная тупасць — ад няздольнасці суперажываць... Невыпадкова многія стагоддзі ўплывае на розум і сэрца людзей царква: яна ўздзейнічае на чалавека сродкамі высокага мастацтва. Да разумення мастацтва рыхтаваць чалавека трэба з маленства. Паглядзіце збоку на паводзіны дзяцей, якія вучацца ў дзіцячых музычных школах, у асноўным яны вылучаюцца сярод сваіх равеснікаў выхаванасцю, культурай у адносінах...»

Безумоўна, сэрцы ў гэтых дзяцей больш чулыя, акрыленыя — іх не толькі не спустошылі, але і ўзбагацілі ведамі, далучылі да мастацтва.

Духоўны свет кожнага чалавека, хай сабе і маленькага, куды складаней за неадухоўлены музычны інструмент, мае значна болей струнаў-пачуццяў, якія трэба «разыгрываць», як новую скрыпку ці віяланчэль. Кожны інструмент вымагае індывідуальнай настройкі. Чалавек — істота «шматструнная». Тым не менш мы намагаемся ўсіх настройваць агулам. Вось і гучаць «струны» душы не ў лад, глухавата, да таго ж, не «разыграныя». Незразумелых прадметаў няма, ёсць незразумелыя тлумачэнні, казаў Герцэн. Тупых дзяцей, на маю думку, таксама не надта многа — ёсць тупое выкладанне, у выніку якога душа чалавека застаецца замкнёнаю, сам-насам са сваімі пачуццямі, з адвечным пытаннем — «ЧАМУ?». Чалавек пачынае шукаць выйсця з тупіковага становішча. Але ж ён сляпы — і...валіцца ў багну, якая засмоктвае яго ўсё глыбей.

Кіраўніцтва задумваецца, чым заняць, «развлечь» моладзь. Узводзяцца клубы-гмахі, шумныя кафэ з дыскатэкамі... Усё дзеля забавы — не дзеля спажывы глыбінь душэўных.. Душа спустошаная, не ўсцешаная, шукае нечага. І цяпер ужо кіраўніцтва падпарадкуецца моладзі, ідзе на повязі, ва ўсю стараецца. Хочаце курыць? Калі ласка! Піць? Калі ласка! Што ж, кіраўніцтва выйшла з таго самага асяроддзя — недавыхаванасці. Дык што яно можа прапанаваць? Не даўшы рады ў кіраванні, яно абыякава махае на ўсё рукою — гары, маўляў сінім полымем...

«Масавая глухата да цудоўнага, няздольнасць успрымаць сапраўднае мастацтва, апанавала ўжо некалькі пакаленняў... Цяжка знайсці душу, гатовую ўстрапянуцца... Аднабаковая прапаганда забаўляльнай музыкі выхоўвае гультайства, спажывецтва, прыводзіць да парушэнняў экалогіі духу, густу — бездухоўнасці памкненняў... Час усім разам грунтоўна, з трывогай падумаць пра якасць чалавечай душы — не толькі пра якасць адзення і прадметаў спажывання. Наспеў час усур'ёз заняцца экалогіяй музыкі, экалогіяй культуры... Павінен жа хтосьці ўсур'ёз адказваць за музычную палітыку...» — піша А. Селачнік.

Натхнёна, пераканаўча выступае паважаны выкладчык БДК. Аднак каго ж можна прымусіць сёння несці адказнасць за выхаванне музычнае ды і ўвогуле за выхаванне? Можа, за гэта павінен узяцца і ўзначаліць справу чалавек, які сам і ўзняў пытанне? Бо так у нас вядзецца — хто прапануе, той і «цягне воз».

Эмілія ПАСЫНКАВА,
журналістка.

ПА НАШЫХ аднолькавых, стандартных афішах наўрад ці можна вызначыць, наколькі рознакаляровыя з'явы складаюць палітру музычнага жыцця Мінска. Што ж датычыць духавых інструментаў, асабліва медных, дык тут і самі інструменты, і выканаўцы, іхнія імёны застаюцца мала каму вядомымі. Вось і зноў цішком прайшоў канцэрт-сустрэча з маскоўскімі трамбаністамі на сцэне Цэнтральнай музычнай школы № 1 г. Мінска.

Дарэчы, даўнія творчыя і педагагічныя сувязі лучаць Беларускую дзяржаўную кансерваторыю з маскоўскімі навучальнымі музычнымі ўстановамі, у тым ліку і з педагагічным інстытутам імя Гнесіных. Едуць туды павучыцца нашы студэнты, аспіранты, стажыруюцца выкладчыкі. Не так даўно ўступіў у сілу дагавор паміж БДК і названым інстытутам. Адбылася творчая сустрэча, прайшлі адкрытыя ўрокі, якія правёў з нашымі студэнтамі заслужаны артыст РСФСР, дацэнт кафедры духавых інструментаў гнесінскага інстытута Мікалай Філіпаў...

Канечне, сёння пачалі ўжо часцей гаварыць аб праблемах духавой музыкі, праблемах выканальніцтва на духавых. І наогул, ужо амаль кожны з нас можа паразважаць пра сучасны стан нашай культуры, смела закрануць пытанні «вышэйшых матэрый», але ўсё гэта мала чаго вартае, калі не зважаць на рэальнасць. У нас, здаецца, забыліся на тое, што выхаваць сапраўднага музыканта амаль гэтак жа цяжка і складана, як выгадаваць дзяцей, узрасціць хлеб. Пра хлеб ведаем з дзяцінства: складаная гэта справа, клапатлівая—усе разумеем, але ж ці пазбаўленыя ў жыцці ад негатыўнага ў стаўленні да хлеба?.. Што ж казаць пра мастацтва, пра музыку, пра выканальніцтва? А сутнасць і ў адным, і ў другім выпадку — сувязь з зямлёй, прыродай, народам. Хлебнае калоссе — хіба не нашы таленты ў музыцы, у мастацтве наогул, якія, як і кожны каласок, павінны быць выпеставаныя, зберажоныя, тады будзе радзіць ніва мастацтва...

Вядома, у галіне духавой музыкі ў нас шмат праблем, але ёсць і дасягненні. Сёння, як мне здаецца, не час займацца дэмагагічным корпаннем, калі амаль кожны бярэ на сябе ролю суддзі, — гэта не дапамагае самой справе. Часта лаўлю сябе на думцы, што многія проста з нейкай асалодай займаюцца ганьбаваннем усяго і ўсіх, выкрываючы, як ім здаецца, сапраўдныя прычыны нашых цяжкасцей. Але ж няўжо гэта адзінае выйсце з кола праблем? Што ж, так і будзем, прыдаўленыя агульным крызісам, песімістычна назіраць, як гіне наша культура, гінем, у рэшце рэшт, самі? Незайздросная перспектыва...

Ва ўсе часіны наша музычная культура трымалася менавіта на самадданай працы тых, хто не толькі разам з народам пераадольваў сацыяльныя цяжкасці — беднасць, пасляваенныя пакуты, неўладкаванасць, але і дамагаўся значных дасягненняў, пракладваў сваю дарогу ў вялікае мастацтва. Да гэтай катэгорыі людзей, безумоўна моцных характарам, воляй, я адношу Расціслава Анатольевіча Лагонду — прадстаўніка нашай беларускай выканаўчай культуры на духавых інструментах на ўзроўні ўсесаюзным і міжнародным. Увесь складаны шлях у мастацтва ён прайшоў, абапіраючыся на свае здольнасці, талент, розум, далучыўшыся да музыкі простым сялянскім юнаком. Пасля трох курсаў Мінскага музвучылішча—паспяховая здача экзаменаў у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю, адначасовае запрашэнне на працу ў аркестр радыё, затым праца ў Дзяржаўным сімфанічным аркестры БССР, вучоба ў маскоўскай аспірантуры. Прызнаннем беларускага трамбаніста на сталічным узроўні з'явіліся не толькі публічныя канцэрты, але і запрашэнне на працу ў оперна-сімфанічны аркестр Усесаюзнага радыё і тэлебачання. Акрамя той вялікай карысці, што выканаўца набыў ад запісаў мноства значных твораў, яму давялося пазнаёміцца ў працы з вядучымі айчыннымі выканаўцамі на трамбоне, з сусветна вядомымі дырыжорамі.

І вось ён — дацэнт кафедры духавых інструментаў БДК, сумяшчае педагагічную працу з навуковай дзейнасцю. Выязджае ў музычныя вучылішчы рэспублікі для аказання метадычнай дапамогі. Нярэдка працуе ў складзе конкурсных журы. Асабіста мне яшчэ імпануе веданне Р. Лагондам англійскай мовы. Дарэчы, гэтая акалічнасць адыграла не апошнюю ролю пры выбары кандыдатуры для трохгадовай працы, паводле кантракту, за мяжой. Па запрашэнні Каірскай нацыянальнай кансерваторыі ён паехаў у Егіпет, дзе, між іншым, авалодаў яшчэ арабскай мовай. Ну, а з польскай — таксама ніякіх праблем. Англійская ж мова дапамагае непасрэдна знаёміцца з замежнымі метадычнымі выданнямі, музычнымі часопісамі — на такую інфармацыю ў нас «голад».

За амаль 25-гадовую працу ў Р. Лагонды было шмат выпускнікоў. Толькі мінскія аркестры на 80 працэнтаў «укамплектаваны» трамбаністамі і тубістамі, якія прайшлі ягоную «школу». Сярод іх — Віктар Каўрэцкі. Той, хто ведае гэтага музыканта, відаць, ужо звыкся з думкай пра ягоныя поспехі: пасля перамогі на Усесаюзным конкурсе ён вытрымаў яшчэ больш складаны конкурс — у Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР на месца першага трамбаніста, ды і пасля таго прыбавіў у самастойных занятках, скіраваных на ўдасканаленне выканаўчага майстэрства.

Выступленне В. Каўрэцкага пад час канцэрта-сустрэчы з маскоўскімі духавікамі сталася сапраўднай сенсацыяй. Ягоная ігра не пакінула нікога абыякавым, кранула, як мне здалося, не толькі слухацкія пачуцці, а нават і нацыянальныя. Што я маю на ўвазе?

Нешта важнае, значнае страцілі мы ў сваіх нацыянальных пачуццях. Што атрымліваецца? Вось мы адчулі змены ў адносінах да нацыянальнага пытання: пачалі адраджаць родную мову вельмі часта па радыё, на тэлебачанні гучыць народная музыка. Увогуле, людзі ўхваляюць усё гэта, але ж, мабыць, кожны адчувае, што гэтага недастаткова, патрэбны не мерапрыемствы, а з'явы больш адчувальныя па ўздзеянні на нацыянальныя пачуцці. Адзін з многіх недахопаў, як мне здаецца, тое, што мы вельмі дрэнна ведаем сваіх лепшых прадстаўнікоў. У нас ці дэфармавана, ці ўжо зусім сцёрта натуральнае пачуццё гордасці за людзей свайго краю, за беларусаў. Я лічу, што ў той жа сферы музычнай культуры ў нас ёсць чым і кім ганарыцца, ёсць шмат дастойных прадстаўнікоў нацыі, але мы вельмі мала пра іх ведаем...

Разумею, што падзея, пра якую я тут паведаміў чытачам, — толькі маленькая дэталь вялікага механізму, але ж усё вялікае складаецца з маленькага, і таму надаю значэнне гэтай справе, як рэальнаму ўкладу ў вырашэнне нашых вялікіх і складаных праблем. Калі кожны з нас зойме такую ж дзейсную пазіцыю, накшталт той, якую занялі аб'яднаныя агульнай ідэяй адрадзіць высокі выканаўчы, культурны ўзровень маскоўскія і нашы, беларускія, музыканты, думаю, мы зрушым з месца цяжкі воз праблем нашай культуры. Ад гэтага зруху ў пэўнай ступені залежыць, якую мы будзем слухаць музыку, які будзе ўзровень яе выканання і г. д.

Ды па сённяшні дзень жывуць старыя стэрэатыпныя інструкцыі, якія не можа перакрэсліць ніводны вучэбны ці творчы калектыў і нават Міністэрства культуры БССР. Напрыклад, калі зыходзіць з сутнасці інструкцый, дык патрэбна, каб больш таленавітыя, тыя, хто дасягаў большых поспехаў у гады вучобы ў кансерваторыі, абавязкова нараджаліся ў Мінску, або, барані Бог, каб не выходзілі замуж ці не жаніліся, нават калі адслужылі ў арміі. А жыццёвыя ж абставіны складваюцца парознаму! Хіба можна заганяць людзей у такое ідыёцкае становішча, калі яны не маюць права кіраваць сваім жыццём? Праблема прапіскі паламала ўжо лёс многіх таленавітых музыкантаў, якія па сваіх здольнасцях патрэбныя былі ў вядучых калектывах, але... Ці не таму мы час ад часу звяртаем увагу на праблему неўкамплектаванасці нашых аркестраў і г. д.? Нават лаўрэацкія званні, заваяваныя ў цяжкай конкурснай барацьбе, якія сведчаць пра ўсесаюзнае прызнанне, нічога не вартыя, калі пытанне датычыць прапіскі, кватэры і нават інтэрната...

Дарэчы, не абмінула гэта і лаўрэата Усесаюзнага конкурсу В. Каўрэцкага, які дагэтуль жыве ў Івянцы і штодня вымушаны ездзіць на рэпетыцыі, канцэрты, на выкладчыцкую працу ў родную кансерваторыю... Заўважце, як тут не суадносіцца адно з другім. І пакуль мы будзем адводзіць вочы ад гэткіх «рэалій», датуль, відаць, і не навучымся ганарыцца сваімі людзьмі, берагчы свае таленты, якія, на бяду чыноўнікам, не выбіраюць месца нараджэння і слушна лічаць усю Беларусь сваёй Радзімай.

Пятро ДУДАРЭНКА,
артыст аркестра
ДАВТа БССР.

МАЯКІ І МІРАЖЫ

(Пачатак на стар. 6—7).

хадзем бараніці а тут не ўсе ідуць, да і мало нашых пашло. Выгналі то Маскаля і Немца— но каб жэнкі да і дзеці гэтых што хадзілі на вайну мелі за чым пражыці, так Кароль наш і напісаў такое право: Гэтые што не хочуць ісьці бараніці сваей землі, нехай абрабляюць поле гэтым што б'юць ся за вольносьць і шчасьце ўсіх. І гэтак было доўго: адне бараніли краю, усё хадзілі па войнах а другіе то гаралі то сеялі то касілі то жалі. З гэтуль то і ўзялася гэта паньшчына. Судзецеж цепер самі чы можно было зрабіці справедлівей як зрабіў калісьці наш Кароль Польскі да і Літоўскі!»

Аказваецца, маскалі вінаваты не толькі ва ўсіх бедах той пары, калі пісалася «Мужыцкая праўда», але і ў тым, што на нашай зямлі пад панаваннем польскіх каралёў (якіх Каліноўскі ўсюды ласкава называе «нашымі») з'явіўся прыгон! І гэта пісаў чалавек, які знаёміўся з універсітэцкімі навукамі! Беларускі мужык павінен быў паверыць, што пакуль не накінуліся на нас маскалі з немцамі, яго прыгонныя продкі мелі на зямлі рай: «Но калі Маскаль з Немцом хітросьцею нас падбіў і пашоў ронд маскоўскі так і ўсё зрабіло ся па чортоўску».

Паспрабуем растлумачыць версію пра сутнасць прыгону ў Рэчы Паспалітай больш папулярна. Калі прыняць на веру тое, што піша Каліноўскі, то трэба прызнаць, што наш даўні знаёмы «пан з Канева родам», той самы пан Патоцкі, якога праславіў Янка Купала ў паэме «Бандароўна» (а гэта была рэальная асоба), дзень і ноч ваяваў за шчасце роднай краіны, у тым ліку і Беларусі, а мужыкі з усіх сіл стараліся працаваць, каб яго жоначка і дзеткі з голаду не памерлі. Так выглядае ідылія, намаляваная Каліноўскім, калі звярнуцца да канкрэтных прозвішчаў і фактаў.

А яшчэ ў нас ёсць магчымасць і аказія зірнуць на яе з некалькі іншага боку. У 1864 годзе эміграцыйная «Бібліятэка польская ў Парыжы» апублікавала двухтомны зборнік дакументаў пад назвай: «Справаздачы папскіх нунцыяў і іншых асоб аб Польшчы ад года 1548 да 1690». Выдавалася гэтая кніга ў Берліне і Познані. Дык вось, у 1575 годзе пасол Венецыі Геранім Ліпамана, у прыватнасці, паведамляў: «Няма больш нешчаслівай і гаротнай істоты на свеце, як літоўскі мужык, які не мае нічога ўласнага, а толькі тое, што яму пан дасць са сваёй ласкі, а таго не хапае на самае прымітыўнае задавальненне патрэб. Недастаткова таго, што іх (сялян. — **У. К.**) душаць і абдзіраюць паны, крыўдзяць іх таксама жаўнеры, якія размясціліся па вёсках супраць Масквы. Не абмяжоўваючыся грашовым забеспячэннем, на якое мужыкі чатыры разы ў год плацяць падатак, войска забірае ім рэшткі не адабраных панам пажыткаў, так што неаднаразова мужыкі вымушаны перад такім насіллем уцякаць у лес з дзецьмі і набыткам».

Гісторыя сведчыць, што хто б з мячом ні гуляў па нашай зямлі — ці то «свае» ваякі, ці маскоўскія, не кажучы пра татарскія орды, — лілася нявінная кроў, рабаваўся, паліўся і нішчыўся набытак, пакутаваў просты народ. І так на працягу доўгіх стагоддзяў: перыяды зацішша, перагавораў і старанняў жыць у міры і дружбе змяняліся новымі войнамі, крывавымі парахункамі, ад якіх перш за ўсё трашчалі мужыцкія, а не панскія чубы.

Для ацэнкі тагачасных падзей патрэбен нам рэальны падыход, а не падыход, падпарадкаваны ўзвелічэнню вялікадзяржаўных інтарэсаў—незалежна ад таго: рускіх ці польскіх. І наша задача ўзвялічваць не тых ваякаў з аднаго ці другога боку, што безаглядна лілі чужую кроў, а тых людзей, якія ўсімі сіламі і сродкамі шукалі ўзаемаразумення, узаемазбліжэння, міру. Былі такія, і сярод іх ганаровае месца належыць Льву Сапегу, які, у прыватнасці, у 1600—1601 гадах вёў працяглыя і складаныя перагаворы з Барысам Гадуновым аб заключэнні вечнага міру. Толькі мірнае суіснаванне магло прынесці рэальную палёгку і гарадам і сёлам шматпакутнай беларускай зямлі.

Вернемся яшчэ раз да пытання аб тым, што такое свабода паводле ўяўленняў Каліноўскага. Ён сцвярджае: чалавек свабодны тады, калі «вызнае тую веру, якую вызнавалі яго бацькі, дзеды і прадзеды. От што вольносьць значыць». Здаецца, што ўсё, як і быць павінна. Але ў шостым нумары «Мужыцкай праўды» раскрываецца сапраўдны і даволі нечаканы сэнс гэтых слоў. Аказваецца, што адзінай верай, якую Каліноўскі дазваляе беларускаму мужыку вызнаваць, з'яўляецца уніяцкая. «Не адзін ужэ можэ забыў ся,— піша ён, — што бацько его быў ешчэ справедлівой уніяцкой веры і ніколі ўжэ не спомніць на тое, што перэвернулі его на сызму, на православье, што ён сегодня як той сабака жыве без веры і як сабака здохне чартам да пекла!!! О, Дзяцюкі, ліхо такому чэлавекові! А калі мы будзем гэтак рабіці з Богом, так штож Бог найвышшы з намі зробіць? Аддасць у Пекло на вечные мэнкі, будуць чорты душу на кускі рваці, а смала ў вантробах кіпеці будзе. Пазнаеш тагды свае ліхо — но ў пекле па неўчасе ўжэ будзе, не перэпросіш тагды ўжэ справедліваго Бога і мэнкам тваім ніколі каньца небудзе».

Вось, аказваецца, які уніяцкі Бог справядлівы: усіх праваслаўных у «Пекло»...

І яшчэ пра тое ж самае: «Цар маскоўскі, — піша Яська гаспадар...— перэкупіўшы много папоў, велеў нас у сызму запісаці, ён то плаціў грошы каб мы только перэхадзілі на православіе і як гэты Антыхрыст, адабраў ад нас нашу справедлівую — уніяцкую веру і пагубіў нас перад Богом на векі; а зрабіў гэто для таго, каб мог нас без каньца драці, а Бог справедлівы не меў злітованя над намі. (...)

Паказываюць людзе што сьвенты Ойцец аж з Рыму прыслаў ужэ да нас свае благославене, (но Маскаль его спыняе) — гавораць што прышле і ксендзоў, што будуць прымаці на уніяцкую веру. Тагды Дзяцюкі хто адно верыць у Бога, Его Сына і Духа Святого, нехай зараз пакідае сызму і перэходзіць на праўдзівую веру Дзедоў і Прадзедоў. Бо хто не перойдзе на унію, той сызматыком застанець ся, **той як сабака здохне** (падкрэслена мною. — **У. К.**), той на тамтом свеце пекельные мэнкі церпеці будзе!»

Гэта пісалася ў сярэдзіне XIX стагоддзя, а не ў першай палавіне XVII, калі дзяржаўныя ўлады, старанна і паслужліва выконваючы пажаданні і ўказанні Ватыкана, перадавалі праваслаўныя цэрквы уніяцкім папам, зусім не зважаючы на тое, ці з'явіліся ў прыходзе прыхільнікі такой рэлігійнай ператасоўкі.

Цяжка сказаць, чаго больш у той сляпой нянавісці Каліноўскага да праваслаўя: сярэдневяковага цемрашальства ці проста нейкай незразумелай абмежаванасці кругагляду. І можна было б спадзявацца, што калі б «Яська гаспадар с пад Вільні» са сваімі аднадумцамі заваяваў уладу, то «сызматыкаў» (якіх Каліноўскі ставіў на адзін узровень з сабакамі) чакала б нялёгкая доля.

У нашы дні даволі часта даводзіцца чытаць і чуць дыфірамбы ў гонар уніі, якую абвяшчаюць не менш і не больш як «народнай рэлігіяй». Аўтараў такіх выказванняў нікольні не насцярожвае тое, што сёння ў Заходняй Украіне уніяты сілай забіраюць цэрквы, ператвараючы насілле ў галоўны аргумент сваёй рэлігійнай палітыкі.

У чэрвені гэтага года мне давялося ў час экскурсіі трапіць у адзін уніяцкі храм у Польшчы, недалёка ад нашай граніцы. Малады, інтэлігентны, адукаваны святар — адчувалася, што яго сапраўднае прызванне несці слова Божае ў масы — сказаў з перакананнем, што кожная рэлігія павінна збліжаць людзей, а не раз'ядноўваць іх. Што ж супраць гэтага можна запярэчыць? Іншы уніяцкі святар а. Надсан прывёз нам аднаразавыя шпрыцы, не пытаючыся, хто імі будзе карыстацца: праваслаўныя ці уніяты, каталікі ці бязбожнікі. Ён прывёз іх для людзей. Як мне ўяўляецца, іменна так трэба рабіць, каб было сапраўды па-хрысціянску. Паважаючы такіх святароў, я буду паважаць і іх рэлігію, якая абавязвае іх так паводзіць сябе.

За часы Жыгімонта III у Рэчы Паспалітай іншаверцам (у тым ліку і праваслаўным) станавілася ўсё больш і больш цесна і няўтульна. Тая самая Рэч Паспалітая, якая славілася калісьці сваёй талерантнасцю і магла служыць прыкладам Заходняй Еўропе (нельга ж было адным махам акаталічыць увесь агромністы абшар Вялікага княства Літоўскага!), паступова ператварылася ў краіну, дзе ўсё больш жорстка праследавалася рэлігійнае вальнадумства і пратэстантызм. Дастаткова нагадаць, што ў 1668 годзе сейм прыняў пастанову, у адпаведнасці з якой адступленне да каталіцызму каралася смерцю. Усё больш шырокім фронтам разгортвалася наступленне супраць так званай схізмы (Каліноўскі называе яе сызмай), гэта значыць, супраць праваслаўя.

Калісьці Якуб Колас пісаў: «З двух бакоў «айцы» дубінай заганялі нас у рай!» Думаецца, што уніяцкая дубіна была б нікольні не мякчэйшай за праваслаўную або каталіцкую. Можна меркаваць, што пры такой нецярпімасці не да сваёй рэлігіі К. Каліноўскі не змог бы аказацца талерантным да любога іншадумства. Чым гэта сканчаецца на справе, мы дастаткова добра ведаем з нашага ўласнага вопыту апошніх сямі дзесяцігоддзяў.

Чамусьці нашы даследчыкі не звяртаюць увагу на адну дэталь. Бацькі беларускага адраджэння не надта спяшаліся ў дакастрычніцкі час уводзіць К. Каліноўскаму п'едэсталы і абвяшчаць яго героем нацыі. Ф. Багушэвіч, удзельнік таго ж студзеньскага паўстання 1863 года, крытыкуючы В. Дуніна-Марцінкевіча за ідэйныя пазіцыі, не супрацьпастаўляў яму К. Каліноўскага. Быццам зусім не ведаў і не чуў пра яго хаця б пад прозвішчам «Яська гаспадар». Быццам не трымаў у руках «Мужыцкай праўды». Выпадкова гэта ці не?

Арганізатары уніі прапагандавалі ідэю рэлігійнага адзінства, а практычна імкнуліся да поўнай рэлігійнай, затым палітычнай ды і нацыянальнай асіміляцыі ўсіх прастораў так званай «Рэчыпаспалітай абодвух народаў», да ператварэння яе ва унітарную дзяржаву. На шляху да ажыццяўлення гэтай мэты выкарыстоўваліся ўсе даступныя сродкі без аглядкі на нормы хрысціянскай ці проста чалавечай маралі. І мы нядрэнна ведаем, якое становішча склалася да XVIII стагоддзя, калі (бела)руская мова, абвешчаная ў Літоўскім Статуце 1588 г. у якасці дзяржаўнай, па сутнасці ўсяго толькі праз стагоддзе была заканадаўчым актам сейма Рэчы Паспалітай выціснута з ужывання ў дзяржаўнай сферы.

Пры ўсіх тых, скажам проста, недарэчнасцях шмат чаго ў К. Каліноўскага з'яўляецца бясспрэчным. Нельга з ім не згадзіцца там, дзе ён з болем у сэрцы гаворыць пра бесчалавечнасць рэкрутчыны, якая ператварала прыгонных сялян у звычайных рабоў. Гэтую дзікую рабаўладальніцкую норму прынесла беларускаму мужыку царскае самаўладства.

К. КАЛІНОЎСКАМУ БЫЛО ЯСНА, што пры рускім самадзяржаўна-памешчыцкім ладзе селянін не атрымае ні зямлі, ні рэальнай волі. І таму ён так няшчадна гэты лад выкрывае. А як ён адносіўся да рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў? Ці разлічваў на іх дапамогу на магчымасць аб'яднання сіл? З «Мужыцкай праўды» практычна мы гэтага не бачым. У трэцім нумары газеты вядзецца гаворка пра ранейшыя хваляванні ў Расіі, але яны не звязваюцца з падзеямі ў Польшчы, Беларусі і Літве. І нават лозунг «За нашу і вашу свабоду!», што дзесяцігоддзямі аб'ядноўваў рускіх і польскіх змагароў супраць самадзяржаўнага дэспатызму, у Каліноўскага набывае зусім новы сэнс: ён згадваецца толькі для таго, каб паказаць, што не толькі сяляне, але і жыхары мястэчак змагаюцца за агульную свабоду: «...Бунтуюць ся мястэчковые, да і маладзёж за сваю і нашу вольносьць і веру» («Мужыцкая праўда», № 5).

Паступова мы наблізіліся да складанага пытання: ці лічыў сябе беларусам сам К. Каліноўскі? Ці думаў ён пра Беларусь як пра нешта адметнае, нацыянальна самабытнае і адрознае? Інакш кажучы, ці ўяўляліся яму беларусы ў якасці самабытнай нацыі? Пацвярджэнне гэтага мы не знойдзем у «Мужыцкай праўдзе».

Могуць сказаць — і зусім слушна: звяртаўся ж ён да беларускага мужыка на яго роднай мове і гаварыў з ім як роўны з роўным, як свой са сваім. Але ўявілі б мы сабе, што ён звярнуўся б на польскай — і які эфект быў бы? Не цяжка здагадацца.

Не забудзем і таго, што ў польскай газеце «Chorągiew swobody» (Сцяг свабоды) 1 студзеня 1863 г. — рэдактарам гэтага нумара (а можа, і аўтарам) быў К. Каліноўскі — ясна і недвухсэнсоўна сцвярджалася і патрабавалася: «Абвяшчаючы прынцып раўнапраўя ўсіх саслоўяў і веравызнанняў, без шкоды для чыёйсьці ўласнасці і свабоды сумлення, заклікаючы да адзінства дзеяння **ўсе без выключэння слаі польскага грамадства** (падкрэслена мною. — **У. К.**) у імя свабоды і нацыі (якой? — ва ўсякім выпадку не беларускай. — **У. К.**), Правінцыяльны камітэт верыць, што гэта адпавядае ўсеагульнаму жаданню, адзінадушным патрабаванням краіны» (маецца на ўвазе Польшча). І яшчэ адна цытата адтуль жа: «Усюды, дзе нацыянальная жалоба, патаптаўшы блюзнерчыя трактаты прыгнятальнікаў, грозна акрэсліла граніцы польскай зямлі (гаворка вядзецца не толькі пра этнаграфічна польскія тэрыторыі. — **У. К.**), нас злучае салідарнасць прынцыпаў і мэты».

Пісалася гэта ў Вільні, спрадвечным палітычным і культурным цэнтры беларускай зямлі. Праўда, у гэтым артыкуле называюцца Беларусь і Літва, але ў кантэксце ўсіх разважанняў яны ўспрымаюцца як арганічныя часткі аднаго непадзельнага цэлага — той Польшчы, за незалежнасць якой павінна разгарнуцца змаганне.

Звернем яшчэ ўвагу на словы з адзінага вядомага нам верша К. Каліноўскага: «Бывай здаровы, мужыцкі народзе». Тут на месцы магло б быць толькі слова «беларускі», а не «мужыцкі» калі б К. Каліноўскі і сапраўды лічыў сябе беларусам. Яно просіцца, але не трапіла сюды. Чаму?

У кнізе «К. Калиновский: Из печатного и рукописного наследия» (Мінск, 1988) на стар. 12 мы чытаем: «Выдвигая тезис независимости Польши, А. И. Герцен в свою очередь требовал от поляков отказа от притязаний на белорусские, литовские и украинские земли. В том же письме он восклицал: «Быть Литве, Белоруссии и Украине с кем они быть хотят или ни с кем, лишь бы волю их узнать — не поддельную, а действительную». «Взгляды Герцена, — працягваецца далей у артыкуле, — раздзелял К. Калиновский. Он вел упорную и последовательную борьбу с националистическими притязаниями той части польских шляхетских революционеров, которая требовала восстановления Польши в границах 1772 года и включения в ее состав белорусских, литовских и украинских земель». У якасці доказу прыводзіцца спасылка на сцвярджэнне царскага генерала Ратча.

Спасылацца, бясспрэчна, ёсць на каго, прытым не толькі на Ратча, але і на польскіх дзеячаў і гісторыкаў, у іх ліку на Гейштара, Пшыбароўскага, Яноўскага, Ліманоўскага. Аднак жа ў нашым распараджэнні сем нумароў «Мужыцкай праўды», у якіх цяжка знайсці нават намёк на ідэю незалежнасці або хаця б самабытнасці Беларусі. А газета ж адрасавалася беларускаму мужыку.

Праўда, нехта можа нагадаць, што К. Каліноўскі выступаў супраць навучання мужыцкіх дзяцей на рускай мове. Пісаў жа ён: «У нас Дзяцюкі адно учаць у школах каб ты знаў чытаці па маскоўску, а то для таго каб цебе заўсім перэрабіці на маскаля» («Мужыцкая праўда», № 4). Але дзе ён сказаў, што трэба вучыць па-беларуску? Малітву «Сьвенты Божэ, сьвенты моцны, сьвенты несьмертэльны — змілуй сен над намі!» Каліноўскі лічыць сваёй. А ці адважыцца хтоколечы сказаць, што тут беларуская мова? Тое, што К. Каліноўскі выступаў супраць «маскоўскай» мовы, само па сабе зусім не значыла, што супрацьпастаўляў ёй беларускую і дапускаў магчымасць увядзення яе ў школах.

Ствараецца ўражанне, быццам для Каліноўскага не існуе пытання аб тым, ці могуць беларусы жыць самастойна, думаць і вучыцца не толькі не па-«маскоўску», але і не папольску.

Вядома, у працэсе жорсткага змагання, калі так напружана працуе думка, сама логіка жыцця і барацьбы павінна была падводзіць змагара да неабходнасці асэнсавання сярод іншых і нацыянальнага пытання, усведамлення нацыянальнай адметнасці беларускага народа. Але такая ідэя ў яго яшчэ не выкрышталізавалася, не аформілася, хоць, магчыма, недзе зараджалася ў падсвядомасці.

Наогул жа развітвацца з міфамі заўсёды цяжка, пакутліва і нават балюча. А праўда, бывае, што і вочы коле. Але толькі праўда можа навучыць нас жыць, рабіць належныя вывады з памылак мінулага, спасцігаць глыбінны сэнс урокаў гісторыі — усяго станоўчага, узвышанага гераічнага, а таксама адмоўнага, цёмнага, змрочнага. Наша задача сёння — узняцца над гісторыяй рэальнай, якой яна была ў свой час, якой яе тварылі продкі — пакутуючы, шукаючы, змагаючыся, нешта знаходзячы, а найчасцей — быццам блукаючы ў дрымучым лесе.

Беларускі шлях

Развіццё незалежніцкай думкі на ўсходзе Беларусі? Яго практычна не было. З таго часу, як лінія фронту падзяліла нашу краіну на дзве часткі, яны жылі кожнае сваім жыццём. На захадзе — Віленшчыне, Горадзеншчыне, Беласточчыне—працавала амаль 300 беларускіх школ, беларускія настаўніцкія курсы, выходзілі «Гоман» і «Беларус». Беларускі камітэт помачы ахвярам вайны атрымліваў хоць малыя, але датацыі... На ўсходзе яшчэ ў 1914 годзе былі зачынены «Лучынка» і «Саха», не было ніводнае школы, камітэты помачы ахвярам вайны гібелі, газеты «Дзяньніца» і «Swie/ac» пасля сёмага нумара былі зачынены. Урад рабіў усё для русіфікацыі вывезеных у глыбіню Расіі беларусаў.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 года кардынальна змяніла сітуацыю. Інтэлектуальныя сілы беларускага народа, якія назапашваліся ледзь не ў падполлі, атрымалі магчымасць выявіць сябе. А сілы гэтыя былі немалыя: згадаем хоць бы выхаванцаў Браніслава Эпімаха - Шыпілы Янку Купалу, Браніслава Тарашкевіча, Зміцера Жылуновіча, Клаўдзія Душэўскага - Дуж, Тамаша Грыба, Лявона Зайца, Язэпа Варонку, ксяндзоў Вінцэнта Гадлеўскага, Фабіяна Абрантовіча, Адама Станкевіча ды іншых. Згадайма ветэранаў БСГ Вацлава Іваноўскага, Алеся Бурбіса, згадайма Алеся Гаруна, Язэпа Лёсіка, Максіма Гарэцкага, Якуба Коласа, Каруся Каганца, Аркадзя Смоліча... Згадаем яшчэ Паўла Алексюка, Усевалада Фальскага, Паўла Каравайчыка, Міхала Кахановіча, Івана Краскоўскага, Лявона Дубяйкоўскага, Фабіяна Шантыра... Розны лёс у гэтых людзей. Адны стануць дзеячамі Беларускай Народнай Рэспублікі, другія—Беларускай ССР, адны захаваюць вернасць беларускай ідэі аж да самай смерці, загінуць ад рук сталінскіх катаў, фашыстаў, другія (да нашага гонару, адзінкі) пяройдуць на бок пілсудчыкаў. Цяпер жа, увесну 1917-га, многія з іх сабраліся ў Мінску, каб злучыць свае сілы.

Праграма, выпрацаваная на з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый у сакавіку 1917 года, нічым не нагадвае незалежніцкую. Па сутнасці, паўтараецца праграма БСГ 1905 года: аўтаномія, беларуская школа, беларускі друк... Беларускія дзеячы цалкам лаяльныя ў дачыненні да новага рэжыму ў Расіі. І далей будуць лаяльныя, нягледзячы на нежаданне Часовага Урада пайсці насустрач беларусам. Негвалтоўныя дзеянні, паступовасць, кампрамісы... Гэта былі прынцыпы беларускай нацыянальнай дэмакратыі. Найбольш разгорнутая пазіцыя беларускіх аўтанамістаў выкладзена ў брашуры Язэпа Лёсіка «Аўтаномія Беларусі», якую сёлета зноў публікуе часопіс «Спадчына» (пачатак у № 3).

Пасля з'езда беларускіх арганізацый, які фігуруе ў літаратуры як канферэнцыя, адбудзецца II партыйная канферэнцыя БСГ (чэрвень), III з'езд партыі (кастрычнік), будзе заснавана газета Беларускага Нацыянальнага Камітэта «Вольная Беларусь» (рэдактар Язэп Лёсік), газета БСГ «Грамада» (рэдактар Аркадзь Смоліч). У маі будзе створана партыя Беларуская Хрысціянская Злучнасць (будучая Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя), якая пачне выдаваць газету «Беларуская Крыніца». У маі Язэп Мамонька створыць першую арганізацыю воінаў-беларусаў, а потым на розных франтах і на Балтыйскім флоце апранутыя ў шынялі інтэлігенты-беларусы Ігнат Дварчанін, Сымон Рак - Міхайлоўскі, Алесь Чарвякоў, Антон Баліцкі, Сцяпан Некрашэвіч, Кастусь Езавітаў ды іншыя створаць цэлую сетку беларускіх воінскіх арганізацый, правядуць Беларускі вайсковы з'езд, які абярэ Беларускую Цэнтральную Вайсковую Раду. Але трохі раней (у ліпені 1917-га) паўстане Беларуская Рада, або Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый, якая зменіць сабою БНК. Увосень Беларуская Рада і Беларуская Рада Заходняга фронту аб'яднаюцца ў Вялікую Беларускую Раду, якая пачне падрыхтоўку да Усебеларускага з'езда.

А пакуль што на календары сакавік 1917-га.

ПРАТАКОЛ

з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25—27 марта 1917 г.

На з'езд сабралася ўсяго да 150 учасьнікаў. На старшыню сходу быў выбраны доктар Кастравіцкі, яго таварышамі прыс(яжны) пав(ераны) Метлін і юрыст Аляксюк. За сакратароў выбралі Л. Зайца і Б. Тарашкевіча. З'езд адкрыўся ў 7 гадзін вечара.

Таварыш старшыні П. Аляксюк прачытаў прыветныя тэлеграмы ад розных арганізацый і прыяцеляў беларусаў: Радзевіча, Саксімовіча, Столыгвы і Свілава з Петраграду, ад жаноцкага бел. гуртка ў Петраградзе «Пралеска», ад беларускага выдавецтва ў Петраградзе «Загляне сонца і ў наша ваконца», ад гуртка вучняў і студэнтаў — уцекачоў у Петраградзе, ад бел. кс[яндзоў] Будзькі і Хведзькі, ад Мануіла Булгака з Магілева, ад беларус. артысты Абрамовіча, ад палякаў Пінскага павету, ад харкаўскіх беларусаў, ад беларусаў 38 ваенна-дарожнага атраду.

Старшыня Камітэту «Прапаганды асноваў новага грамадзянскага строю» докт. Морзаў шчыра прывітаў першы нацыянальны з'езд белар. і прызваў яго к супольнай і згоднай рабоце. Па парадку віталі з'езд і дэлегаты ад розных арганізацый і гурткоў: ад гуртка магілеўскіх беларусоў і педагогаў — Кахановіч, ад петраградскіх студэнтаў — ст. Каравайчык, ад петраградскіх чыноўнікаў-беларусоў пошты і тэлеграфу А. Адамовіч, ад палякоў Аршанскага павету — Гардзялкоўскі, ад рады рабочых і салдацкіх дэпутатаў Петраграда — Жылуновіч.

Таварыш старшыні Мінскага Камітэту п[омачы] а[хвярам] вайны У. Фальскі далажыў кароткі агляд працы беларускага Камітэту, каторы дужа ў дрэнных варунках пры старым урадзе, не маючы грошы павінен быў закрываць адно за другім адкрытыя ўстановы: можна было думаць, што рабоце Камітэту прыходзіць канец. Але ўзышло сонца свабоды, і беларусы падняліся, устанавілі дачасны нацыянальны камітэт, каторы арганізаваў сярод мяшчан і сялян мітынгі, знаёміў вёску з тым, што дзеіцца ў гэтыя часы ў Расеі, прылучаў да сябе прадстаўнікоў ад сялян і мяшчан, зрабіў збор на вольны беларускі друк у Мінску і Бабруйску, склікаў гэты з'езд і разаслаў павесткі на сялянскі з'езд на 4 сакавіка гэтага году. — Даклад аб рабоце петраградскіх беларусоў зрабіў Э. Будзька. Беларускі Камітэт помачы ахвярам вайны ў Петраградзе закладаў бурсы для моладзі беларускай, залажыў швальню і падаваў помач бежанцам грашыма, апраткай і работай. Петраградскія беларусы ўзяліся арганізаваць салдат, работнікаў і вучашчуюся моладзь. Бабруйскі дэлегат Кілчэўскі, прывітаўшы з'езд, далажыў, што яшчэ малады Бабруйскі беларускі гурток ня мог шырока развіць сваей працы, але спадзяецца пры цяперашніх варунках хутка развіцца. Парэчын, дэлегат ад гуртка народных вучыцялёў у Яраславе [Мінскі вучыцельскі інстытут] пад названьнем «Вольная Беларусь», прывітаў з'езд ад вучашчых і вучашчыхся. «Вольная Беларусь» ставіла сваёй мэтай арганізацыю беларусоў-уцекачоў, каб яны на чужбіне не забываліся роднай бацькаўшчыны. — Дэлегат ад Мінскай Рады рабочых і салдацкіх дэпутатаў Кузьміцкі горача і шчыра прывітаў з'езд, прызываючы да супольнай працы. — З вялікай вымовай П. Аляксюк нарысаваў колішнюю светнасьць Беларусі, як яе мову шанавалі пры князёўскіх дварах, як гэта мова была ўрадавай і як пасьля злы лёс загнаў яе ў курныя хаты, скуль яна, здавалася, не выйдзе на свет Божы. Але вось святлейшыя сыны бацькаўшчыны началі будзіць дух народны, але да 1905 году мала знаходзілі адзыву. Прышоў і гэты крывавы год. Ня мала крыві праліпося за народную волю і лепшую долю бацькаўшчыны, і толькі цяпер сонца свабоды ўзышло над бацькаўшчынай, цяпер толькі светлыя яко праменьня далятаюць ва ўсе цёмныя куткі роднай бацькаўшчыны. Шчасьце ў нашых руках і калі цяпер мы яго не здалеем узяць, то каб не было пасьля запозна. — Ад імені Беларускай Сацыялістычнай Грамады выступіў з дэклярацыяй А. Смоліч. Беларуская грамада бароніць клясавыя інтарэсы беларускага сялянства і наагул працоўнай беднаты, бароніць яго нацыянальную душу, бо жыцьцё кожнага народу і яго дабра да найвышэйшых мэтаў павінна ісьці праз нацыянальнае самапазнаньне. — З дэклярацыяй ад Каталіцкай Дэмакратычнай Партыі выступіў ксёндз Гадлеўскі. Мэтай партыі ёсьць першнаперш дабро народу, каторага яна кліча да праўдзівай хрысьціянскай міласьці. Партыя будзе клікаць да згоднага жыцьця з праваслаўнымі братамі беларусамі. Партыя будзе памагаць народу ў яго штодзённай справе, у зямельнай і кожнай рабоце. Партыя хоча падняць прасьветнай [працай] культурнае жыцьцё працоўнай клясы. Але каб народ быў моцны, то ён павінен мець усё сваё: школу, мову, аўтаномію і сваю культуру. — Ад Народнай Дэмакратычнай партыі выступіў Р. Зямкевіч з дэклярацыяй, што партыя найгалаўнейшай сваёй мэтай ставіць прасьвету цёмнага народа. — З дэклярацыяй ад «беспартыйнай групы» выступіў Шарэйка. Вышэй усяго ставіць дабро роднага краю.

Пасьля ўсіх дэклярацый выступіў Член ад рады рабочых дэпутатаў Кузьміцкі, прызываючы пацешыць тых, што гніюць у акопах, хоць прыветнай тэлеграмай і паказаць гэтым, што пойдзем разам з імі.

Усе, дужа ахвотна прыняўшы прэдлажэньне, пастанавілі апрача таго паслаць прывітныя тэлеграмы Часоваму Ураду, Радзе рабочых і салдацкіх дэпутатаў, нацыянальным арганізацыям: украінцам, літвінам і другім. Метлін выступіў з прамовай, што цяпер ня час падымаць нацыянальныя пытаньня, а трэба ўмацаваць атрыманую свабоду, злучыўшыся разам усім для сазваньня Учрэдзіцельнага Сабраньня. Па яго разуменьню, наш рух нацыянальны не натуральны, бо пад ім няма цьвёрдага фундамэнту народных нізоў. — Ад сэрца адказаў яму Заяц, што мы хочам умацаваць атрыманую свабоду ня менш за другіх, што мы будзем згодна працаваць з Часовым Урадам, але казаў, што такое вялікае гасударства, як Расея, ня можа стойка ўтрымацца, калі ня дасьць аўтаноміі народам, каторыя ў ёй жывуць. Праціўніку беларускага руху Метліну няма чаго баяцца, што ў ім няма моцнага фундамэнту, бо большасць тут сабраўшыхся, хоць і не падобны да простых мужыкоў па вопратцы, але выйшлі з нізоў народных, з курных хат, і каму, калі не ім, бараніць беларускай справы. — Жылуновіч, адказваючы Метліну, даводзіў, што свабода тады дарагая, калі народ сам сваімі сіламі яе дабыў. — Дэлегат ад кіеўскіх беларусоў Краскоўскі з вялікім жарам зваў з'езд ня слухаць людзей, што яшчэ прывыклі баяцца «страшных слоў»: свабодная нацыя, фэдэралізм і т. д. Настала часіна, калі нам гэтага баяцца ня трэба, бо народы, вольныя ў сваім развіцьцю, ідуць да вялікай будучыны, да агульналюдскіх ідэалаў і злучэньня. У нацыі і толькі свабоднай нацыі — сіла. — Грамадзянін Цывінскі, раз'ясняючы, чаму на такім фундамэнце стаіць Метлін, даводзіў, што грамадзяніну Метліну не прышлося цярпець усяго таго зьдзеку і няпраўды, што цярпелі другія народы ў царскай Расеі. Дзеля таго нам, беларусам, так і дорага цяпер наша воля, наша нацыянальнае самазнаньне. Цяпер кожны народ можа развівацца пасваему і гэта не перашкаджае нашай шчырай дружбе з другімі народамі — але для вольнага разьвіцьця патрэбна родная мова, родная школа, свае парадкі — патрэбна аўтаномія. — Смоліч прызывае да рэальнай працы. Першнаперш нам трэба нацыянальную школу, каб не былі ні палякамі, ні расейцамі. Каб лепей распрацаваць гэта школьнае пытаньне, трэба выбраць школьную камісію з прадстаўнікоў з'езду. Каб абраіць справу выдаваньня ў найбліжэйшым часе беларускай газэты — трэба выбраць камісію друку. — Краскоўскі, знаючы добра школу, прасіў з'езд абраіць справу арганізацыі школы, бо адраджэньне народу можа ісьці толькі праз школу. Дзеля гэтага трэба арганізаваць з'езды народных вучыцялёў, у семінарыях вучыцельскіх і інстытутах увесьці беларускі народны дух, арганізаваць вучыцельскія курсы, дабівацца, каб унівэрсытэт быў на Белай Русі і адразу залажыць прасьветнае таварыства «Прасьвету», дзеля каторага залажыць нацыянальны фонд. — Адамовіч горача праводзіў тую думку, што цяпер няма часу на другую справу, апрача работы для арганізацыі тылу і падмогі арміі. — Э. Будзька прызываў з'езд выбраць адразу нацыянальны Спаўніцельны Камітэт і прадстаўнікоў, каторыя маюць гаварыць аб нашых думках і пажаданьнях. — Адзін з грамадзян прызываў народнікаў, каб яны агітавалі аб падвозе хлеба для арміі. — Адвакат Чаусаў даводзіў, што беларусы ўжо выраслі і дастойны свайго нацыянальнага самапазнаньня. — Стары сацыяліст грамадзянін Бурбіс занадта горача накінуўся на тых, каторыя кажуць, што цяпер ня час займацца нацыянальнымі справамі; яго яшчэ гарачэй падтрымаў П. Аляксюк, сказаўшы: таварыш старшыні Метлін вялікарус, хоць і высказаўся перад выбарамі, што не раздзяляе нашых думак, ніяк не павінен быў згадзіцца заняць атветнае крэсла таварыша старшыны нашага першага свабоднага з'езду, на каторым мы выказывалі думкі, што цяжкім каменем тамавалі нашу душу. Гэты клік — болі за народную Беларускую справу, дык зразумейце ж вы, чужынцы, нашы перажываньня ў гэты мамэнт. Пасьля гэтага Метлін, відзючы, што ён уносіць у з'езд нейкі дысананс, злажыў з сябе паўнамочые і пакінуў з'езд разам з сваімі староньнікамі.

Быў аб'яўлены перарыў, пасьля каторага былі выбраны камісіі, каб прыгатаваць матэрыялы для абрадаў з'езду на другі дзень.

Камісія агітацыйна-палітычная: сакратар Бурбіс, Кахановіч, Жылуновіч, Аляксюк, Адамовіч, Парэчын, Станкевіч, Вайткевіч, Скірмунт, Шарэйка і Заяц.

Арганізацыйная: да яе, апроч увайшоўшых у першую, прылучыліся з сакратаром Алексюком Смоліч, Лянкоўскі, Багдановіч, Будзька.

Этнаграфічная: сакратар Кахановіч, Зямкевіч і Тарашкевіч.

Школьная: сакратар Тарашкевіч, Краскоўскі, Будзька, Зямкевіч, Сівіцкая[1], Жывіца[2], Лявіцкая[3], Мядзёлка, Лянкоўскі, Смоліч, Кодзіс, Парэчын, Станкевіч і Кастравіцкі.

Фінансавая: сакратар Будзька, Фальскі, Скірмунт, Буйніцкі.

Друку: сакратар Жылуновіч, Зямкевіч, Парэчын, Станкевіч, Мядзёлка, Купала, Галубок, Лявіцкая і Лявіцкі[4].

Земская: сакратар Сталпоўскі, Заяц, Кастравіцкі, Лявіцкі, Шарэйка і Будзька.

(Працяг будзе).

[1] Сівіцкая Людвіка — Зоська Верас.
[2] Жывіца — адзін з псеўданімаў Аляксандра Прушынскага (Алеся Гаруна).
[3] Лявіцкая Ванда — дачка Ядвігіна Ш., потым жонка Язэпа Лёсіка.
[4] Лявіцкі Антон — Ядвігін Ш.

Працяг. Пачатак у №№ 47 і 48.

Падрыхтоўка тэксту, прадмова і каментары А. СІДАРЭВІЧА.

Выходзіў на ніву Сявец...

ЗВЫЧАЙНА, калі гавораць аб уплыве Вялікага Кастрычніка на жыццё беларускага народа, згадваюць, якімі паскоранымі тэмпамі ў першыя гады Савецкай улады пачалі развівацца нацыянальная літаратура, мастацтва, тэатр. Канечне ж, рэвалюцыя абудзіла таленты, найперш дзяцей учарашніх беззямельных і малазямельных сялян, што дагэтуль проста не мелі магчымасці вучыцца, авалодваць ведамі.

Аднак будзем справядлівымі, нельга прыніжаць, прымяншаць і таго, што адбывалася на самым пачатку стагоддзя. Тут сама прыслухацца да думкі А. Лойкі, выказанай у яго «Гісторыі беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд»: «...адной з самых агульных заканамернасцей развіцця літаратуры пачатку XX стагоддзя быў масавы прыток у яе творчых сіл, абумоўлены ўздымным характарам агульнакультурнай атмасферы ў краіне пасля 1905 г. Гэты прыток даў беларускай літаратуры першую хвалю так званай масавай паэзіі, ды і прозы... Па ідэйным гучанні гэта была перш за ўсё агульнадэмакратычная, народная літаратура».

Адным з прадстаўнікоў яе і з'яўляўся М. Ландыш. Напісаў гэты псеўданім і адразу падумаў: «А ці гаворыць ён нешта сучаснаму чытачу?». Ды, бадай, нічога. Пра гэтага аўтара толькі мімаходзь згадвае ў той жа «Гісторыі...» А. Лойка, праўда, чамусьці сам псеўданім не расшыфроўвае. М. Ландыша не сустрэнеш ў анталагічным выданні «Беларуская дакастрычніцкая паэзія», складзеным В. Барысенкам і выпушчаным яшчэ ў 1967 годзе. Марна шукаць гэты псеўданім і ў «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», хоць, здавалася б, у яе другім томе ён абавязкова павінен быў згадвацца. Не ў якім-небудзь артыкуле, а ў тым, што дае асноўныя звесткі з жыццёвага, навуковага і творчага шляху ... Міхася Ганчарыка. Таго самага М. Ганчарыка — вядомага беларускага вучонага, члена-карэспандэнта Акадэміі навук БССР, доктара біялагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР. М. Ганчарык займаўся не толькі даследаваннямі ў галіне фізіялогіі раслін, але і пісаў вершы, літаратурнакрытычныя артыкулы, успаміны пра беларускіх пісьменнікаў, з якімі яму даводзілася сустракацца ў розныя гады. Жыццё яго было багатае на падзеі, толькі некалькі гадоў не дацягнуў ён да 90-годдзя.

Артыкулы і ўспаміны падпісваў сапраўдным прозвішчам. Вершы ж у газетах «Вольная Беларусь», «Беларусь», «Савецкая Беларусь», часопісе «Аршанскі маладняк» і іншых выданнях друкаваў пад псеўданімам Я. Сявец.

Але пры чым тут М. Ландыш? Аказваецца, і М. Ландыш (а таксама «Ландыш»), і Я. Сявец, і М. Ганчарык—адна і тая ж асоба. Калі ў «ЭЛІМБеле» толькі называецца, што М. Ганчарык з першымі сваімі вершамі выступіў у 1914 годзе на старонках «Нашай Нівы», дык у кнізе «Максім Гарэцкі. Успаміны, артыкулы, дакументы», якая пабачыла свет у 1984 годзе, аўтар бібліяграфічнага паказальніка і каментарыя Я. Саламевіч больш канкрэтны, калі прыводзіць звесткі пра М. Ганчарыка: «Першыя вершы апублікаваў у 1914 г. у газеце «Наша Ніва» пад псеўданімам «Ландыш».

Менавіта гэтыя творы меў на ўвазе і А. Лойка, калі згадваў Ландыша, як аднаго з прадстаўнікоў масавай беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя. Змешчаны яны ў «Нашай Ніве» ледзь не адзін за адным. «Араты»—ў 18 нумары, які выйшаў 8 мая 1914 года, «Хмара» прыйшла да чытача ў 20 нумары за 22 мая... На фоне іншых паэтычных публікацый — друкаваліся, як вядома, і Янка Купала, і Якуб Колас, і М. Багдановіч, і Змітрок Бядуля, і М. Арол — не сказаць, каб гэтыя творы (першы падпісаны «М. Ландыш», другі — проста «Ландыш») надта вылучаліся. Аднак сярод іншых вершаў яны не губляюцца, бо напісаны, калі можна так сказаць, прыстойна, у рэчышчы тагачасных накірункаў і пошукаў літаратуры.

У «Аратым» М. Ландыш паказаў абяздоленага беларускага селяніна, вядомага па творах іншых аўтараў:

З гора спяваючы песню
маркотную,
Лейцы ў руках мазалістых
трымаючы,
Ціха ідзе ён за сошкай
сагнуўшыся,
Долю сваю тут у полі шукаючы.

«Песня маркотная», «рукі мазалістыя», «за сошкай сагнуўшыся» — так пісалі ўжо і да М. Ландыша, але, між іншым, у такім кірунку працягвалі яшчэ доўга пісаць і пазней. І справа зусім не ў тым, як гэта можа спачатку падацца, што аўтары, гэтаксама, як М. Ландыш, не маглі сягнуць далей звыклых вобразаў, якія паступова ператвараліся ледзь не ў паэтычную схему.

Вытлумачэнне ў іншым. Няварта забываць, які гэта быў час. Саміх абставін, калі да газеты, да друкаванага слова пацягнуўся малапісьменны беларускі мужык, паэзія, каб заставацца выразнікам народных дум, імкненняў і спадзяванняў, не магла не прымаць пад увагу. Іншая справа, што і пазней, калі гэты самы чытач, так сказаць, вырас, асобныя аўтары, на жаль, так і не змаглі ўзняцца на значна больш высокую мастакоўскую планку.

Няцяжка ўявіць, як дзе-небудзь у глухой вёсцы, куды выпадкова трапляла «Наша Ніва», сяляне, прыслухоўваючыся да голасу свайго грамацея, слухалі і гэты верш М. Ландыша. Слухалі і ў знак згоды ківалі галовамі. Маўляў, быццам пра нас сказана, усё праўдзіва:

Конік старэнькі чуць цягне
дрыжачую
Матку-карміцельніцу, сошку
драўляную,
Сам жа араты наш ею кіруючы,
Шчыра ўзрыхляе зямельку
жаданую.

Далей у вершы, як слушна заўважыў А. Лойка, гэтаксама «агульнатыпалагічныя, як у Купалы, фігуры аратага з «сошкай крывенькаю», касца з «коскай сталёвай»:

З горкай нудою нідзе
не расстаўшыся,
Шчасця век цэлы у полі
шукаючы,
З сошкай крывенькаю, з коскай
сталёваю
Ходзіць, марнеіць, свой пот
выліваючы.

У другім жа вершы «Хмара», як правільна зазначае А. Лойка, відавочна «купалаўская інтанацыя» і адначасова «перайманне Коласавай манеры выяўляць з'явы прыроды»:

Цягнецца па небе
Хмара дажджавая,
Цёмнай паласою
Усю шыр закрывае.

Завяршэнне твора па інтанацыі не розніцца ад яго пачатку. Сацыяльныя матывы ў вершы цалкам адсутнічаюць, хоць, здавалася б, аўтар захоча праз прыродную стыхію перадаць і жыццё народа. Але на гэты раз перад ім стаяла зусім іншая задача і з ёй М. Ландыш паспяхова справіўся, стварыўшы пераканаўчыя малюнкі навальніцы. Праўда, не стрымаўся, паказаў і хлапчука, які вымушаны перачакаць дождж:

Пастушок на полі
Пад ёлку схаваўся,
А дожджык на волі
Добра разгуляўся.

Ці не сябе меў на ўвазе малады паэт, калі пісаў гэтыя радкі. Як-ніяк, а яму на той час споўнілася толькі пятнаццаць гадоў, даводзілася дапамагаць бацькам па хатняй гаспадарцы, рабіць розную работу, у тым ліку і пасвіць жывёлу.

М. Ганчарык нарадзіўся 12 (24) лістапада 1899 года ў вёсцы Кляннік (цяпер Смалявіцкі раён). Гэта, як успамінаў ён пазней, «глухі куток... на паўночнай частцы Ігуменшчыны, на яе стыку з Барысаўшчынай». І працягваў: «той куток Беларусі, Верхменская воласць Ігуменскага павета, куды ў пакаранне за сваю рэвалюцыйную дзейнасць быў сасланы настаўнічаць Якуб Колас».

Пра тое, што гэта быў менавіта Якуб Колас, даведаўся М. Ганчарык, праўда, значна пазней. Тады ж, у маленстве, ён рана адкрыў для сябе чароўную вабнасць роднага слова, далучыўшыся да беларускай газеты, кнігі. Як прыгадваў Міхась Мікалаевіч, аб «існаванні беларускага друкаванага слова, а таксама пра пісьменнікаў, якія пісалі на роднай мове», ён пачуў недзе ў пачатку 1907 года. Вяскоўцы ведалі, што верхменскі настаўнік Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч выпісвае газеты, у тым ліку і іх, «мужыцкую». Адзін з нумароў «Нашай Нівы» неўзабаве нейкім чынам трапіў і ў хату да Ганчарыкаў.

Старэйшы Міхасёў брат Алесь быў, як на вёсцы казалі, ладны грамацей. Вечарамі, найчасцей зімой, калі работы па хатняй гаспадарцы менела, прысеўшы ля цёплай печы, ён наладжваў своеасаблівыя хатнія чытанні, на якіх прысутнічалі не толькі яго сёстры, браты, бацька і маці, але і суседзі, якія ўжо добра ведалі пра такія чыткі. Не без захадаў Алеся сям'я хутка пачала атрымліваць «Нашу Ніву», купляць кнігі.

Асабліва даспадобы прыйшлася Міхасю купалаўская «Жалейка», па некалькі разоў перачытваў і зборнік «Шляхам жыцця», а таксама «Песні-жальбы» Якуба Коласа. Любіў творы М. Багдановіча, М. Гарэцкага, Ц. Гартнага, З. Бядулі... Адным словам, рана навучыўшыся чытаць, М. Ганчарык стаў у роднай вёсцы адным з самых заўзятых аматараў кнігі. Не развітаўся з ёй і тады, калі апынуўся ў арміі. У 1917 годзе працаваў у салдацкай краме Усесаюзнага земскага саюза, якая знаходзілася ў мястэчку Ярэмічы, жыва цікавіўся падзеямі. Калі пачуў, што ў Менску пачала выходзіць газета «Вольная Беларусь», паслаў у рэдакцыю некалькі карэспандэнцкый, а таксама адзін верш, які быў змешчаны ў 33 нумары за той жа 1917 год.

Юнака даўно не пакідала мара—паступіць у Горацкую сельскагаспадарчую школу. Пры першай жа магчымасці разлічыўся ў краме, паехаў у Менск, а там паспяшаўся ў рэдакцыю газеты «Вольная Беларусь», дзе ўпершыню ўбачыў Якуба Коласа і Цішку Гартнага, якіх дагэтуль ведаў толькі па творах. Магчымасць пагаварыць з «жывымі» пісьменнікамі акрыліла, надала яшчэ большай упэўненасці ў тым, што знаходзіцца на правільным шляху. М. Ганчарык марыў аб прафесіі агранома, хацеў вярнуцца ў вёску адукаваным чалавекам, каб ладзіць новае жыццё. А тут яшчэ Цішка Гартны прапанаваў пабываць на з'ездзе «Беларускіх партый і арганізацый», які якраз распачаў работу. Па дарозе ў кінатэатр «Гігант», дзе сабраліся дэлегаты, вядомы ўжо літаратар, грамадскі дзеяч і пачынаючы паэт, юнак, па сутнасці пакуль што без пэўных заняткаў, гаварылі нароўных, быццам былі даўнімі знаёмымі, неаднойчы сустракаліся.

І з'езд, і начлег разам з Ц. Гартным на гарышчы аднаго з двухпавярховых будынкаў, дзе размясціліся нанач дэлегаты з'езда, і спрэчкі, якія вяліся між імі ледзь не да самай раніцы, развагі аб тым, якой быць новай Беларусі — усё гэта запомнілася М. Ганчарыку. І не на месяц, не на два, не на год... Гэтыя ўражанні ён пранёс праз усё жыццё. На схіле яго, калі настане пара падрахункаў, М. Ганчарык напіша ўспаміны пра Ц. Гартнага. З'явяцца і ўспаміны пра Янку Купалу, Максіма Гарэцкага, Канстанцыю Буйло... Лёс падорыць яму яшчэ нямала запамінальных сустрэч, ды гэтая першая...

Колькі тыдняў правёў у родным Клянніку. Хацеў крыху адпачыць, ды які адпачынак, калі вымушаны быў каторы ўжо раз перагортваць старонкі падручнікаў, рыхтавацца да паступлення ў сельскагаспадарчую школу. Нарэшце—у жніўні 1917 года ўступныя экзамены. Сярод іншых і іспыт па беларускай літаратуры. Тыя, хто праводзіў яго, былі прыемна здзіўлены. Сарамяжы юнак з вёскі, а такія глыбокія веды. Яшчэ больш здзівіліся, калі М. Ганчарык прызнаўся, што сустракаўся з Якубам Коласам і Цішкам Гартным. І ўжо не было мяжы здзіўлення, калі юнак на памяць прачытаў верш Янкі Купалы «Пашкадуй мужыка»:

Пашкадуй мужыка-бедака,
Ты, што вечна адзеты і сыт,
Пашкадуй—не адсохне рука,
Бо яму свет да шчасця
закрыты.

Як быццам і пра сябе самога расказвае М. Ганчарык, пра мужыцкага сына, які тарыў першую сцяжыну ў краіну ведаў. Прымаць ці не прымаць М. Ганчарыка ў сельскагаспадарчую школу, сумнення не было. З настойлівасцю ўзяўся за вучобу, зазіраючы наперад, бачачы сябе аграномам.

Праўда, вучоба ў Горацкай сельскагаспадарчай школе для М. Ганчарыка зацягнулася. Прычына таму — няўстойлівасць палітычнага становішча ў тагачаснай Беларусі. Ужо ў лютым 1918 года навучэнцаў распусцілі па хатах ажно да летняй практыкі, да 1 мая, бо тугавата было з прадуктамі. У час чарговых канікулаў, калі адпачываў у бацькоў, пачалася белапольская акупацыя. У Горкі вярнуўся толькі ў другой палове 1920 года, пасля выгнання акупантаў.

Вучоба працягвалася. Першае захапленне беларускай літаратурай, якое М. Ганчарык перажыў у маленстве, перарастала ў любоў да яе. У школе быў створаны клуб, куды рэгулярна дастаўляліся беларускія газеты і часопісы. Да ўсяго М. Ганчарык пазнаёміўся з Г. Гарэцкім, які вучыўся тут жа, у Горках, толькі ў каморніцка-агранамічным вучылішчы.

Пасля сельскагаспадарчай школы была вучоба ў Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце. М. Ганчарык дня пражыць не мог, каб нешта не прачытаць з кніжных навінак. Уважліва сачыў за ўсім, што з'яўлялася з-пад пяра М. Гарэцкага, пра якога шмат расказваў яго брат Гаўрыла, з якім і сам паспеў пазнаёміцца. Ва ўспамінах пра М. Гарэцкага «Даўняе, роднае» зазначаў: «Калі з'явілася кніжачка апавяданняў Максіма Гарэцкага «Рунь», памятаю, я не мог адарвацца ад чытання... Якая прыгожая, мілагучная мова... Нібы нейкі выдатны чараўнік расчыняў перада мной дзверы ў іншы свет, у якім жыве такі выразны неспакой за лёс, за будучыню радзімай старонкі, за прыгнечанага, абяздоленага беларускага селяніна».

Сапраўды, уражанняў ад прачытанага было шмат. Думкамі хацелася падзяліцца з аднакурснікамі. Навучэнцы школы, студэнты інстытута збіраліся па вечарах, наладжвалі дыспуты, чытацкія канферэнцыі. Многія самі спрабавалі пісаць, а то і друкаваліся ў газетах, часопісах. Дарэчы, у той час у Горках былі і свае выданні—часопісы «Дни нашей жизни», «Город революционного студенчества»... У іх змяшчаліся не толькі артыкулы навуковага характару, а і мастацкія творы.

У гэтыя часопісы прапаноўваў свае творы і М. Ганчарык. Пераважна апяваў хараство прыроды, яе абуджэнне, праводзячы паралель да тагачаснага жыцця. Скажам, у вершы «Зноў вясна»:

Зноў вясна атуліла прыроду
Спевам сонечным, жвавасцю
хваль,
І гуляннем жыцця карагоду,
І агнём пазалочаных даль.

М. Ганчарыку адкрываліся бясконцыя «шляхі-дарогі, што чаруюць і вабяць сабой». Адначасова ён заклікаў: «За сяўбу пад загонамі ўзяцца—заўраджаіць і ніву, і гаць».

Вучоба тым часам набліжалася да завяршэння, паўставала пытанне аб тым, дзе працаваць. М. Ганчарык, як чалавек, які праявіў ужо арганізатарскія здольнасці, быў накіраваны ў Аршанскі акруговы аддзел народнай адукацыі. Яго прызначылі загадчыкам. К гэтаму часу акрэслілася ўжо і кола чыста навуковых інтарэсаў. Яшчэ ў 1920 годзе М. Ганчарык пачаў вывучаць мясцовыя назвы раслін. Захапленне гэтае не прайшло бясследна.

З цягам часу з'яўляліся ўсё новыя і новыя запісы, пакрысе ствараўся слоўнік. Яшчэ пазней нарадзіўся лаціна-руска-беларускі слоўнік назваў раслін, што выйшаў у свет у выдавецтве «Навука і тэхніка» ў 1966 годзе. Давялося М. Ганчарыку прымаць удзел і ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы, якая працавала ў Маскве ў 1923 годзе. Спачатку рыхтаваў беларускі павільён, а калі экспазіцыя адкрылася, стаў экскурсаводам. Да ўсяго заняўся анкетаваннем сельскіх гаспадарак Міншчыны, каб лепей вывучыць тэхналогію гаспадарання ў іх.

Па-ранейшаму не адпускала літаратура. Балазе, у тагачаснай Оршы панавала па-сапраўднаму творчая атмасфера. Даведаўшыся, што ў Менску ўзнікла літаратурная арганізацыя «Маладняк», мясцовыя пачаткоўцы пры ўдзеле Кандрата Крапівы і Уладзіміра Дубоўкі недзе ў маі 1925 года

стварылі яе філію. Адным з першых напісаў заяву М. Ганчарык. Аршанскія літаратары пад кіраўніцтвам М. Ганчарыка, які ўзначаліў філію, цікавіліся літаратурным жыццём, абмяркоўвалі яго надзённыя праблемы, не абміналі тэарэтычных пытанняў.

Філія мела свае студыі не толькі ў Оршы, але і ў Горках, а таксама ў Мсціславе. І цэнтр яе неўзабаве перамясціўся ў Горкі. Па-першае, сам М. Ганчарык пачаў працаваць асістэнтам на кафедры раслін Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, што ўзнікла на базе мясцовага інстытута, а па-другое, што таксама вельмі важна, у акадэміі сабралася нямала людзей, літаратура для якіх стала прызваннем. З 1 лютага 1926 года загадчыкам кафедры беларускай мовы і літаратуры быў прызначаны М. Гарэцкі. На гэтай жа кафедры працавалі Паўлінна Мядзёлка, нядаўні выпускнік Літаратурнага інстытута імя Валерыя Брусава ў Маскве Юрка Гаўрук, знаёмы М. Ганчарыка яшчэ па вучобе ў агранамічна-каморніцкай школе Навум Сапранкоў. Усе яны з'яўляліся актыўнымі сябрамі «Аршанскага маладняка».

Пра тую часіну ў М. Ганчарыка засталіся самыя светлыя ўспаміны: «Але было асабліва важным тое, што загадчык кафедры Максім Гарэцкі аказваў заўсёды добразычлівую і аўтарытэтную дапамогу «маладнякоўцам» філіі. Ці гэта былі прыватныя звароты да яго за парадамі паасобным сябрам маладнякоўцам, ці гэта была дапамога шырокай грамадскай працы філіі, Максім Гарэцкі заўсёды з вялікай прыемнасцю ішоў на дапамогу нам. Асабліва быў карысным яго ўдзел у літаратурных вечарах, якія наладжваліся маладнякоўцамі, і пры калектыўных разглядах творчасці паасобных сяброў філіі». Сябрамі філіі з'яўляліся Тодар Кляшторны, Васіль Каваль, Алесь Вечар, Юлій Таўбін і іншыя.

З аднаго боку, быў вопытны і аўтарытэтны настаўнік, а з другога — удзячныя вучні-літаратары. Студыйцы жылі актыўнай творчай дзейнасцю. У прыватнасці, захаваліся планы работы Горацкай студыі на 1926—1927 гады. У іх чытаем: «Вывучаць літаратуру з боку філасофскага, зачым лічыць неабходным вывучэнне той часткі матэрыялістычнай філасофіі, якая гаворыць аб ёй. Утвараць разгляд некаторых твораў арыгіналамі на нямецкай і па групе славянскіх моў з мэтай разумення і большага іх вывучэння, прычым ўвесці ў практыку мастацкія пераклады з навейшых чужаземных мастакоў слова на тыя творы, якія будуць разглядацца на сходах».

Сходы праходзілі бурна. Заслухоўваліся і такія даклады, як «Проза і віды прозы», «Аб стылістыцы», з якімі выступіў Ю. Гаўрук. А. Вечар зрабіў даклад «Сімвалізм». Студыйцы абмяркоўвалі творы «Пачуцці» Кузьмы Чорнага, «Голы звер» Міхася Зарэцкага, «На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага і іншыя.

Творчай трыбунай для маладнякоўцаў стаў часопіс «Аршанскі маладняк». Выйшла сем нумароў часопіса (два ў 1925, тры ў 1926, па адным у 1927 і 1928 гадах). Адным з самых актыўных аўтараў «Аршанскага маладняка» быў М. Ганчарык, прычым часта выступаў з некалькімі матэрыяламі.

Вось першы нумар. Па ўсім відаць, рукой кіраўніка філіі напісаны зварот да чытача «Ад рэдакцыі», у якім літаратары-пачаткоўцы дэкларуюць планы, ставяць задачы. Тут жа апублікаваны верш М. Ганчарыка «Усміхаючыся сонцу ў вочы», вытрыманы ў фальклорных традыцыях:

Запазнілася, заспалася дзяўчына
Пасля песні майскай запаўночы,
На паранкі ў поле гналася з скацінай,
Усміхаючыся сонцу ў вочы.

Верш падпісаны псеўданімам «Я. Сявец». А вось пад артыкулам «Аб творчасці Максіма Багдановіча», прымеркаваным да восьмай гадавіны з дня смерці паэта, стаіць уласнае прозвішча М. Ганчарыка. Артыкул цікавы, ён дае ўяўленне аб стаўленні аршанскіх маладнякоўцаў да спадчыны класіка нацыянальнай літаратуры. М. Ганчарык не пагаджаўся з тымі, хто бачыў у асобе М. Багдановіча толькі «песняра вялікай прыгажосці і натхнення». На яго думку, «як надзвычай здольны паэт і энергічны працаўнік на ніве беларускага адраджэння нашаніўскай пары, Багдановіч безумоўна не мог у сваіх творах не адбіць і не выявіць тыя настроі, тыя імкненні, якія панавалі тады сярод беларускіх адраджэнцаў, значыць, не мог абмежавацца выяўленнем у сваёй творчасці толькі адной статыкі, а павінен быў як грунт, як аснову сваіх твораў, даць дынаміку акаляючага яго жыцця. І ўсе яго творы, гэта высокамастацкі, прыгожы пэрл, агульны змест якіх кіпучае змаганне, у якім і згарэў сам паэт».

У другім нумары «Аршанскага маладняка» М. Ганчарык змясціў нататкі «З падарожжа па Украіне». Праўда, у іх чыста эмацыянальнае пераважае над аналітычным.

У гэтым жа нумары, а таксама ў трэцім М. Ганчарык выступіў і як паэт. Працягваў ён займацца і крытычнай дзейнасцю. З чацвёртага нумара ў «Аршанскім маладняку» з'явіўся пастаянны раздзел бібліяграфіі, у якім рэцэнзаваліся кнігі маладых аўтараў, у першую чаргу, зразумела, саміх маладнякоўцаў. З артыкуламі, рэцэнзіямі выступалі М. Ганчарык, Ю. Гаўрук і сябра філіі Уладзіслаў Прыбыткоўскі, які таксама спрабаваў свае творчыя сілы і ў паэзіі, друкаваўся на старонках часопісаў «Маладняк» і «Аршанскі маладняк».

Найбольш поўнае ўяўленне аб Ганчарыку-крытыку дае артыкул «Маладая сучаснасць» з падзагалоўкам «Аб нашай крытыцы», змешчаны ў шостым нумары «Аршанскага маладняка». Назва гэтай публікацыі не арыгінальная. З падобным артыкулам у трэцім нумары часопіса «Маладняк» за 1927 год выступіў Я. Калядны, робячы «крытычны агляд часопісаў і зборнікаў філій «Маладняка». Артыкул у Я. Каляднага атрымаўся вострым, палемічным, перапала ў ім і аршанскім маладнякоўцам. Не будзем, аднак, унікаць у змест палемікі Я. Каляднага і М. Ганчарыка. Не абышлося без перахлёстаў, навешвання ярлыкоў і ў самога М. Ганчарыка. Але, чытаючы яго артыкул, нельга не заўважыць і таго, што ён здолеў пайсці далей прыватнага выпадку, задумаўся аб задачах мастацкай крытыкі, аб сумленнасці і прынцыповасці як важнейшай перадумове сапраўднай крытыкі.

Бурліла творчае жыццё ў Оршы, Горках. Уяўленне аб гэтым даюць і матэрыялы, што публікаваліся ў «Аршанскім маладняку» пад рубрыкай «Хроніка». Напрыклад, 12 лютага 1928 года (з гэтага месяца філію ўзначальваў Алесь Вечар) у Горках прайшла акруговая канферэнцыя Аршанскай філіі «Маладняка» сумесна з прадстаўнікамі літаратурных студый Мсціслава, Оршы і Горак, на якой прысутнічала 19 дэлегатаў. Прыкладна ў гэты час (са снежня 1927 года) у Оршы пачаў працаваць літаратурны гурток: «ставяцца даклады... робяцца разгляды сваіх твораў, выпраўляюцца памылкі таварыскай самакрытыкай».

Дзве студыі працавалі і ў Горках — у сельскагаспадарчай акадэміі і на агульнаадукацыйных курсах.

Аднак ужо праз год-другі літаратурнае жыццё, такое актыўнае ў сярэдзіне дваццатых гадоў, у гэтым рэгіёне паступова пачало затухаць. Сказалася, безумоўна, і тое, што неўзабаве «Маладняк», як літаратурная арганізацыя, перастаў існаваць. Некаторыя яго сябры, праўда, уліліся ў Беларускую Асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў, ды ўжо гэта былі не тыя задзірыстыя юнакі, гатовыя перайначыць ледзь не ўвесь свет, стварыць сваю літаратуру. Большасць жа тых, хто групаваўся ў Горацкай студыі, ўвогуле пакінулі гарадок, выехалі ў іншыя гарады—хто на вучобу, а хто на працу.

У Менску апынуўся і М. Ганчарык, пачаўшы ў 1929 годзе загадваць кафедрай батанікі ў Акадэміі навук БССР. Гэта, можна сказаць, і вызначыла яго далейшы лёс. М. Ганчарык цалкам аддаўся навуковай дзейнасці. Ужо ў 1931 годзе ён намеснік дырэктара Інстытута біялогіі, яшчэ праз два гады па сумяшчальніцтве ўзначаліў кафедру батанікі і фізіялогіі раслін у Беларускім інстытуце садоўніцтва і агародніцтва ў Лошыцы, стаў прафесарам.

Даследчыцкія клопаты цалкам забіралі час, таму было не да вершаў, тым больш да літаратурна-крытычных артыкулаў. А тут яшчэ чорны цень сталінізму. Арыштавалі М. Ганчарыка з традыцыйным абвінавачаннем «вораг народа» ў трыццаць шостым, асудзілі на сем гадоў катаргі. Гэтыя сем гадоў сталі адзінаццаццю. Вызваліўся толькі ў 1947 годзе, а праз год зноў арышт. Да ранейшых абвінавачанняў дабавілася яшчэ больш неверагоднае. Маўляў, М. Ганчарык пры закладцы Батанічнага саду ў Мінску невыпадкова зрабіў так, каб алеі ад цэнтра разыходзіліся сіметрычна. Гэта ж ні што іншае, як знак фашысцкім самалётам для бамбардзіроўкі горада...

Чарговы прыгавор — дзесяць гадоў, высылка ў Ігарку. Рэабілітавалі ў 1954 годзе. Тагачасны прэзідэнт Акадэміі навук БССР В. Купрэвіч дапамог уладкавацца ў Інстытут біялогіі... М. Ганчарык апублікаваў дзесяткі навуковых прац, падрыхтаваў 16 кандыдатаў навук, тры з якіх сталі дактарамі навук... А літаратура... Не да літаратуры зноў было. Нават тыя, хто сустракаўся з Міхасём Мікалаевічам неаднойчы, лічыўся яго вучнем, не ведалі, што ў маладосці ён пісаў вершы, друкаваўся. Пра свае ж сустрэчы з пісьменнікамі М. Ганчарык расказваў ахвотна. Асабліва ганарыўся, што добра ведаў Янку Купалу, з якім пазнаёміўся яшчэ ў час Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўкі, дзякуючы Канстанцыі Буйло. Неаднаразова сустракаўся з народным песняром, нават дапамагаў яму парадамі ў вырошчванні кветак.

...«Камуніст і маладняковец, беларускі дзеяч яшчэ з нашаніўскіх часоў»—так ахарактарызаваў М. Ганчарыка ў сваёй вядомай працы «Маладняк» за пяць гадоў» М. Гарэцкі. Сціпла як быццам сказана, ды толькі прыгадайма, як шмат значылі падобныя беларускія дзеячы ў часы, калі ўсё беларускае заваёўвала сабе права на жыццё. Таму і не павінны мы забываць ўспамінаць добрым словам не толькі выдатнага вучонага Міхася Ганчарыка, але і Ганчарыка-літаратара, таго Сяўца, хто сеяў на ніве нацыянальнага адраджэння і свае зярняты

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

Міхась ГАНЧАРЫК пасля вяртання на Беларусь. Каля 1957 года.
Фота з архіва.

ЧАЛАВЕКУ І НАРОДУ

(Пачатак на стар. 2—3).

дзі, і таму з'яўляюцца высакародным набыткам і помнікам агульначалавечай духоўнай культуры.

Палітычная крывадушнасць— найцяжэйшая хвароба дзяржаўных вярхоў любой сістэмы. Яна здольная выклікаць поўную дэградацыю самых светлых ідэалаў і памкненняў, самых высакародных рэвалюцыйных актаў і тэорый. У нашай краіне ад імя сацыялізму тварыўся антысацыялізм, ад імя інтэрнацыяналізму — шавіністычны імперскі антыінтэрнацыяналізм, ад імя дэмакратыі працоўных — замшэлая сярэднявечная дэспатыя, ад імя пралетарскага гуманізму — арганізаванае масавае чалавеканенавісніцтва. Карацей: ад імя камунізму — звычайны таталітарызм і інтыкамунізм. У выніку ад імя не такіх ужо благіх (па тых змрочных часах) канстытуцый тварылася непрыхаваная наглая антыканстытуцыйнасць: грамадзянскае права падмянялася здзіўляючым сваім цынізмам абсалютным правам эліты і звышэліты, гэткім жа абсалютным бяспраўем працоўных. Пры гэтым ніяк не можна пагадзіцца з тымі, хто даводзіць, што ўвогуле не было ў нас і няма ніякіх правоў чалавека. Не. Яны былі. Яны ёсць. Але гранічна і свядома збедненыя, гранічна і свядома ўрэзаныя, гранічна і свядома ігнаруемыя нават у сваім жабрацкім стане. Нездарма ж ініцыятар перабудовы М. С. Гарбачоў, выказваючыся наконт задачы партыі ў гэтай галіне, ужывае паняцце «ўзбагачэнне» правоў чалавека. Ды не толькі аб узбагачэнні трэба сёння дбаць нам. А зноў жа — аб адраджэнні.

З пачаткам перабудовы бадай упершыню ў пасляленінскі перыяд з вуснаў вышэйшай партыйнай асобы ў станоўчай інтэрпрэтацыі прагучала паняцце ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА, упершыню ў афіцыйных дакументах вышэйшых партыйных інстанцый — XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, XXVIII з'езда КПСС — з'явіліся раздзелы, прысвечаныя гэтай карэннай праблеме грамадскага жыцця. Але нягледзячы на такую перамену, правы чалавека і народаў па-ранейшаму застаюцца ў нашай краіне пад пагрозай: партыйна - дзяржаўны таталітарызм і кансерватызм, як навейшая разнастайнасць яго ідэалогіі, псіхалогіі і маралі, вельмі неахвотна пакідаюць авансцэну палітычнага жыцця.

Ці не таму, грэбліва ігнаруючы найгалоўнейшае з фундаментальных правоў чалавека— права на жыццё (што ў нашай пачварнай сістэме не робіцца без санкцыі вышэйшай палітычнай эліты і яе першай асобы?), ад усіх нас хаваюць галоўную праўду і неабходнасць: ратуючы забруджаныя рэгіёны ад маруднай смерці, мы павінны сёння сканцэнтраваць усе намаганні, каб выратаваць ад раптоўнай выбуховай чарнобыльскай смерці і сябе, і ўсю Еўропу* ад Атлантыкі да Урала?.. Сусветная прэса з нарастаннем даводзіць думку: Чарнобыльская АЭС у яе сённяшнім стане — на мяжы апошняй, канчатковай катастрофы.

Ці не таму, груба адкідаючы палітычныя правы чалавека і свае ўласныя ідэйна-палітычныя сентэнцыі аб неабходнасці актыўнага ўдзелу ў палітычным працэсе працоўных мас, парушаючы ўсе нормы нават брэжнеўскай канстытуцыі ды спараджаючы тым самым і левы, і правы экстрэмізм, вышэйшая і высокая эліта КПСС на працягу пяці год перабудовы люта бараніла сваю палітычную манаполію не толькі ад шматлікіх дэмакратычных рухаў і арганізацый, але і ад роднага рабочага класа?.. Бо толькі так і не іначай я разумею той факт, што рабочыя менш за ўсё прадстаўлены сёння ў Вярхоўным Савеце СССР і БССР, дзе ПАДАЎЛЯЮЧУЮ большасць трывала ўтрымліваюць менавіта парт-дзярж-гаспадарчыя функцыянеры. Бо толькі так і не іначай я разумею той факт, што пад прапагандысцкую балбатню аб «уладзе партыйных мас» у абноўленай партыі рабочыя менш за ўсё былі абраныя дэлегатамі на «судьбоносный» XXVIII з'езд КПСС і на «звышдэмакратычны» XXXI з'езд КПБ. Партыйная эліта, дамагаючыся рэалізацыі палітычных правоў толькі для сябе, даўно здрадзіла сацыяльным вытокам КПСС — яго вялікасці рабочаму класу краіны. Зараз гэта відаць няўзброеным вокам. Далей. Ці не таму асаблівую раз'юшанасць выклікае ў кансерватыўнай эліты найпершае палітычнае і грамадзянскае права — права народаў і чалавека на палітычнае і эканамічнае самавызначэнне, як вынік — ПРАВА НА ДЗЯРЖАЎНЫ СУВЕРЭНІТЭТ? З'едлівае выслоўе «парад суверэнітэтаў» — не проста неасцярожная гульня слоў, гэта адлюстраванне пэўнай таталітарысцкай, імперскай тэндэнцыі.

Ці не таму, дэкларуючы эканамічныя і сацыяльныя правы працоўных як прыярытэтныя ў грамадстве, партыйна - дзяржаўная эліта працягвае палітыку эксплуатацыі прадпрыемстваў, калгасаў, устаноў духоўнай вытворчасці, выкачваючы з іх абсалютную долю прыбыткаў у казну, пакідаючы абражаючыя капейкі на «сацкультбыт»? Ці не таму ў абставінах катастрафічнага зніжэння матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва, яна раптоўна, не пытаючы ні ў кога ні парады, ні дазволу амаль удвая павысіла сабе зарплату ды намёртва ўчапілася за свае шляхецкія прывілеі? Ці не таму сёлета, нягледзячы на рэкордныя ўраджаі, на «парадку дня» ў шматлікіх рэгіёнах — зімова-вясенні голад?

І нарэшце. Ці не з прычыны моцнага атавізму дэспатыі і бяспраўя, нягледзячы на пяць год быццам бы перабудовы, ідэйна-палітычнага гладзіятарства ды палітычна-прававога цырку, у краіне не працуюць законы — галоўны дэмакратычны сродак рэалізацыі, аховы ды абароны правоў чалавека і народаў? Ды і як яны могуць быць паспяхова абаронены, калі амаль не існуе механізму аховы правоў чалавека ды дзейснага кантролю за абавязкамі дзяржавы ў дачыненні да грамадзян? Гэта ў той самы час, калі на ахове правоў дзяржавы і татальнага кантролю за абавязкамі грамадзян стаіць усемагутны механізм у выглядзе арміі, КДБ, Мінюста, суда, пракуратуры?.. Якім чынам правы чалавека і народаў могуць быць абаронены, калі ў структуры новай, перабудаванай вярхоўнай уладзе няма спецыяльнага Камітэта па правах чалавека? А брэжнеўская канстытуцыя, на якую працягваюць спасылацца высокія ўлады, не спяшаючыся з новым Асноўным законам...

Усё гэта сведчыць толькі аб адным: нам патрэбна яшчэ вялікая і цяжкая праца па глабальнай дэтаталітарызацыі дзяржавы, грамадства, кожнага чалавека. Але памянёны працэс не прасунецца наперад, калі не будзе рэалізавана галоўнае — ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА І НАРОДАЎ. Бо менавіта яны дадуць магчымасць узарваць таталітарызм, усталяваць высокадэмакратычны, гуманны баланс (раўнавагу) правоў і ўзаемных абавязкаў дзяржавы і чалавека. Гэта значыць — усталяваць абвешчаную палітычнымі лідэрамі прававую дзяржаву.

Пераклады

БЕЛАРУСЬ—КАМЧАТКА

У жніўні на Камчатцы праходзіла дэкада беларускай культуры. Геаграфічна далёкі, але пасля паездкі вельмі блізкі, своеасаблівы край, які нельга забыць. Камчатка, радзіма каракаў, эвенаў, ітэльменаў, чукчаў, прыняла і абагрэла цяплом шчырасці і сваіх тэрмальных водаў прадстаўнікоў ці не ўсіх народаў Савецкага Саюза. Жыве там і больш за сем з паловай тысяч беларусаў. Групу, у якую я трапіў, практычна ўсюды віталі па-беларуску. Мы сустракаліся з землякамі розных прафесій і ўзростаў. Гэта былі настаўнікі, пенсіянеры, рэдактар раённай газеты, служачыя, вайскоўцы.

Арганізатарам Камчацкага аддзялення Саюза пісьменнікаў РСФСР быў у свой час наш самабытны паэт Уладзімір Варно, якога многія ў нас добра помняць. Там, у Петрапаўлаўску-Камчацкім, знайшоў ён, на жаль, і свой апошні прытулак.

Сталіцы Камчаткі нядаўна споўнілася 250 гадоў, і нашы дні былі прымеркаваны да гэтай даты, за што мы ўдзячны іх арганізатарам.

Прадстаўніком абласной пісьменніцкай арганізацыі ў нашай групе быў Яўгеній Сігароў, цікавы чалавек і паэт, у нядаўнім мінулым камандзір баявога карабля. З нашым кампазітарам Валодзем Буднікам яны напісалі песню «Паўзямлі да цябе». Ансамбль «Сябры» развучыў яе і на заключным канцэрце ў абласным тэатры праспяваў узрушаным слухачам. Песню разам з іншымі вершамі Яўгена Сігарова я пераклаў на беларускую мову і прапаную вашай увазе.

Уладзімір ПАУЛАУ.

Яўгеній СІГАРОЎ

Балада пра хлопцаў

Мы несем едино бремя,
Только жребий наш иной:
Нас послали на убой.
Вас оставили на племя.
Дзяніс ДАВЫДАЎ.

Што за хлопцы былі?! На вайну,
не на свята
У прыёмныя рваліся ваенкаматаў.
Па-сібірску пустога казаць
не казалі,
Ім прыгожыя маршы вакзалы
igралі.
Пад Масквою палеглі, ды Маскву
адстаялі,
А жывы хто застаўся, турмы
прыпаялі.
Хітруны скрозь чаўплі пра святы
абавязак,
Уцякаючы ў тыл са зладзюгамі
разам.
Пад аховай асобай гулялі да схочу,
Гандлявалі шмаццём сярод долі
сірочай.
А калі адгрымела з баямі блакада,
Засяляць паімчалі дамы Ленінграда.
Пад салюты ў сталіцу што моцы
пабеглі
Атрымаць каб кватэры на фронце
палеглых.
І пакуль смакавалі кактэйлі Арбата,
Сустракала Сібір без віны вінаватых.
Іх к нявестам тайга зазывала
разлапа,
А яны па этапу прайшлі, па этапу.
За баланду ў абед агавору ва ўгоду
Лес валілі штодня, прамывалі
пароду.
З тапаром ды з кайлом праз увесь
дзень вялікі
Здабывалі рублі для дзяржаўнай
пазыкі.
Перапэцканы густа крывёю і потам,
Разумелі, казалі нязлосна: — Ды
што там...
За Байкалам сівым з дзекабрысцкага
семя
Нарадзілася з часам бунтарскае
племя.
Што за хлопцы-малойцы,
за арлянята
Прысягаюць Радзіме ў казармах
будбата?!
Спрыт і звычка — сам бацька
ў юнацтве нібыта,
І зялёны бушлат на плячах як уліты.
Урачыста чыталіся хлопцам загады,
Быццам узнагароды, давалі нарады.
І заносілі сцягі, і славілі даты,
І прамоўца з трыбуны ўсё клікаў
заўзята.
І грымела труба над будоўляю веку,
І празвоньваўся стык пад кувалдаю
зэка.
Медалі хтосьці множыў, вёў лік на
мільёны,
Ну а хлопцам на ячку давалі талоны.
Біў іх кашаль прастудны і крыўда
святая —
Шыкавала зноў моладзь сабе
залатая.

На будоўлю завітвала дзеля кар'еры,
Везла будаўнікам найстражэйшыя
меры.

Ды ізноў заклікала, ізноў заклікала
Ад завалу ў пуці да другога завалу.
А затым разбягалася ў гандаль па
глаўках,
Усе шапкі свае там расклала
па лаўках,
Каб пры папках хадзіць, быць
заўжды ў апараце
На нядрэнных харчах, пры харошай
зарплаце.
А на рэйках мільгалі будбата
пагоны
І чарнелі бушлаты з нядальняе
зоны.
Хлопцы чулі ў тайзе і ў тунелі,
ў забоі,
Як прамоўцам давалі па зорцы
Героя.
І ўжо цяжка даводзіцца маці часамі
Не з сынамі з будоўлі, а ўжо з іх
сынамі.
Іх не барды трывожаць, не кашаль
пры грыпе,
Ім нібы востры нож кіраўнічае
«хіпі».
Бо не мелі сыны ад пражытае эры
Ні кала, ні двара, ні даверу, ні веры.
З іх сыноў ухмыляюцца
ля мерседэсаў
Міліёншчыкі новыя — духу
Дантэсы.
Іх дзяўчаты прыкідваюць віды
на царства...
І ў хлапечай душы закіпае
бунтарства.
Мо і ім гэтак жыць, нібы ў нераце
плотцы?..
Што за хлопцы, аднак, ах, якія то
хлопцы!

●

Барысу АЛЕЙНІКУ

Старэюць на пагостах абеліскі,
І — ні душы,
Хоць нема галасі.
Ні памяці, ні славы, ні прыпіскі
Няма ў Расіі болей для Русі.

Страчалі век распуцінскія лазні,
А з ім на ростань сауны прыйшлі.
На хлебным полі,
Збітым, непралазным,
Не адступіўшы, каласы ляглі.

Зямля-ўдава, радзімая старонка,
З тваёй сірочай нівай не лады.
Абрэзаўшы касу,
Пайшла Алёнка
Шукаць жар-птушку шчасця ў
гарады.

Рушнік узяўшы і акраец хлеба,
Пайшоў на службу сын.
З афганскіх гор
Да сёння аж
На цэлага паўнеба
Дыміць падбіты бронетранспарцёр.

Даўно ляжыць гармонік запылёны.
Жахае сум спусцелага двара.
Сядзіць на Дошцы гонару варона
І ўсё чакае добрага цара.

Рыштунак віцязь носіць не па чыну.
Аратай вочы апусціў уніз.
Развозяць скрозь
Службовыя машыны
Бясплатны кайф
І платны камунізм.

Даўно скарыўся лёсу русіч строгі.
І камень вешчы зноў не абысці.
Тры надпісы на ім.
І тры дарогі.
І зноў загадка:
Па якой ісці?

●

У краі, дзе вулканы і алені,
Ў падпітку цётка з вочкамі кеты
Нібыта Буда, — ў роскідку калені, —
Сядзіць і цэны шпарыць на кветы.

Купюры цётка аграбае лоўка.
На грошы ў яе лёгкая рука.
Выскоквае зіркатая галоўка
З вялікай футры, нібыта з мяшка.

Беспамылковы яе гандлю святцы.
Здалёку бачыць,
Хто і ў чым ідзе.
Яна і просіць строга па апратцы:
З каго дзесятку,
А з каго і дзве.

Яна букецік нітачкай абвяжа,
Кіўне дзяўчынцы,
Хлопцу падміргне.
Бо ведае:
Нічога той не скажа,
Аддасць гадзіннік —
Кветак не міне.

Бо нездарма яго нібы скавала.
Глядзіць.
А ў час, што скрозь завецца пік,
Цюльпаны стынуць,
Ледзянеюць калы,
Аж прапякае чырванню гваздзік.

Пры іх зусім гандлярцы не панура.
Сядзіць,
Гандлюе радасцю зямлі.
Дзяўчынка хлопца ціхенька кранула:
— Хадзем адсюль...
І двое тых пайшлі.

Паўзямлі да цябе

1

Запомнім, сябры, гэты край, дзе
вулканы
Зямлю саграваюць цяплом,
Дзе сонца ўзыходзіць з глыбінь
акіяна,
Тайфуны ідуць напралом.
Запомнім, сябры, гэты бераг
трывушчы,
Не спешчаны веямі кроз.
Адгэтуль імкне ў Белавежскую
пушчу
Запевак камчацкіх бяроз.

Паўзямлі да цябе, да спаткання.
Ды ў нас ёсць паратунак адзін:
Перакіну я трасу світання
На ўсе дзесяць палётных гадзін.

2

Запомнім, сябры, як улетку распадкі
Не скручваюць снежны абрус.
Ды свеціць здалёку прычалам
Камчаткі
Святая зямля Беларусь.
Запомнім, сябры: наша дружба
нанова
Засветліцца ў родных краях.
Няхай жа жыве беларуская мова,
Як руская мова мая.

Паўзямлі да цябе, да спаткання.
Ды ў нас ёсць паратунак адзін:
Перакіну я трасу світання
На ўсе дзесяць палётных гадзін.

СУЛАДДЗЕ МУЗЫКІ І ВЕРША

225-годдзе з дня нараджэння Міхала-Клеафаса Агінскага, аўтара неўміручага паланеза «Развітанне з Радзімай», які жыў і тварыў у вёсцы Залессе Смаргонскага раёна (тут ім было напісана больш 60 вакальных твораў, у тым ліку і 20 паланезаў), урачыста адзначылі землякі кампазітара.

У кафэ «Купалінка» завода аптычнага станкабудавання панавала па-сапраўднаму святочная ўрачыстасць. На сценах — схема родавага дрэва Агінскіх, герб, партрэт кампазітара, а на касцюмах гасцей і ўдзельнікаў свята—сінія стужкі з надпісам: 225 год М.-К. Агінскі.

Арганізатары юбілею і, у прыватнасці, кіраўнік літаратурнай гасцёўні «Крынічка» Марыя Казіміраўна Вярцінская, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Смаргонскай гарадской СШ № 4, імкнулася, рыхтуючы праграму, да арганічнага спалучэння музыкі, песні, танца.

Свята вылілася ў вялікае прадстаўленне, умоўна падзеленае на два аддзяленні. Калі ў першым гучалі музыка Агінскага, вершы, песні ў выкананні членаў літаратурнай гасцёўні «Крынічка», а таксама гасцей—беларускіх пісьменнікаў, народных дэпутатаў Беларусі Ніла Гілевіча і Анатоля Вярцінскага, дырэктара музея-сядзібы Ф. Багушэвіча Алеся Жамойціна і мясцовага самадзейнага кампазітара Уладзіміра Макарэвіча, то другое аддзяленне ўдала дапаўняла праграма, падрыхтаваная прадстаўнікамі філіяла Рэспубліканскага цэнтра эстэтычнага выхавання дзяцей імя Ф. Скарыны і эксперыментальнай школы мастацтваў імя М. Агінскага.

В. БАРЫСЕВІЧ.

ПАШАНЦАВАЛА!

15 кастрычніка ў Полацку, як вядома, адбыўся тыраж выйгрышаў грашова-рэчавай латарэі, прысвечанай 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны.

У тыражы разыгрываліся 500000 выйгрышаў на суму 1250000 рублёў, у тым ліку 7810 рэчавых на суму 299 725 рублёў і 492 190 грашовых на суму 950 257 рублёў.

Па дадзеных праўлення Беларускага рэспубліканскага банка Ашчаднага банка СССР па стану на 22 лістапада 1990 г. на экспертызу былі прадстаўлены 13 латарэйных білетаў, на якія выпаў выйгрыш па 5000 рублёў, 23 латарэйныя білеты — па 3000 рублёў; 28 латарэйных білетаў — па 2000 рублёў.

Экспертызу праходзяць білеты, на адзін з якіх выпаў выйгрыш аўтамабіль «Жыгулі» ВАЗ-210063, на тры білеты — аўтамабіль «Жыгулі» ВАЗ-2108, а яшчэ тры білеты — аўтамабіль «Запарожац» ЗАЗ-968М; сярод выйгрышаў ёсць таксама два матацыклы і іншыя рэчы.

Н. АЛЯКСЕЕВА,
вядучы эканаміст Міністэрства культуры БССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62; бухгалтэрыя — 23-73-37.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Андрэй ГАНЧАРОЎ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГІЛЕП, Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Барыс ПЯТРОВІЧ.